Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 МАЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 100 (27958) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**З чаго пачынаецца сацдаследаванне?**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Адправіў жонку на мора... Лапцевых**

СТАР. 17

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br2 млн 658,2 тысячы**

*склаў у красавіку гэтага года сярэдні памер прызначаных пенсій. Гэта ў 2,4 раза перавышае бюджэт пражытковага мінімуму для пенсіянераў (паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт). У красавіку сярэдні памер пенсій па ўзросце склаў Br2 млн 748,5 тыс., па інваліднасці — Br2 млн 426,5 тыс., з прычыны страты карміцеля — Br1 млн 780,3 тыс., сацыяльных пенсій — Br1 млн 296,4 тыс. У адпаведнасці з пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны бюджэт пражытковага мінімуму для пенсіянераў у цэнах снежня 2014 года ў разліку на месяц на перыяд з 1 лютага па 30 красавіка 2015 года складае Br1 млн 95,1 тыс. У органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў красавіку на ўліку было 2 млн 561,4 тыс. пенсіянераў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14810,00 | ▲ |
| Еўра | 16180,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 283,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 697,76 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АФІЦЫЙНЫ ВІЗІТ У ПАКІСТАН

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з двухдзённым афіцыйным візітам у Пакістане, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка ўчора правёў афіцыйныя перагаворы з Прэзідэнтам Пакістана Мамнунам Хусейнам. Прэзідэнты спачатку пагутарылі ў асабістым кабінеце Мамнуна Хусейна адзін на адзін, а затым працягнулі перамовы з удзелам членаў дэлегацыі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі і Пакістана вельмі эфектыўна развіваюцца адносіны. «У нас няма практычна ніякіх праблем у сферы палітыкі, мы супрацоўнічаем у міжнародных арганізацыях, падтрымліваем адзін аднаго. Я думаю, гэтым шляхам трэба ісці, падцягваючы да гэтага супрацоўніцтва і дэпутатаў, і кіраўнікоў ведамстваў», — сказаў беларускі лідар.

Сёння праграмай візіту кіраўніка беларускай дзяржавы ў Пакістан запланавана сустрэча з прэм'ер-міністрам гэтай краіны, падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў.



Фота БЕЛТА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ДЗЬМУХАЎЦОВАЯ КАЗКА

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!**

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-давечнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# ПРЭЗІДЭНТ ПАДПІСАЎ ЗАКОН АБ АМНІСТЫІ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб амністыі ў сувязі з 70-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дакументам вызначаны катэгорыі падлягаючых вызваленню ад пакарання асоб, асуджаных за злачынствы, якія не адносяцца да цяжкіх і асабліва цяжкіх: непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, жанчыны і адзінокія мужчыны, маючыя дзяцей ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, асобы пенсійнага ўзросту, інваліды I і II груп, ветэраны баявых дзеянняў, асобы, якія атрымалі раненні ў перыяд праходжання службы, ажыццяўлення службовай дзейнасці, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а таксама некаторыя іншыя катэгорыі асуджаных. Асобным катэгорыям асуджаных, якія не падлягаюць вызваленню, прадугледжваецца скарачэнне тэрміну пакарання на 1 год.

З улікам існуючай практыкі прымянення амністыі яна не распаўсюджваецца на асоб, да якіх на працягу 2009—2015 гадоў прымянялася амністыя або памілаванне і якія зноў учынілі наўмыснае злачынства; якія поўнасцю не кампенсавалі прычыненую злачынствамі шкоду (урон), не выплацілі даход, атрыманы злачынным шляхам; злосна парушаюць парадак адбывання пакарання; асуджаныя за злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, забойства, наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, злачынныя дзеянні сексуальнага характару, бандытызм, тэрарызм, масавыя беспарадкі, парушэнне правіл дарожнага руху ў стане ап'янення, што прывяло да смерці чалавека або прычынення цяжкага цялеснага пашкоджання, незаконны абарот наркотыкаў і шэраг іншых злачынстваў, якія характарызуюцца высокай грамадскай небяспекай.

Прадугледжваецца вызваліць ад крымінальнага пакарання 8,6 тысячы асуджаных, у тым ліку з месц пазбаўлення волі — 2,2 тысячы чалавек.

Закон уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання і падлягае выкананню на працягу шасці месяцаў з дня ўступлення яго ў сілу.

# Рэзервы ёсць. Іх трэба задзейнічаць

**У Бярозаўскім раёне прайшло выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Яго ўдзельнікі пазнаёміліся з работай прадпрыемстваў раёна, пабывалі ў сельсаветах, сустрэліся з гарадскімі і сельскімі працаўнікамі, дэпутатамі мясцовых Саветаў. У нарадзе ўдзельнічалі кіраўнікі абедзвюх палат парламента — Міхаіл МЯСНІКОВІЧ і Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, прадстаўнікі Савета Міністраў, банкіры, кіраўнікі Брэсцкай вобласці.**

І сенатары, і іншыя прысутныя аднадушна далі высокую ацэнку рабоце Бярозаўскага сыраробнага камбіната. За апошняе дзесяцігоддзе ў мадэрнізацыю гэтага прадпрыемства ўкладзена больш за паўсотні мільёнаў долараў. Толькі ў сельгаспрадпрыемствы, якія далучылі да камбіната, інвеставана больш за 27 мільёнаў долараў. Камбінатам мадэрнізаваны і прыведзены да сучаснага ўзроўню былыя невялікія малочныя заводы двух суседніх раёнаў. І большасць гэтых сродкаў ужо акупілася. Сёння прадукцыю пад брэндам «Бярозка» купляюць не толькі ў Расіі, але і ў краінах Еўрасаюза. Бярозаўскае малакаперапрацоўчае прадпрыемства вызначаецца не толькі сваёй высокатэхналагічнай вытворчасцю, але і згуртаваным калектывам, касцяк якога складаюць працоўныя дынастыі.

Наведалі ўдзельнікі выязнога пасяджэння таксама «Франдэсу» — кампанію па вытворчасці хімічных сродкаў абароны раслін. Адзначалася, што на тэрыторыі былога Савецкага Саюза такіх кампаній функцыянуе ўсяго тры. Цікава было пачуць, што да стварэння гэтага прадпрыемства маюць дачыненне як мінімум двое ўдзельнікаў нарады. Міхаіл Мясніковіч, тады прэм'ер-міністр нашай краіны, вырашаў пытанні з фінансаваннем новай будоўлі, а Анатоль Ліс, цяперашні губернатар Брэстчыны, у якасці намесніка міністра аховы прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзіў экалагічную экспертызу спецыфічнай вытворчасці. Як відаць было з лічбаў і фактаў, цяпер нікому не сорамна за праведзеную работу. У краіне працуе яшчэ адно такое прадпрыемства, і зараз фактычна забяспечаны ўсе патрэбы айчынных сельгасвытворцаў у гербіцыдах. Вялікая частка прадукцыі ідзе на экспарт.

У Здзітаўскім сельсавеце ўдзельнікі нарады пазнаёміліся з работай школы, якая ўзведзена ў 2011 годзе. Здзітаўцы падзяліліся вопытам дзейнасці ў адной звязцы ўсіх аб'ектаў вясковага сацкультбыту. Старшыня сельскага Савета Людміла Эсанава адказала на шматлікія пытанні гасцей наконт добраўпарадкавання вёскі, стварэння новых працоўных месцаў, падтрымкі асабістай падсобнай гаспадаркі жыхароў.

Пазней, падчас разгляду пытання парадку дня «Аб рабоце мясцовых Саветаў Брэсцкай вобласці па забеспячэнні ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамаснай тэрыторыі», удзельнікі выязнога форуму засяродзілі сваю ўвагу на выяўленні рэзерваў гэтага самага развіцця. Бярозаўскаму сыраробнаму камбінату было ўказана на неабходнасць далейшага пошуку рынкаў збыту прадукцыі.

Асаблівая ўвага падчас нарады надавалася вырашэнню праблем занятасці насельніцтва. «Неабходна болей настойліва працаваць па стварэнні новых рабочых месцаў у рэгіёне. Нават на прыкладзе сельсавета, які мы наведалі, відаць, што не ўсе рэзервы задзейнічаны. Тут могуць быць рамеснікі, прадпрымальнікі па перапрацоўцы яблыкаў і іншых пладоў на сок. Развіццё малога і сярэдняга бізнесу павінна стаць адказам на павелічэнне працэнта беспрацоўя», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *Бярозаўскі раён.*

# ВАЖНАЕ ЗВЯНО Ў КАДРАВАЙ ПАЛІТЫЦЫ

## Міхаіл Мясніковіч лічыць, што кіраўнікі павінны быць сталымі палітычна і мець выбітныя арганізатарскія здольнасці

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу заявіў пра гэта падчас дзелавой сустрэчы на ўзроўні намеснікаў міністраў, старшыняў дзяржкамітэтаў і канцэрнаў, якая адбылася ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце.**

Міхаіл Мясніковіч пачаў сустрэчу з жарту: «Даўно я сюды не прыходзіў. Аднойчы сказаў, што ў мяне ёсць свой пункт гледжання наконт круглых выдатнікаў, якіх выпускае Акадэмія кіравання. Пасля гэтага мяне сталі запрашаць радзей». Аднак у кожным жарце, як той казаў, ёсць толькі доля жарту.

«Не можа быць, каб усе былі выдатнікамі, — працягваў старшыня Савета Рэспублікі. — Я разумею, што сюды адбіраюць самых таленавітых і разумных. Аднак калі ўсе выдатнікі, то альбо патрабаванні нізкія, альбо ацэньваецe неаб'ектыўна». У той жа час Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што гэтыя выказванні — выключна яго пункт гледжання.

«Я лічу, што Акадэмія кіравання — гэта не толькі ўстанова адукацыі. Ці нават так: не ўстанова адукацыі, а галоўнае звяно ў кадравай палітыцы краіны. І таму сцвярджэнне, што ў Беларусі вялікі дэфіцыт кіраўніцкіх кадраў і няма сістэмы іх падрыхтоўкі, трэба патлумачыць. Так, эфектыўнай сістэмы адбору і расстаноўкі кадраў, я лічу, няма. І мне здаецца, што сёння Акадэмія кіравання павінна ўзначаліць усю працу па выяўленні кадраў, іх падрыхтоўцы і фарміраванні рэкамендацый, — прапанаваў кіраўнік верхняй палаты парламента. — У першую чаргу, трэба пашырыць паўнамоцтвы Акадэміі кіравання па выяўленні таленавітых, палітычна сталых маладых людзей з выбітнымі арганізатарскімі здольнасцямі. Можа ўзнікнуць пытанне наконт прафесійнай прыдатнасці такіх людзей... Я мяркую, што чыста прафесійны складнік можа адысці на другі план. Павінны быць арганізатарскія здольнасці, палітычна сфарміраваная асоба. І тут трэба прадаставіць Акадэміі права адбіраць кандыдатуры з іншых ВНУ, прадпрыемстваў і арганізацый. Пры гэтым варта ўзаемадзейнічаць з мясцовымі ўладамі, але не надта. Бо аднойчы былі арганізаваны, калі казаць папросту, спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы старшынь калгасаў. 30% людзей, якіх раёны адправілі на вучобу, не ведалі, навошта прыехалі. Раён пакінуў на месцы тых, хто патрэбны, а некага «левага» адправіў. Ці можна так падрыхтаваць добрыя кадры?»



Фота БЕЛТА.

Аднак гаварыў Міхаіл Мясніковіч не толькі пра кадравую палітыку. Напрыклад, ён лічыць неабходным працягваць мадэрнізацыю прамысловых і сельгаспрадпрыемстваў. «Калі мы не будзем гэтага рабіць, яны ў хуткім часе стануць выпускаць прадукцыю, якую на рынку ніхто не купіць, — заўважыў старшыня Савета Рэспублікі. — Мы павінны ў сучасных умовах прадаваць прадукцыю высокіх якасных характарыстык пры адносна невысокай цане».

Кажучы пра крыніцы фінансавання мадэрнізацыі, Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу, што на гэта ў розныя гады выдзялялася: бюджэтных сродкаў — ад 17% да 20%, уласных сродкаў прадпрыемстваў — 38-40%, пазыковых сродкаў, крэдытаў банкаў — каля 26% (у тым ліку крэдыты замежных банкаў і замежныя крэдытныя лініі — 8-10%), уласных сродкаў насельніцтва — 7-10% і іншых — 4%.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Блізкая ўлада

# ЛЮДЗІ ЧАКАЮЦЬ ДАПАМОГІ НАВАТ У ПРАЦАЎЛАДКАВАННІ

**Апошняя прамая лінія ў Магілёве атрымалася напружаная, як ніколі. Старшыня гарвыканкама Уладзімір Цумараў, які праводзіў яе, ледзь паспяваў адказваць на пытанні магіляўчан непасрэдна па тэлефоне, і браць на ўлік тыя, што паступалі паралельна ў аблвыканкам, з якім падтрымлівалася анлайн-сувязь. Некаторыя жыхары горада паспявалі тэлефанаваць спачатку мэру, а потым яшчэ і губернатару. Напэўна, хацелі падстрахавацца, але гэтым толькі ўскладнялі працу і адцягвалі ўвагу. Іх пытанне і так ужо было ўзята на кантроль.**

Таццяна Варанцова з Казіміраўкі паскардзілася на адсутнасць вады ў іх шматпавярховіку і праблемы з месцам у дзіцячым садку. Мікрараён развіваецца, будуецца новае жыллё, а інфраструктура адстае. Адразу пасля размовы з ёй было дадзена распараджэнне высветліць сітуацыю па вадзе, а пытанне з дзіцячым садком узята на кантроль. Уладзімір Цумараў адзначыў, што ў гэтым мікрараёне сапраўды напружанае становішча з дашкольнымі ўстановамі. Тут плануецца будаўніцтва дзіцячага садка, але ён будзе закладзены толькі ў наступным годзе. Праектна-каштарысная дакументацыя распрацавана. Для Таццяны гэта, зразумела, не вялікае суцяшэнне, але немаўля, з якім яна зараз знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, ёсць спадзяванні, трапіць туды без праблем.

Некалькі званкоў прагучала ад жыхароў прыватнага сектара, дзе распачаты работы па будаўніцтве інжынерных сетак. Анатоль Кірылавіч з Грабянёва паскардзіўся на адсутнасць каналізацыі. Маўляў, будаваць за свой кошт дорага, а пенсіі на ўсё не хапае. Людзі спадзяюцца, што грошы знойдуцца ў гарадскім бюджэце. Але аб'ект не ўключаны ў сацыяльную праграму гэтага года. Лягчэй будзе вырашыць задачу, калі жыхары ўступяць у кааператыў і частку расходаў возьмуць на сябе. Тым больш што размова ідзе пра прыватныя дамы, якія потым дастануцца ў спадчыну дзецям і ўнукам, а не дзяржаве.

Міхаіл Аляксандравіч таксама паскардзіўся на тое, што застаўся без «каналізацыйнай трубы». За дзяржаўны кошт яе працягнулі амаль па ўсёй Бруснічнай вуліцы ў Малой Бароўцы, не хапіла толькі на апошнія некалькі дамоў, сярод якіх якраз і яго. Цяпер жыхарам кажуць, што грошай на гэтыя некалькі метраў трубы няма і прапаноўваюць будаваць за свой кошт. Ён абураны і жадае, каб перамагла справядлівасць.

70-гадовая пенсіянерка Марыя Веліканава зноў патрабавала, каб улады разабраліся, чаму з яе батарэй цячэ мазут, а на сценах праступае чырвоная вадкасць. Да яе прыходзілі супрацоўнікі ЖЭУ, але яна жадае, каб была створана камісія, якая дасканала вывучыць прычыны такіх з'яў. Яна лічыць, што да іх маюць дачыненне суседзі, але пры папярэдняй праверцы гэта не было ўстаноўлена. Улады не супраць правесці абследаванне кватэры заяўніцы яшчэ раз, нават выказалі гатоўнасць адразу разабрацца з пытаннем у суботу, але жанчына папрасіла зрабіць гэта пасля выхадных.

Усе гэтыя пытанні паступілі ў аблвыканкам, але займацца імі будуць адпаведныя гарадскія службы. Непасрэдна ў гарвыканкам звярнуліся 33 магіляўчаніны. Алег Міхайлавіч спытаўся, чаму яму амаль ў 2,5 раза завысілі зямельны падатак. Уладзімір Цумараў адзначыў, што падатак павялічыўся, але максімум ў 1,5 раза, і паабяцаў разабрацца, чаму ён так «падрос» для канкрэтнага жыхара. Валянціна Сямёнаўна з вуліцы Ямніцкай папрасіла дапамагчы адрамантаваць дах. Яшчэ адзін жыхар з Магілёва паскардзіўся, што яго тэрарызуюць па месцы працы.

Вырашаць праблемы гараджан пачалі адразу ж у суботні дзень. «Тыя пытанні, што ўзнікалі па Магілёве, не з'яўляюцца новымі ні для мяне, ні для нашых службаў, — падвёў вынікі Уладзімір Цумараў. — Перш за ўсё гэта датычыцца развіцця інжынерных сетак у Магілёве. Сёння ёсць праблемы па тых участках, якія асвойваюцца пад індывідуальнае жыллё, па падводзе камунікацый. На жаль, сродкаў мала. Каб зрабіць запланаваныя работы, неабходна 97 мільярдаў рублёў, а сёлета ў бюджэце прадугледжана толькі 8 мільярдаў».

Старшыня аблвыканкама Уладзімір Даманеўскі параіў пры рэалізацыі праектаў па пракладцы інжынерных сетак браць на ўзбраенне «добры вопыт Брэсцкай вобласці — ствараць кааператывы і ўключаць у працу людзей». «Павінна быць жорсткая дысцыпліна, — адзначыў ён. — Сёння няма лішніх сродкаў у бюджэце і трэба гэта да людзей данесці».

З тых пытанняў, якія выслухаў губернатар, найбольш вострым стала праблема з экалагічным становішчам у пасёлку Вейна Магілёўскага раёна. Занепакоенасць выказалі адразу 2 жыхары гэтага аграгарадка. Сяргей Мікалаевіч распавёў пра тое, што знішчэнне «лесаахоўнай» паласы паміж населеным пунктам і хімічнымі прадпрыемствамі, стварае для жыхароў неспрыяльныя ўмовы. Заяўнік скардзіўся на непрыемны пах, шум па начах і наяўнасць забруджвальных сцёкаў. Яго непакоіць тое, што яго малалетнія дзеці беспeрапынна хварэюць, а ў найбліжэйшым кар'еры пачала ўсплываць мёртвая рыба.

Уладзімір Даманеўскі паабяцаў уважліва вывучыць праблему і, калі ёсць парушэнні, «разабрацца на адпаведным узроўні з запрашэннем усіх неабходных інстанцый».

Некаторыя жыхары вобласці ўжо прызвычаіліся рэгулярна тэлефанаваць ў аблвыканкам па адным і тым жа пытанні. Таму, калі прагучала прозвішча жанчыны з Бялыніцкага раёна, усе ўжо ведалі, што ёй трэба. Жанчыне паказана лёгкая праца, і яна, напэўна, са студзеня звяртаецца ў аблвыканкам з просьбай дапамагчы працаўладкавацца. Ёй прапаноўваюць розныя варыянты, але яны яе не задавальняюць. Жанчыне нагадалі, што трэба нешта рабіць і самой, каб не сядзець без справы. Тым больш што яе настойлівасць выклікае падазрэнне: сапраўды чалавек шукае работу або толькі робіць выгляд.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

■ Тры пытанні да ўлады

# ПРАГРАМА ЗАКАНЧВАЕЦЦА, РАЗВІЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Дзяржаўная праграма развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна на 2011 — 2015 гады будзе выканана ў трэцім квартале сёлета. Такую ўпэўненасць выказаў старшыня Мядзельскага райвыканкама Ілья ШАЦЬКО.**

***— Ілья Іванавіч, прайшло больш за чатыры гады з пачатку рэалізацыі праграмы. Можна падсумоўваць нейкія вынікі?***

— Можна сказаць, што праект паказаў сваю эфектыўнасць. У прыватнасці летась колькасць адпачываючых павялічылася на 17% і склала больш як 80 тысяч. Ад экспарту паслуг атрымана каля 19 млн долараў, або 172% да ўзроўню папярэдняга года. За 4 гады ў нарачанскую зону ўкладзена больш як 400 млрд інвестыцый.

Акрамя таго, змены да лепшага бачны і ў санаторыях. Тут праведзена мадэрнізацыя, практычна завяршаецца будаўніцтва індывідуальных домікаў. Як і было запланавана, па 5 штук у кожным. У многіх санаторыях з'явіліся новыя карпусы, абноўлена лячэбная база. Напрыклад, рэканструяваны санаторыі «Прыазёрны», «Нарачанскі бераг», «Жураўлік», «Белая Русь», турыстычны комплекс «Нарач». Унітарнае прадпрыемства «ААБ Санаторый Спадарожнік» адкрыла спальны корпус на 136 месцаў, з кінаканцэртный залай, рэстаранам, спа-цэнтрам, 10 дамоў гасцінічнага тыпу і турыстычную вёску ў Абрамах. Пасля рэканструкцыі абнавіўся і аўтавакзал у Мядзелі, а ў курортным пасёлку Нарач пабудаваны новы аўтавакзал, уведзена ў дзеянне станцыя абезжалезвання.

***— Якія аб'екты з'явіліся для тых, каго прыцягваюць нязведаныя маршруты, побыт людзей, гісторыя, архітэктура?***

— За няпоўныя пяць гадоў створана шэсць турыстычных маршрутаў. Гэта — «Архітэктура Нарачанскага краю», «Мядзел — горад з багатай гісторыяй», «Легенды Нарачанскага краю», «Мядзельшчына ў агні вайны». Падчас апошняга турыстам прапануецца наведванне выставачнай залы Вялікай Айчыннай вайны ў раённым музеі народнай славы. Летась з'явіліся яшчэ два новыя маршруты «Нарач — Камарова — Свір», а таксама «Узла — Крывічы — Будслаў». А для тых, хто любіць прыроду, у прыродным комплексе «Блакітныя азёры» абсталявана экалагічная сцяжынка. Усё гэта дазволіла на 20-30% павялічыць колькасць адпачываючых, турыстаў, якія едуць па медыцынскія паслугі. Сёння сярод тых, хто адпачывае на Нарачы, каля 50% расіян, астатнія — беларусы, немцы, літоўцы, ёсць грамадзяне Кіпра, Канады, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Нашы здраўніцы працуюць па прынцыпе прыцягнення пастаянных кліентаў. Людзі, якія прыехалі сюды раз, едуць і ў другі, і ў трэці. Для іх распрацавана спецыяльная бонусная праграма.

***— Людзі, якія прыязджаюць на Нарач, хочуць не толькі дыхаць чыстым паветрам, але і спажываць экалагічна чыстыя прадукты. Якія захады прымаюцца, каб задаволіць іх патрэбы?***

— Працуем над далейшым развіццём экалагічнага земляробства, каб забяспечыць турыстаў, кліентаў здраўніц экалагічнымі прадуктамі. Пакуль фермерскія гаспадаркі пастаўляюць туды бульбу, гародніну, вырашчаныя практычна без мінеральных угнаенняў і гербіцыдаў. Для прыватнікаў праводзяцца кірмашы, дзе яны могуць прадаць садавіну, гародніну, мёд, малочныя і мясныя прадукты. У найбліжэйшай перспектыве плануем перапрацоўваць прадукцыю жывёлагадоўлі і забяспечваць ёй санаторыі.

Да завяршэння праграмы засталося пяць месяцаў. У трэцім квартале будуць выкананы ўсе даручэнні: добраўпарадкаванне вуліц, тратуараў, дарог, замена цепласетак, мадэрнізацыя здраўніц і іншае. Але, бясспрэчна, гэта не азначае, што з заканчэннем праекта развіцця курортнай зоны спыніцца. Наша задача — прыцягваць сюды сродкі, ствараць умовы для інвестараў. У нас ужо ёсць прыклады плённага партнёрства прыватнага бізнесу і дзяржавы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

# ФОРУМ ПРЫЦЯГВАЕ КАПІТАЛ

**Удзельнікам Гомельскага эканамічнага форуму сёлета было прапанавана да рэалізацыі больш за 100 інвестыцыйных праектаў. Ужо на пленарным пасяджэнні падпісана 14 дагавораў на суму $276 млн.**



У горад над Сожам прыехала каля 500 чалавек — супрацоўнікі пасольстваў, банкаўскіх і фінансавых устаноў, бізнесмены з 21 краіны (Кітая, Францыі, Германіі, Аўстрыі, Расіі, Казахстана, Венесуэлы, Лівана, Перу і іншых). Інвестыцыйныя праекты, якія плануецца рэалізоўваць на тэрыторыі рэгіёна, тычацца стварэння вытворчасці кандытарскіх вырабаў, медыцынскага лячэбна-рэабілітацыйнага цэнтра з дзіцячай кавярняй у Гомелі... Прэзідэнт кампаніі «Альханүф» з Саудаўскай Аравіі доктар Махамед Ібрагім Алмехазі зацікаўлены ў будаўніцтве сучаснага жыллёва-гандлёвага комплексу «ГомельМолл». Аб'ём капітальных укладанняў для рэалізацыі праекта складае не менш за $50 млн:

— Я знайшоў тут падтрымку губернатара Уладзіміра Дворніка. Мне спадабалася ваша краіна, асабліва Гомель, адкрытыя душы вашых людзей. На працягу найбліжэйшага паўгоддзя мы створым планы будаўніцтва жыллёва-гандлёвага комплексу. У ім будзе некалькі кінатэатраў і гандлёвы цэнтр.

— Толькі за апошнія чатыры гады на Гомельшчыну было прыцягнута звыш $4 млрд замежных інвестыцый з 40 краін свету, — адзначыў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік. — У нас паспяхова працуе больш за 300 прадпрыемстваў з замежным капіталам. Пашырэнне кола надзейных партнёраў, садзейнічанне ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў з'яўляецца адной з прыярытэтных задач мясцовых органаў улады.

З 2008 па 2014 год на эканамічных форумах у Гомелі было падпісана 56 дагавораў на $1,36 млрд. На сёння амаль дзве трэці з іх выкананы або знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Свята ўсіх дзяцей

# ПАДАРУНКІ ДЛЯ ДУШЫ І СА СМАКАМ

**29 мая а 10-й гадзіне ў Доме Масквы ў Мінску Беларускі дзіцячы фонд пачынае святкаваць Міжнародны дзень абароны дзяцей.**

Гульні на свежым паветры для 250 дзяцей-сірот і дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі арганізуюць у гэты дзень аніматары цэнтра «Косма», кампанія Shariki.by, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Запланавана традыцыйнае ўручэнне дзвюх ганаровых прэмій — Фонду імя Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі (тром найлепшым шматдзетным сем'ям краіны, якія выхоўваюць 5 і болей дзяцей) і «Сябра дзяцей» (дарослым, якія шмат гадоў дапамагаюць дзецям).

Падарункі для ўсіх дзяцей — абавязковыя. Для некалькіх выпускнікоў дзіцячых дамоў іх падрыхтавалі беларускія дызайнеры і стылісты, а ўвогуле ўсе атрымаюць вітаміны ад кампаніі «Медінтэрпласт» і, вядома, самы лепшы прысмак лета — марожанае ад Мінскага халадакамбіната №2.

А непасрэдна 1 чэрвеня а 16-й гадзіне стартуе новы праект БДФ — «Першая афіша».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Смачна есці

# ЭХ, ХАЛАДНІЧКУ Б, ДЫ З МАЛАДОЙ БУЛЬБАЧКАЙ!

**Чарговы Тыдзень беларускай кухні пройдзе ў сталіцы з 8 па 14 чэрвеня. На гэты раз удзел у ім возьмуць 101 аб'ект грамадскага харчавання, пра што паведамілі ў Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Згодна з правіламі акцыі, усе яе ўдзельнікі — рэстараны і кавярні — павінны прытрымлівацца адзіных цэн і рэцэптуры. Гэтым разам аб'екты грамадскага харчавання прапануюць сваім наведвальнікам закуску з курыцы з вяндлінай і зялёным гарошкам за 50 тысяч рублёў, халаднік са шчаўя са смятанай і маладой бульбай за 25 тысяч рублёў, рыбу на топленым масле з запечанай бульбай за 70 тысяч рублёў. У меню таксама будуць калдуны з мясам за 50 тысяч рублёў, хрушчы тварожныя з мёдам за 35 тысяч рублёў і морс з журавін за 10 тысяч рублёў.

Нагадаем, што першы Тыдзень беларускай кухні адбыўся ў сталіцы ў верасні, а потым у снежні 2013 года. З таго часу яны неадночы паўтараліся цягам усяго 2014 года. Сёлета аналагічная акцыя па папулярызацыі страў беларускай кухні прайшла ў лютым.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже права заключения договоров аренды сроком на 3 года объектов недвижимого имущества, принадлежащих ОАО «ГОСТИНИЦА ПЛАНЕТА» на праве собственности**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Право заключения договора аренды помещения №95 площадью 12,9 м², расположенного на 1-м этаже здания гостиницы «Планета». | г. Минск, пр. Победителей, 31-1 | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток с НДС, руб.** | **Сумма арендной платы в месяц с НДС, руб.** | **Шаг аукциона, %** |
| | | | 387 000 | 38 700 | 2 322 000 | 5 |
| **Лот №2** | Право заключения договора аренды помещения №328 площадью 32,2 м² (двухкомнатный гостиничный номер с санузлом), расположенного на 3-м этаже здания гостиницы «Планета». | г. Минск, пр. Победителей, 31-1 | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток с НДС, руб.** | **Сумма арендной платы в месяц с НДС, руб.** | |
| | | | 966 000 | 96 600 | 5 796 000 | |
| **Лот №3** | Право заключения договора аренды помещений №3, №4, №5, №6 площадью 200,2 м², расположенных на 3-м этаже пристройки к зданию гостиницы «Планета». Ранее располагался бильярд-бар. | г. Минск, пр. Победителей, 31-1 | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток с НДС, руб.** | **Сумма арендной платы в месяц с НДС, руб.** | |
| | | | 6 006 000 | 600 600 | 36 036 000 | |

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 и (или) Лот №2 и (или) Лот №3 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота №1 и (или) Лота №2 и (или) Лота №3 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере:
- 2 500 000 (Два миллиона пятьсот тысяч) белорусских рублей при продаже Лота №1;
- 6 000 000 (Шесть миллионов) белорусских рублей при продаже Лота №2;
- 12 000 000 (Двенадцать миллионов) белорусских рублей при продаже Лота №3;
в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) по Лоту №3 будет иметь возможность аренды либо продажи оборудования бара, бильярдных столов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Цена продажи права заключения договора аренды Объекта – единовременный платеж, который не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. №150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина с 01.04.2015 равна 120 000 бел. руб.

**Аукцион состоится 30.06.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11 пом. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами на Объект (Объекты), право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ.лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр.лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды объекта недвижимого имущества (Лот №__), принадлежащего ОАО «ГОСТИНИЦА ПЛАНЕТА»,* **проводимом 30 июня 2015 г.**

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Лота №1 и (или) Лота №2 и (или) Лота №3. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений: **26.06.2015 в 12.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Высоцкая Мария Иосифовна 8 (017) 226-80-41, 8 (033) 660-42-27.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот (Лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор аукциона: • +375(17) 306-00-57 • +375(29) 550-09-52 • + 375(29) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ПЯЦЬ ЭЛЕМЕНТАЎ ВЫПАДКОВАСЦІ ДЛЯ ПРАЎДЫ

## Дакладнасць сацыялагічных даследаванняў залежыць ад адкрытасці і шчырасці рэспандэнтаў

**Сацыялагічныя даследаванні заўжды маюць асаблівую актуальнасць. Імі цікавяцца кіраўнікі органаў улады, назіральнікі, эксперты, журналісты, вучоныя і самі выбаршчыкі. Аднак любыя сацыялагічныя даследаванні, у любы час патрэбны нам, каб лепш ведаць пра тое, што з намі адбываецца і чаму. Яны дазваляюць убачыць сітуацыю ўвогуле, вывучыць яе вытокі, а таксама выпрацаваць рашэнні, якія дапамогуць сітуацыю скарэктаваць, калі ёсць патрэба, папярэдзіць далейшыя негатыўныя наступствы. Наша размова з дырэктарам Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, доктарам сацыялагічных навук, прафесарам Давідам РОТМАНАМ пра гістарычны аспект і асаблівасць работы беларускіх сацыёлагаў і пра галоўную ўмову якасці такой работы.**



***— Давід Генрыхавіч, як атрымалася, што ў наступным годзе вашаму цэнтру споўніцца 20 гадоў, а яго базе звестак — 30?***

— Цэнтр стаў вынікам развіцця сацыялагічнай службы пры ўніверсітэце і яе пераемнікам. Служба такая існавала са дня стварэння ўніверсітэта ў 1921 годзе. Праўда, сталінскія рэпрэсіі нанеслі моцны ўдар па шэрагах беларускіх сацыёлагаў, але ў 1967 годзе сацыялагічная служба была адноўлена. Тады была створана Праблемная навукова-даследчая лабараторыя сацыялагічных даследаванняў, пазней адкрыта аддзяленне сацыялогіі пры кафедры філасофіі, потым кафедра сацыялогіі і наш цэнтр.

***— Цэнтр з'яўляецца ўдзельнікам шматлікіх міжнародных праектаў. Хто тут каго шукае, вы заказчыкаў ці яны вас?***

— Гэта таксама вынікае з нашай гісторыі. У 1987 годзе пры Дзяржаўным камітэце СССР па народнай адукацыі была створана сацыялагічная праграма «Грамадская думка», якую мне давялося ўзначаліць. Мы тады праводзілі даследаванні два разы на год — увесну і ўвосень, вывучалі ў асноўным меркаванне моладзі, стан спраў у адукацыі. У выніку склалася апытальная сетка па ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза: Прыбалтыка, Цэнтральная Азія, Каўказ, Сібір... Пасля распаду Саюза заходнія вучоныя згадалі праграму «Грамадская думка» і выйшлі на яе былых кіраўнікоў, каб заказаць свае даследаванні. Наладжаныя сувязі не былі яшчэ страчаны, і мы былі здольныя гэтыя заказы выканаць.

З таго часу Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ стаў досыць аўтарытэтнай арганізацыяй і з пачатку 1990-х гадоў выконвае буйныя міжнародныя заказы. Спачатку гэта былі даследаванні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, міжнацыянальныя адносіны... Пры Еўрапейскім саюзе ў 1993 годзе была створана міжнародная асацыяцыя па супрацоўніцтве з вучонымі новых незалежных дзяржаў былога Савецкага Саюза — INTAS, у рамках якой мы ажыццявілі 10 буйных праектаў.

З 2000 па 2003 год па заказе Еўрапейскай камісіі даследавалі лад жыцця і стан здароўя насельніцтва ў постсавецкіх дзяржавах, фінансаваў гэты праект Фонд Каперніка (5-я рамачная праграма навуковых даследаванняў і тэхналагічнага развіцця ЕС). Пазней мы рэалізавалі некалькі праектаў у 7-й рамачнай праграме: па нацыянальных меншасцях у постсавецкіх і посткамуністычных дзяржавах і зноў па здароўі. Такім чынам з'явілася цікавая магчымасць параўнаць вынікі двух даследаванняў з 10-гадовым разрывам у часе.

Акрамя таго, мы прадстаўляем Беларусь у міжнародным праекце «Еўрапейскія каштоўнасці», дзе амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах адначасова праводзяцца даследаванні па адносінах да базавых каштоўнасцяў. Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ ўваходзіць таксама ў асацыяцыю па вывучэнні сусветных каштоўнасцяў, электаральных сістэм свету. З пачатку 1990-х гадоў удзельнічаем у даследаваннях «Новага дэмакратычнага барометра».

Для 8-й рамачнай праграмы Еўрапейскага саюза «Далягляд-2020» плануем выканаць некалькі заявак, у тым ліку — па вывучэнні адносін краін «Усходняга партнёрства» з Еўрасаюзам і Расіяй.

***— Раскажыце, над чым універсітэцкія сацыёлагі працуюць цяпер.***

— Мы шмат даследаванняў праводзілі для Міжнароднай фінансавай карпарацыі і зараз заканчваем чарговае, якое датычыцца перасячэння дзяржаўных межаў: напрыклад, колькі чалавеку патрэбна часу, каб выехаць з Рэспублікі Беларусь у тым або іншым кірунку.

Яшчэ адно вельмі вялізнае і няпростае даследаванне, якое мы завяршаем, мае назву «Прыватызацыя і смерць». Заказчык — Кембрыджскі ўніверсітэт. Вучоныя гэтай аўтарытэтнай установы сфармулявалі гіпотэзу: чым вышэйшы ўзровень прыватызацыі, тым вышэйшая смяротнасць. Даследаванне праводзіцца ў Беларусі і Расіі, каб параўнаць вынікі і праверыць гэтую гіпотэзу. Апытанне праводзіцца ў малых гарадах з адзіным градаўтваральным прадпрыемствам. Логіка вучоных такая: калі адзінае градаўтваральнае прадпрыемства прыватызавана і на ім пачынаюцца звальненні, то насельніцтва ўсяго горада адчувае вялікі стрэс, што адбіваецца на стане яго здароўя і працягласці жыцця людзей. Наша даследаванне павінна пацвердзіць або абвергнуць гэтую гіпотэзу. Апытваюцца людзі толькі ад 42 гадоў і старэйшыя.

**Яшчэ адно вельмі вялізнае і няпростае даследаванне, якое мы завяршаем, мае назву «Прыватызацыя і смерць». Заказчык — Кембрыджскі ўніверсітэт. Вучоныя гэтай аўтарытэтнай установы сфармулявалі гіпотэзу: чым вышэйшы ўзровень прыватызацыі, тым вышэйшая смяротнасць.**

Акрамя таго, мы працягваем 14-гадовае даследаванне для нашага Міністэрства інфармацыі. Рэгулярна, увесну і ўвосень, вывучаем стан спраў у адносінах да СМІ і кнігавыдання. Якраз зараз высвятляем рэйтынгі тэле- і радыёперадач, адпаведнасць газетных рубрык чаканням чытачоў.

Яшчэ адзін вельмі цікавы праект датычыцца сацыяльных сетак. Мы ні ў якім разе не лічым, што тут патрэбны кантроль, але іх плыў на грамадскую думку нельга не ўлічваць. І справа ў тым, што праз гэтую крыніцу распаўсюджваецца вельмі шмат несапраўднай інфармацыі, а адэкватнай альтэрнатывы ёй пакуль няма.

***— Вынікі гэтага даследавання будуць публікавацца ў адкрытым доступе?***

— Так. Першыя вынікі мы ўжо публікавалі ва ўніверсітэцкім часопісе «Сацыялогія», але даследаванне будзе доўжыцца да канца года.

Апроч таго, мы распачалі электаральнае апытанне, і для нас вельмі важна, каб людзі давалі праўдзівую інфармацыю. І каб ішлі на кантакт. Бо высокі паказчык недасягальнасці рэспандэнтаў зніжае дакладнасць даследавання. Але самае галоўнае, каб людзі адказвалі аб'ектыўна.

***— Чаму гэта важна?***

— Тут вельмі простая рэч. У любым грамадстве, любой дзяржаве абавязкова ўзнікаюць праблемы, яны розныя. Для таго, каб гэтыя праблемы вырашаць, органамі ўлады прымаюцца кіраўніцкія рашэнні. Для таго, каб гэтыя рашэнні былі правільныя і прымаліся хутка, патрэбна інфармацыя. І тут нельга арыентавацца толькі на наяўнасць афіцыйных скаргаў, бо далёка не ўсе, хто сутыкаецца з той або іншай сацыяльнай праблемай, пішуць скаргі або звароты ў органы ўлады. Сацыялагічнае даследаванне якраз і дазваляе сфармуляваць абагулненае меркаванне ад дадзенага раёна, вобласці, па краіне ўвогуле. Гэтая інфармацыя публікуецца, трапляе да ўлады, і на яе падставе прымаецца больш абгрунтаванае кіраўніцкае рашэнне.

Калі чалавек кажа «ў мяне ўсё ў парадку» ў выпадку, калі гэта не так, то праблема не можа быць ліквідавана. Таму мы просім: проста кажыце праўду, тое, што ёсць насамрэч, кажыце тое, што думаеце. Гэта нікому не пашкодзіць, бо нашы апытанні ананімныя.

***— Як увогуле беларусы ставяцца да тых, хто праводзіць апытанні?***

— Часцей за ўсё — добразычліва. Нашы супрацоўнікі, якія праводзяць апытанні, як правіла, вялікіх праблем не маюць. Тут трэба разумець, што сацыялагічнае даследаванне — гэта вельмі складаная і комплексная работа, а не нейкае аднаразовае дзеянне, звязанае з апытаннем.

**Павінна быць, як мінімум, пяць элементаў выпадковасці. Інакш не спрацуюць законы верагоднасці, і правільны вынік мы не атрымаем.**

Спачатку заказчык або сам даследчык аналізуе нейкія працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве. Мы часцей працуем менавіта з заказамі. Як правіла, гаворка ідзе пра сітуацыю, якая пакуль не вывучана. Потым вызначаецца, што трэба даследаваць і хто павінен стаць рэспандэнтам — аб'ектам даследавання. Наступны этап, які зараз выкарыстоўваецца ўсё часцей, — гэта абмеркаванне прадмета даследавання ў фокус-групе. У яе могуць уваходзіць як самыя звычайныя людзі з пэўнымі характарыстыкамі, скажам, толькі жанчыны, так і эксперты ў той сферы, якая цікавіць даследчыка. Дыскусія ў фокус-групе дапамагае атрымаць больш дакладную інфармацыю і падабраць найбольш удалы інструментарый для далейшага даследавання.

Потым робіцца выбарка, у якой усё вельмі строга выбудавана. Як правіла, выбарка шматступеньчатая. Напрыклад, спачатку выпадковым чынам выбіраюцца гарады ва ўсіх рэгіёнах, потым, гэтак жа выпадкова, — вуліцы, потым, таксама праз жэрабя, — дамы, потым, зноў выпадковым чынам, — кватэры. Нарэшце ў кватэры выбіраецца для апытання чалавек, дзень нараджэння якога, скажам, найбліжэйшы да дня візіту інтэрв'юера ў кватэру. Павінна быць, як мінімум, пяць элементаў выпадковасці. Інакш не спрацуюць законы верагоднасці, і правільны вынік мы не атрымаем.

Такім чынам кожны чалавек мае роўнае з усімі права трапіць у выбарачную сукупнасць.

***— Пяць выпадковых крокаў, каб дабрацца да рэспандэнта?***

— Не менш. Наш рэспандэнт не можа быць знаёмым інтэрв'юера. Інтэрв'юер не можа ісці ў кватэру, якую пажадае, а мы яго кантралюем, каб выключыць падман.

Акрамя таго, мы павінны быць упэўнены, што ў выніку сацыялагічнага даследавання атрымалі меркаванне ўсяго насельніцтва краіны, а не 2-3 тысяч удзельнікаў апытання. Для гэтага мы складаем дэмаграфічны блок нашай выбаркі і параўноўваем яго са звесткамі афіцыйнай статыстыкі. Вылічваем сярэдні працэнт разыходжання, які не павінен перавышаць 5 пунктаў. У адваротным выпадку робіцца рамонт выбаркі метадам «снежнага камяка»: праз знаёмых знаёмых дабіраюцца прадстаўнікі той або іншай катэгорыі, каб ліквідаваць скажэнне. Пры гэтым інтэрв'юер не мае права апытваць уласных знаёмых.

Пры захаванні прынцыпу «пяці выпадковасцяў» падчас выбаркі, пры праверцы дзеяння інтэрв'юера, правільнасці пытанняў і прахаджанні тэста на максімальнае разыходжанне дэмаграфічнага блока з афіцыйнай статыстыкай мы сапраўды атрымліваем меркаванне насельніцтва краіны. Такім чынам вызначаецца дакладнасць даследавання. Гэта вельмі складаная работа.

***— Але ж цікавая! З гадамі цікавасць не зніжаецца?***

— Мне падабаецца атрымліваць тлумачэнні таму, што адбываецца. З гадамі колькасць праблем не знікае, яны проста мяняюцца, увесь час узнікаюць новыя. Напрыклад, сітуацыя ва Украіне: чаму яна склалася, хто ў ёй вінаваты?..

У даследчую работу ўцягваешся, бо заўсёды хочацца даведацца, у чым праблема. А вынікі якаснага даследавання — гэта прадмет гонару і стымул далейшых пошукаў. Сацыёлагі здольны не толькі адказваць на пытанне «што адбываецца?», але і на пытанні «чаму гэта адбываецца?», «што будзе далей?» і, нарэшце, на самае галоўнае «што трэба зрабіць, каб негатыўная тэндэнцыя не развівалася?».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ИВЕНЕЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Родники, улица Садовая, участок № 50, кадастровый номер 622084318101000109 | 0,25 га | Подъездные пути, вблизи водоснабжение, ЛЭП | 30805650 | 6161150 | 792000 |
| 2 | д. Галимцы, улица С.П. Супрона, участок № 18, кадастровый номер 622084303301000139 | 0,25 га | Подъездные пути, ЛЭП | 28139800 | 5628000 | 792000 |

*Задаток перечисляется на р/счет № 3600614030507 ГУ МФ РБ по Минской области ЦБУ 605 г. Воложина ф-ла № 500 МУ «ОАО АСБ Беларусбанк», код 601, УНП 600537220, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится **17 июня 2015 года в 10.00** по адресу: Воложинский район, г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 16 июня 2015 г. (последний день подачи заявления 15 июня 2015 г. до 17.00)** по адресу: Воложинский район, г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2.

Контактные телефоны: (8 01772) 53 388, 51 843.



**ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|
| 1 | Резательный комплекс НА 3222ф1 | 94 981 200 |

*Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с 3012060604003 в ЦБУ №606 ф-л Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Дзержинска, ул. К. Маркса, 17, МФО 153001601, УНП 600004946, ОКПО 05550337.*

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится **29 июня 2015 г. в 14.00** по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 26 июня 2015 г. до 15.00** по указанному адресу.

**Контактные телефоны: 8 (044) 55-444-78, 8 (01716) 6-43-27, 5-52-01, тел./факс 5-52-79.**

**Сайт в интернете: www.demz.by**

■ Канікулы!

# ФОРМУЛА ПАЗІТЫЎНАГА ЛЕТА,

## або Хто паедзе ў «Зубраня»?

**27 мая ў Беларусі афіцыйна стартаваў аздараўленчы сезон. На першую змену ў Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» з'ехаліся 1100 дзяцей з усёй краіны.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Папулярнасць і запатрабаванасць «Зубраняці» ў школьнікаў і іх бацькоў — па-за канкурэнцыяй. Асабліва шмат ахвотных трапіць сюды на трэцюю летнюю змену, а пуцёўкі раскупліваюцца яшчэ за паўгода да летніх канікул.

— Мы выставілі ў інтэрнэце пуцёўкі на продаж 2 студзеня ў поўнач, а першая заяўка прыйшла на наш сайт у адну хвіліну першай гадзіны ночы. Да 8 гадзін вечара пуцёўкі на трэцюю змену ўжо цалкам разабралі. Плюс мы сфарміравалі рэзервовы спіс — на той выпадак, калі ў кагосьці зменяцца планы і сям'я адмовіцца ад пуцёўкі, — расказала **дырэктар НДЦ «Зубраня» Надзея АНУФРЫЕВА.** — Да таго ж у гэтым годзе мы сумесна з Цэнтрам міжнародных сувязяў Міністэрства адукацыі і балгарскімі партнёрамі запускаем новы праект — арандуем базу для адпачынку беларускіх дзяцей на вядомым балгарскім курорце Святых Канстанціна і Алены (на паўночным узбярэжжы паміж Варнай і Залатымі Пяскамі). Працаваць з беларускімі дзецьмі ў Балгарыі будуць нашы педагогі і важатыя, па нашых праграмах, таму на балгарскую тэрыторыю будуць перанесены найлепшыя традыцыі «Зубраняці». Дабірацца да Балгарыі збіраемся самалётам.

### ПРАВА НА АЗДАРАЎЛЕННЕ. А НЕ АБАВЯЗАК

**Кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК** расказала, што за апошнія пяць гадоў аб'ёмы аздараўлення ў краіне практычна не змяняліся: ім ахоплена ад 34 да 37% ад агульнай колькасці школьнікаў. У бягучым годзе запланавана аздаравіць больш як 344 тысячы дзяцей, праўда, у летніках з кругласутачным знаходжаннем будуць адпачываць і аздараўляцца толькі 137,5 тысячы дзяцей, а 203 тысячы школьнікаў будуць наведваць летнікі з дзённым знаходжаннем. Менавіта функцыянаванне аздараўленчых лагераў пры школах выклікае найбольшую колькасць спрэчак. Ці можа дзіця паўнавартасна адпачыць у тых жа сценах, у якіх правяло ўвесь навучальны год пад наглядам сваіх школьных педагогаў? Дзе-нідзе права на аздараўленне нярэдка ператвараецца ў абавязак: і настаўнікі, і бацькі выказваюць незадаволенасць прымусовым напаўненнем школьнага лагера. З іншага боку, адпачынак у школьным лагеры даступны малазабяспечаным сем'ям, таму запатрабаванасць у гарадах застаецца.

**Конкурс у гэтыя атрады быў, як у прэстыжны ўніверсітэт. Ахвотныя пісалі рэзюме і адказвалі на пытанні.**

Гэтым летам у Беларусі будуць дзейнічаць 174 стацыянарныя летнікі. Іх колькасць, у параўнанні з папярэднімі гадамі, не зменшылася. Лагеры з кругласутачным знаходжаннем будуць працаваць у чатырохзменным рэжыме з працягласцю кожнага заезда ад 18 да 21 дня. А вось колькасць дзяцей-інвалідаў, ахопленых аздараўленнем, расце. Плануецца, што гэтым летам змогуць адпачыць і аздаравіцца ў лагерах больш як 4 тысячы дзяцей гэтай катэгорыі.

### ЛЕТА Ў ПАЛАТКАХ

Сёлета стартуе новая рэспубліканская акцыя «Лета — на карысць». Ва ўсіх рэгіёнах будуць працаваць профільныя лагеры самай рознай накіраванасці: экалагічныя, біялагічныя, тэхнічныя, гісторыка-археалагічныя, сацыяльна-педагагічныя, матэматычныя, грамадска-гуманітарныя, лінгвістычныя, лагеры для актывістаў грамадскіх арганізацый, для высокаматываваных і адораных дзяцей, мастацкія, харэаграфічныя, ваенна-патрыятычныя, абаронна-спартыўныя і г.д.

Цудоўна апраўдалі сябе палатачныя лагеры, якія ствараюцца па прынцыпе «летнік у летніку» — на базе стацыянарных лагераў з добра развітай інфраструктурай. Яны працуюць, як правіла, у 9-дзённым рэжыме. Шэсць профільных лагераў з выкарыстаннем палатак арганізуюцца на базе Мінскага гарадскога адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Лідар». Першая змена зьбярэ лідараў клубаў маладых выбаршчыкаў. Таксама ў палатачным лагеры пройдуць змены для лідараў дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў юных эколагаў і краязнаўцаў. Акрамя таго, у ліпені ў «Лідары» будзе міжнародны профільны лагер, які збярэ навучэнцаў з Германіі і Беларусі.

Актыўна развіваецца ў гэтым годзе і валанцёрска-педагагічны профіль.

— На працягу апошніх двух гадоў у «Зубраняці» працаваў адзін валанцёрскі педагагічны атрад у складзе 25 чалавек, а сёлета ў нас на кожнай змене будуць прыцягвацца да працы з малодшымі выхаванцамі па 50 валанцёраў. Паверце, што конкурс у гэтыя атрады быў, як у прэстыжны ўніверсітэт, — расказала Надзея Ануфрыева. — Ахвотныя пісалі рэзюме і адказвалі на пытанні.

**Дзіцячы аздараўленчы лагер — гэта выдатная школа сацыяльнай практыкі. Усё, чаму навучалі дзіця ў школе і ў сям'і, можа яму тут спатрэбіцца.**

### КОЛЬКІ МОЖНА ЗАРАБІЦЬ?

Два гады таму ў нашай краіне — амаль пасля 20-гадовага забыцця — пачалі адраджаць дзейнасць летніх лагераў працы і адпачынку. І гэты від арганізацыі баўлення часу працягвае набіраць абароты. Толькі для сталічных падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў будзе арганізавана 50 такіх лагераў, 11 з іх — на загараднай базе. А ўвогуле па краіне зарабляць грошы ў лагерах працы і адпачынку будуць каля 15 тысяч школьнікаў. Натуральна, у многіх узнікае пытанне: а колькі падлетак можа зарабіць?

— Усё залежыць ад віду работ, прадукцыйнасці працы і працягласці змены, — тлумачыць Ларыса Емяльянчык. — У лагерах, дзе падлеткі працавалі 18 дзён, летась заробак даходзіў да 2 мільёнаў.

— НДЦ «Зубраня» выступаў мінулым летам адначасова і ў якасці арганізатара адпачынку, і ў якасці працадаўцы. Нашы выхаванцы займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі і за 12 працоўных дзён атрымалі каля 1 мільёна рублёў. Работы па добраўпарадкаванні, як вы ведаеце, не каштуюць дорага, — дадала Надзея Ануфрыева. — Але няўжо дрэнна адначасова і адпачыць, і падзарабіць, і прынесці ўсім карысць?

**Сёння ў пералік работ, да якіх могуць прыцягвацца падлеткі, уваходзяць прапалка саджанцаў і сеянцаў, рыхленне глебы, збор каласкоў, сушка зерня на зернетаку, добраўпарадкаванне мемарыялаў, воінскіх пахаванняў і абеліскаў, рамонт школьных памяшканняў і мэблі, збор ягад у сельскагаспадарчых прадпрыемствах, работы па добраўпарадкаванні малочнатаварных ферм, пашыў бялізны, падушак і коўдраў з сінтэпону і гэтак далей.**

Пералік аб'ектаў, дзе будуць працаваць падлеткі, фарміруецца на рэгіянальным узроўні, а патрэбы пралічваюцца, зыходзячы са спецыфікі рэгіёна: калі рэгіён сельскагаспадарчы, то асноўнымі аб'ектамі стануць аграпрамысловыя арганізацыі, а калі рэгіён прамысловы, то, безумоўна, для старшых школьнікаў знойдзецца некваліфікаваная праца на прамысловых прадпрыемствах ці ў гандлёвых аб'ектах.

Немалаважна, што цяпер да працы ў складзе студэнцкіх атрадаў дазваляецца прыцягваць і падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Летась, напрыклад, побач са старэйшымі таварышамі ў студатрадах шчыравалі амаль 1800 дзяцей, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх.

### СПАКОЙ, ТОЛЬКІ СПАКОЙ!

Многіх бацькоў цікавіць пытанне: а ў колькі ж гадоў можна адпускаць сваё дзіця, так бы мовіць, у «самастойнае плаванне»?

Спецыялісты раяць: перш чым выправіць дзіця ў аздараўленчы лагер, бацькі павінны ўлічыць некалькі момантаў. Па-першае, ці ёсць у яго самога жаданне ехаць у лагер. Па-другое, ці дазваляе ўзрост дзіцяці, яго характар, псіхалагічныя асаблівасці на працяглы перыяд заставацца без бацькоў (аптымальны ўзрост для адпраўкі дзіцяці аднаго ў аздараўленчы лагер — 8 гадоў). Па-трэцяе, ці няма абмежаванняў па здароўі, якія перашкаджаюць дзіцяці знаходзіцца ў лагеры.

Дзеці вельмі ўспрымальныя да хваляванняў дарослых, таму чым спакайней бацькі будуць рэагаваць на ад'езд дзіцяці, тым лягчэй яно ўспрыме расставанне і новыя ўмовы жыцця. Падчас знаёмства з выхавацелямі (важатымі) бацькі павінны папярэдзіць іх пра асаблівасці характару дзіцяці, паведаміць, ці ўмее дзіця плаваць, якой ежы аддае перавагу, а якую не есць, пра ўзаемаадносіны з аднагодкамі і г.д.

**Менавіта функцыянаванне аздараўленчых лагераў пры школах выклікае найбольшую колькасць спрэчак. Ці можа дзіця паўнавартасна адпачыць у тых жа сценах, у якіх правяло ўвесь навучальны год пад наглядам сваіх школьных педагогаў?**

Бацькам, чые дзеці ўпершыню едуць у лагер, рэкамендуецца не спяшацца з візітам: дзіцяці патрабуюцца 2—3 дні на адаптацыю ў лагеры, і прыезд у гэты час можа абвастрыць у ім жаданне з'ехаць дадому. Аптымальна — прытрымлівацца ўстаноўленых кіраўнікамі аздараўленчага лагера бацькоўскіх дзён.

— Дзіцячы аздараўленчы лагер — гэта выдатная школа сацыяльнай практыкі, — падкрэслівае Надзея Ануфрыева. — Усё, чаму навучалі дзіця ў школе і ў сям'і, можа яму тут спатрэбіцца. У дзяцей вельмі шмат комплексаў, у тым ліку і ў стасунках. Лагер жа разнявольвае і вучыць іх стасункам у соцыуме, — падкрэсліла Надзея Ануфрыева.

Надзея НІКАЛАЕВА


ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

*режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел. 327-52-36, 226-03-01*

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3-х лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Чичурина, д. 6 – 10 мес., ул. Чичурина, д. 12 – 11 мес., ул. Чичурина, д. 14 – 18 мес., ул. Чичурина, д. 18 – 17 мес., ул. Чичурина, д. 20 – 27 мес., пр-т газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес., ул. Г. Ширмы, д. 7 – 18 мес., ул. Одинцова, д. 54 – 13 мес.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств № 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой». Жилой дом № 11 по генплану. Встроенные помещения.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/938-4189 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 11 ноября 2011 года.

Земельный участок площадью 0,1464 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Проектом предусматривается строительство крупнопанельного, односекционного, 18-этажного, 112-квартирного жилого дома в конструкциях серии М 111-90 со встроенными помещениями. Административные помещения № 1, № 2, № 3 расположены на первом этаже жилого дома и имеют самостоятельные входы.

Начало строительства жилого дома – июнь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – август 2015 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 26.05.2011 № 387-60/11 с дополнениями № 02-1154 от 16.06.2011 и № 676-60/14 от 31.10.2014.

Договор строительного подряда от 10.04.2013 № 120С-04-13, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство административных помещений № 1, № 2, № 3.

Предметом договора будет являться строительство административных помещений.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади административных помещений № 1, № 2, № 3 без учета выполнения внутренних отделочных работ составляет 1450 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату внесения денежных средств.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м площади уменьшается на сумму, эквивалентную 100 долларам США и составит 1350 долларов США.

Заявления о долевом строительстве будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами или юридическими лицами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор* Н.В.Милошевский

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

# ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 5 (13)



# СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ

## Праект «Фарпост спакою» атрымаў перамогу ў адной з намінацый конкурсу на найлепшае асвятленне ў сродках масавай інфармацыі дзейнасці МУС

**Сёлета да журы паступіла больш за 150 творчых прац ад рэдакцый і асобных аўтараў. Пераможцаў вызначалі ў 7 намінацыях. Сярод іх — «Найлепшы аўтар», «Найлепшы інтэрнэт-праект», «Найлепшы карпункт», «Найлепшая фотаработа»... «Фарпост», які з мая 2014 года курыруе спецыяльны карэспандэнт Тарас Шчыры, перамог у намінацыі «Праект года».**





**▲ Узнагароду«Фарпосту» ўручае Віктар ПІСКАРОЎ, былы міністр унутраных спраў БССР.**
**◄ Лаўрэаты, госці і арганізатары конкурсу.**

Найлепшым аўтарам прызналі Дзмітрыя Лукшу, рэдактара аддзела крымінальных навін тэлеканала «Беларусь 1», а галоўны прыз за фотаработу атрымаў Аляксандр Стадуб, фотакарэспандэнт газеты «СБ. Беларусь сёння» і часопіса «Спецназ».

Лаўрэатаў, пераможцаў павіншаваў і ўзнагародзіў Мікалай Мельчанка, намеснік міністра ўнутраных спраў.

Як паведамілі ў МУС, галоўнымі мэтамі конкурсу з'яўляюцца павышэнне ўзаемадзеяння праваахоўнікаў са СМІ і аб'ектыўнае асвятленне працы беларускай міліцыі.

**Якаў ЖУРБІН.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

■ Ёсць пытанне

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА

**— Ці праўда, што міліцыя ладзіць летні адпачынак для так званых цяжкіх падлеткаў?**

**(Мікалай К.,** *Лагойск***)**

— З 1 мая па 1 кастрычніка органы ўнутраных спраў разам з камісіямі па справах непаўналетніх, установамі адукацыі, спорту і турызму ўдзельнічаюць у міжведамаснай праграме «Клопат». Сутнасць яе ў тым, каб папярэдзіць правапарушэнні падлеткаў падчас канікул, калі з боку бацькоў часта адсутнічае кантроль за іх паводзінамі. Асаблівая ўвага надаецца дзецям са шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў, тым, хто знаходзіцца на ўліку ў міліцыі, — расказаў Віталь Янчын, начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Беларусі. — Хлопчыкаў накіроўваюць у ваенна-патрыятычныя і абаронча-спартыўныя летнікі. Летась, напрыклад, працавалі 354 падобныя лагеры. У тым ліку 3 на базе часцей і падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў. Звыш 320 тысяч непаўналетніх наведалі дзённыя (школьныя), аздараўленчыя, палатачныя і валанцёрскія лагеры, студэнцкія будаўнічыя атрады. 4 тысячы падлеткаў, што знаходзяцца на ўліку ў Інспекцыі па справах непаўналетніх,часова працаўладкавалі. Падобныя мерапрыемствы плануюць рэалізаваць і гэтым летам. Акрамя таго, адбудуцца турыстычныя паходы, злёты, экскурсіі з наведваннем помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, спартыўныя турніры.

**Якаў ЖУРБІН** ■

■ Сітуацыя

# КУДЫ ЗНІКАЮЦЬ ДЗЕЦІ?




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**За чатыры месяцы ў органы ўнутраных спраў паступіла 414 паведамленняў аб знікненні непаўналетніх. На пачатак мая толькі тры з іх заставаліся ў пошуку.**

## ЗАЯВЫ ПАДАЮЦЬ МЕНШ

У дзяцінстве я стаў сведкам аднаго здарэння, якое запомніў на ўсё жыццё. У маім жодзінскім дзіцячым садку вялікіх праблем ніколі не было. Да таго часу, пакуль два хлопчыкі не збеглі з дашкольнай установы. Шукалі іх гадзіны са дзве і знайшлі на чыгуначным пераездзе, што за два кіламетры ад садка. Як высветлілася пазней, яны проста вырашылі збегчы... у Германію. Зараз усё гэта ўзгадваецца з усмешкай, аднак тады бацькам, выхавацелям і праваахоўнікам жартаваць хацелася менш за ўсё.

— Сярэдні ўзрост зніклых дзяцей — 15-17 гадоў. Падставы, па якіх яны знікаюць, розныя, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **Анатоль САКОВІЧ, кіраўнік Галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС Беларусі.** — Нехта бяжыць з прычыны сваркі з бацькамі, нядобрай сям'і, хтосьці хоча адчуць сябе больш свабодным. На шчасце, у агульнай статыстыцы выпадкі, калі прычынай знікнення дзіцяці з'яўляецца злачынства, адзінкавыя. Як і тыя здарэнні, калі дзеці гублююцца падчас прагулкі з бацькамі. У большасці выпадкаў праваахоўнікі знаходзяць іх за некалькі гадзін. Што тычыцца заяў аб знікненні непаўналетніх, колькасць іх пастаянна зніжаецца.

У вышуку, пачынаючы з 1994 года, яшчэ знаходзіцца 51 непаўналетні. Супрацоўнікі МУС дапускаюць, што некаторыя з іх маглі стаць ахвярамі. Як, напрыклад, 14-гадовая Настасся Кот, што знікла 28 жніўня 2013 года ў аграгарадку Сеніца. «Аднак ёсць выпадкі, калі зніклыя без вестак, якія, як мы меркавалі, сталі ахвярамі злачынстваў, жывыя і здаровыя. Так, у лістападзе 2001 года неўзабаве пасля продажу кватэры зніклі 37-гадовая жыхарка Гродна і яе 8-гадовая дачка. Была заведзена крымінальная справа па факце забойства маці і дачкі. Але ў лютым 2015 года ўжо дарослая дзяўчына выйшла на сувязь са сваякамі. Аказваецца, увесь гэты час яны пражывалі ў Краснадарскім краі. Прычынай, па якой зніклыя выйшлі на сувязь праз 13 гадоў, — адсутнасць дакументаў».

**Падключыце ў свайго мабільнага аператара паслугу бацькоўскага кантролю, якая дазваляе вызначыць раён апошняга знаходжання дзіцяці.**

Наогул, адкрытая мяжа з Расіяй праблема для праваахоўнікаў. Ёсць падазрэнне, што многія з непаўналетніх уцекачоў абралі менавіта ўсходні маршрут, як гэта зрабіла яшчэ адна з дзяўчат.

— У яе сям'і былі нармальныя стасункі. Праўда, бацькі дзяўчыну празмерна кантралявалі, адсочвалі кожны яе крок. І пасля таго, як яна аднойчы спазнілася дадому, трымалі некалькі тыдняў пад хатнім арыштам. Школьніца проста сабрала свае рэчы і з'ехала. Знайшлі яе праз год у інтэрнэце пад чужым прозвішчам. Як высветлілася, яна падпрацоўвала, танцавала ў расійскіх барах. І гэта ў 15-гадовым узросце.

## «МАМА, ТАК ТРЭБА»

Заявы ў міліцыю аб знікненні дзяцей пішуць штодня. Большасць зніклых атрымліваецца знайсці адразу, частка з іх вяртаецца дадому самастойна. Але ёсць выпадкі, калі ўцёкі з сям'і становяцца для дзіцяці нормай. На вуліцы ён адчувае сябе больш спакойна, чым сярод родных. Што казаць, сумная праўда.

— У Барысаве дзяўчынку знайшлі, але яна ўсё роўна збегла. І калі яе на вуліцы сустрэлі аднакласнікі, прызналася, што яе дома палохала маці, абяцала накіраваць у спецшколу з прычыны дрэнных паводзін. У Кастрычніцкім раёне сталіцы неяк знік хлопчык. Маці знайшла яго на вуліцы, аднак той дома напісаў запіску са словамі «Мама, так трэба» і зноў збег.

З такімі дзецьмі міліцыянерам даводзіцца сапраўды памучыцца. Бо ў такіх выпадках падлеткі самі зацікаўлены ў тым, каб не вяртацца дадому ці ў спецыялізаваную дзіцячую ўстанову.

А вось 15-гадовы хлопец каля 10 разоў збягаў з Радашковіцкай школы-інтэрната дзеля таго, каб быць разам з маці, якую пазбавілі бацькоўскіх правоў. Пры гэтым яго сваякі ўтойвалі месцазнаходжанне хлопчыка, а ён, па версіі міліцыі, увесь час валацужнічаў.

У пошуках зніклых дзяцей актыўную дапамогу аказваюць грамадзяне, валанцёрскія арганізацыі, з якімі ў міліцыі таксама наладжаны кантакт. Яны актыўна дапамагаюць праваахоўнікам распаўсюджваць арыенціроўкі. Менавіта неабыякавыя грамадзяне знайшлі ў Мінску хлопчыка, які заблудзіў пасля школы і не асмеліўся звярнуцца па дапамогу.

## КАЛІ МІЛІЦЫЯ ПАЧЫНАЕ ВЫШУК?

— Усе размовы пра тое, што праваахоўнікі пачынаюць шукаць чалавека толькі пасля трох дзён знікнення, гэта міф. Шукаюць адразу пасля таго, як напісана заява. Калі падобнае ўсё ж такі здарылася, не панікуйце. Узгадайце апошнія размовы з вашым дзіцём. Патэлефануйце яго сябрам, паспрабуйце даведацца, ці ведалі яны пра яго планы. Абавязкова ўзгадайце прыкметы: якія рэчы меў пры сабе, у якую вопратку быў апрануты. Замест таго, каб тэлефанаваць ва ўсе бальніцы, пазваніце ў бюро рэгістрацыі няшчасных выпадкаў. Разам з тым, калі дзіця вярнулася, калі ласка, паведаміце аб гэтым міліцыі.

Падключыце ў свайго мабільнага аператара паслугу бацькоўскага кантролю, якая дазваляе вызначыць раён апошняга знаходжання дзіцяці. Акрамя таго, не трэба пакідаць дзіця без нагляду на дзіцячых пляцоўках, у машыне, каля крамы. Ён абавязкова павінен ведаць свой хатні адрас, нумар тэлефона і, безумоўна, прозвішча. Але гэта ніколі не дапаможа ў выпадку, калі дзіця праз сварку самастойна пакінула дом тых, каго яно лічыла самымі роднымі людзьмі ў свеце...

**Сярэдні ўзрост зніклых дзяцей — 15-17 гадоў.**

— Асаблівую заклапочанасць у нас выклікаюць шматлікія факты наўмысных уцёкаў. Дзіця, якое пакінула дом ці спецыяльную інтэрнатную ўстанову, не заўжды можа адэкватна арыентавацца ў навакольнай прасторы, не можа правільна размяжоўваць дабро і зло, можа трапіць да нядобрых людзей. Часта падлеткі збягаюць са скрадзенымі грашыма, якія трацяць у гульнявых і забаўляльных цэнтрах. Усё гэта можа прывесці да сустрэчы з тым, хто лёгка здолее ўцягнуць яго ў злачынную дзейнасць.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Па-за службай

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ — СТАРЫМ РЭЧАМ

## Супрацоўнік міліцыі з Віцебска стварае цудоўныя сувеніры з розных дробязяў

**Звычайна людзі выкідваюць многае з таго, што ён выкарыстоўвае для творчасці. Зрабіў флэшку, падобную да падводнай лодкі, чарнільную ручку ў корпусе дзіўнай прыгажосці... Творчасцю займаецца ў вольны час. Апошняга, праўда, нямнога.**


Аляксандр ЦІМОХІН.

— Яшчэ ў віцебскім політэхнічным тэхнікуме ў мяне з'явілася любоў да тэхнікі. Таксама скончыў дзве ВНУ: я — прафесійны чыгуначнік і юрыст... Паверце, я не сяджу гадзінамі і не прыдумваю, што б мне зрабіць, ды і чарцяжы не малюю. Проста, калі трапляецца ў рукі нешта, чым ужо не карыстаюцца, думаю, дык чаму б гэта не выкарыстаць па-новаму... Напрыклад, працэсар быў калісьці круты. Ён ужо даўно састарэлы, смела можна выкінуць. Але ж можна прасвідраваць у ім адтуліну і зрабіць з яго бірульку, а потым падарыць найлепшаму сябру. А яшчэ варыянт: можна зрабіць падстаўку для тэлефона. І такім чынам старая тэхніка можа «падтрымліваць» новую, гарманіраваць з ёй, — распавядае «Звяздзе» **Аляксандр ЦІМОХІН, маёр міліцыі, старшы інжынер аператыўнай сувязі аддзела ўнутраных спраў адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Віцебска.**

Такія цудоўныя самаробкі, зробленыя залатымі рукамі, мастацтвазнаўцы называюць стылем «сцімпанк». У папулярнай сярод карыстальнікаў інтэрнэту Вікіпедыі і на іншых рэсурсах многа і падрабязна напісана пра гэты напрамак.

— Калі коратка, магу сказаць, што галоўная ідэя кірунку навуковай фантастыкі, субкультуры ў тым, што свет «застыў» у сваім развіцці на мяжы XIX-XX стагоддзяў. А тады, як вядома, цывілізацыя рванула ўперад: з'явіліся паравыя машыны, дырыжаблі, паветраныя шары і многае іншае. Дык уявім сабе, што далей яны б толькі ўдасканальваліся... Пры гэтым дызайн фактычна не мяняўся. Бо ўсе аўто, лятаючыя апараты, зброя і гэтак далей — у стылістыцы віктарыянскай Англіі, — тлумачыць суразмоўца.

Я папрасіў Аляксандра Анатольевіча паказаць мне тое, што ён ужо стварыў.

— Ну, вось як вы думаеце, што гэта такое? Флэшка! Так, працуе. Так, падобная да падводнай лодкі. Але, можа, у выніку дапрацоўкі яна стане «часткай паравой машыны»... Я не вырашыў яшчэ (на маіх вачах ён пачаў шукаць варыянты таго, як можна дапрацаваць флэшку. — **Аўт.**). А вось — механічны друкаваны станок *(жартуе. — **Аўт.**)*. Ручка не простая — чарнільная. Не, чарніла не выліваецца, бо ўнутры яна такая ж, як у крамах, а звонку аўтарская... Для афармлення, упрыгожання самаробак выкарыстоўваў розныя латуневыя маленькія дэталі: шасцярэнькі, гайкі, дрот. Ніякага спецыяльнага абсталявання для творчасці не патрабуецца. У мяне звычайныя інструменты: надфіль, напільнік, паяльнік... — працягвае майстар.

Што зробіць у найбліжэйшай будучыні? Сказаў, што, верагодна, камунікатар. Гэта прылада, якая ўяўляе з сябе кішэнны камп'ютар з убудаванымі модулямі бесправадной сувязі. Такія можна ўбачыць на руках у герояў фантастычных фільмаў і гульняў.

— Цяпер як? Рэч колькі гадоў адслужыць — і ўсё. А хочацца, каб ёй карысталіся доўга, каб корпус быў надзейны, а «начынне» адпавядала патрабаванням часу. У таго ж камунікатара больш складаная аперацыйная сістэма, чым у мабільнага тэлефона... Чалавецтва ў смецці ўжо, калі разабрацца, «па самы дах». Калі мы яшчэ раскопваем культурны пласт, то нашы нашчадкі будуць раскопваць... Нашы сметніцы? Усё састарэлае можна выкінуць, а лепш даць другое жыццё, — разважае гэты крэатыўны чалавек.

Дарэчы, ён сказаў, што дома ў яго нямнога «новых старых рэчаў». Бо лічыць, што калі іх занадта, то гэта ўжо перабор. Творы — добрыя падарункі знаёмым.

Аўтару гэтых радкоў майстар падарыў на добрую памяць флэшку, з якой тырчаць правады. Эксклюзівам буду здзіўляць падчас камандзіровак.

Зразумела, жонцы такога майстра пашанцавала. Дома ў такіх мужчын, як той казаў, усё працуе. А калі нешта трэба выкінуць, дык зробіць з таго, што спадабаецца, чарговы шэдэўр.

Хутка Аляксандр адсвяткуе з жонкай Аленай (яна працуе на чыгунцы. — **Аўт.**) 20-гадовы сямейны юбілей. Іх дачка Вольга вучыцца ў сталічнай ВНУ. Усёй сям'ёй любяць адпачываць на дачы. Адным словам, дружная сям'я, у галавы якой вельмі карыснае хобі. Па сутнасці ён робіць уклад і ў ахову прыроды. Іншы б і не думаў, што зрабіць з гаечкай, вінцікам. Аляксандр жа можа выкарыстаць іх для вырабу таго, што будзе здзіўляць...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара** ■



Тое, што зрабіў майстар.

■ Навіны 102

## ВЫЯВІЛІ НЕЛЕГАЛАЎ

**За грубыя парушэнні правілаў знаходжання ў краіне дэпартавана 175 чалавек.**

У Міністэрстве ўнутраных спраў падвялі вынікі аперацыі «Нелегал».

Аперацыя праходзіла з 12 па 15 мая. За гэты час супрацоўнікі міліцыі прыцягнулі да адказнасці больш за 2 тысячы замежнікаў. У дачыненні да 27 іншаземцаў завялі крымінальныя справы, 2 з іх — за незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы, 21 — за парушэнне тэрміну забароны ўезду ў Беларусь. Праваахоўнікі затрымалі чатырох чалавек, што знаходзяцца ў міжнародным вышуку.

Падчас аперацыі міліцыя правярала месцы кампактнага знаходжання замежнікаў — кірмашы, вакзалы, інтэрнаты, здымныя кватэры.

## ПАКАРАННЕ ДЛЯ ГРАШОВЫХ МАХЛЯРОЎ

**За чатыры месяцы ў Беларусі зафіксавана 309 фактаў фальшываманецтва. Да адміністрацыйнай адказнасці за незаконныя валютныя аперацыі ўжо прыцягнулі 427 грамадзян.**

Як паведамілі ў МУС, летась за аналагічны перыяд супрацоўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі зарэгістравалі 265 фактаў падробкі грашовых знакаў. У МУС канстатуюць, што павелічэнне падобных выпадкаў цалкам звязана з сітуацыяй на валютным рынку краіны. Вядома, з прычыны крызісу ў мінулым снежні многія актыўна набывалі замежныя грошы ў так званых валютчыкаў. Праз гэта 219 чалавек атрымалі адміністрацыйнае пакаранне. Шэсць тысяч падробленых банкнот, яны сталі з'яўляцца пасля таго, як насельніцтва пачало масава здаваць валюту.

Вольга Загароўская, старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС, паведаміла, што з агульнай колькасці зафіксаваных фактаў падробкі грошай у 167 выпадках прадметам правапарушэння сталі амерыканскія долары, у 84 — расійскія рублі, у 19 — беларускія. Нягледзячы на доларавую перавагу, у статыстыку нават трапіў грамадзянін, што спрабаваў пазбавіцца ад фальшывых кітайскіх юаняў. А дзве з канфіскаваных банкнот наміналам 200 еўра аказаліся сапраўднымі грашовымі сродкамі... Сербіі. На іх проста памяняліся асноўныя вывы.

Агулам праваахоўнікі з грашовага абарачэння вывелі 894 падробленых банкноты, а ў Барысаве і Ашмянах стваральнікаў несапраўдных грошай пазбавілі двух камплектаў адпаведнай тэхнікі.

Міліцыя нагадвае, што фальшываманецтва — цяжкае злачынства. За яго здзяйсненне могуць прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі да 15 гадоў. Сёлета адзін з фальшыванетчыкаў атрымаў менавіта такі тэрмін зняволення.

**Тарас ШЧЫРЫ** ■.

■ Ну і ну!

## «ХІМІЧЫЎ» У ГАРАЖЫ ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНА

**У Барысаве выяўлена найбуйнейшая лабараторыя па вытворчасці амфетаміну. Яе стварыў у арандаваным гаражы 32-гадовы нідзе не працуючы жыхар горада, які, як высветлілася, не меў спецыяльнай хімічнай адукацыі.**

— Некалькі месяцаў таму аператыўныя супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў пачалі атрымліваць інфармацыю, што на тэрыторыі Мінскай вобласці з'явіўся нейкі аптовы гандляр амфетамінам. Карпатлівы збор і аналіз звестак паступова вывелі на след мужчыны, які, падавалася, вёў замкнёнае жыццё, — паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама. — Яго затрымалі са скруткам з 37 грамамі амфетаміну, а ў арандаваным ім гаражы была знойдзена сапраўдная лабараторыя па яго вытворчасці. Затрыманы, не маючы хімічнай адукацыі, чэрпаў веды з сеціва, а таксама са спецыяльнай літаратуры. Дарагое абсталяванне, у тым ліку тое, што прадаецца толькі юрыдычным асобам, якія маюць дзяржаўную ліцэнзію, ён набыў у падпольных расійскіх прадаўцоў. Прэкурсары для вытворчасці наркотыкаў таксама набываў і прывозіў з Расіі. Абсталяванне дазваляла атрымліваць да паўкілаграма чыстага наркатычнага рэчыва за адзін вытворчы цыкл. Гараж меў сур'ёзную вентыляцыю, «вытворца» выкарыстоўваў неабходныя сродкі аховы.

Мужчына дабіўся адпаведнасці выпрацаванага ім парашку чыстай хімічнай формуле амфетаміну шляхам проб і памылак. Мяркуецца, што ён вёў працу над сінтэзам і іншых наркатычных рэчываў, у тым ліку і розных відаў спайсаў. Сам затрыманы, дарэчы, не ўжываў наркотыкі на пастаяннай аснове, тым не менш, якасць «прадукту» ацэньваў, спрабуючы амфетамін самастойна.

Падчас следчых дзеянняў стала зразумелым, чаму аператыўнікам было так няпроста выйсці на след падазраванага. Мужчына захоўваў усе магчымыя меры канспірацыі. Пра здымны гараж ніхто з яго знаёмых не ведаў. Вакол яго затрыманы ўстанавіў некалькі схаваных камер відэаназірання, якія дазвалялі кантраляваць прылеглую тэрыторыю. Мужчына прадаваў тавар оптам і не сустракаўся з пакупнікамі асабіста. Падчас вобыску канфіскавана 85 кілаграмаў прэкурсараў, хімічныя рэактывы і рэагенты, лабараторнае абсталяванне, а таксам 4,8 тысячы долараў і 200 еўра.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■.

■ Да ведама


Фота БЕЛТА.

## БУДЗЬ ЗАЎВАЖНЫМ — УКЛЮЧЫ ФАРЫ!

**З пачатку гэтага года на дарогах загінулі чацвёра дзяцей, 89 атрымалі траўмы. Як адзначылі ў Дзяржаўтаінспекцыі, 68% дарожна-транспартных здарэнняў адбыліся па віне дарослых.**

Каб прадухіліць дарожныя эксцэсы з удзелам дзяцей, з 25 мая па 5 чэрвеня ў краіне праходзіць акцыя «Увага — дзеці!». У гэтыя дні запланавана шмат прафілактычных мерапрыемстваў для школьнікаў, творчыя конкурсы, віктарыны, велаэстафеты, фінальны этап Рэспубліканскага злёту-конкурсу атрадаў юных інспектараў дарожнага руху.

Для прыцягнення ўвагі дзяцей да транспарту супрацоўнікі ДАІ настойліва просяць кіроўцаў уключаць блізкае святло фар, а таксама заклікаюць быць уважлівымі каля дзіцячых пляцовак, падчас праезду нерэгуляваных пешаходных пераходаў.

**Якаў ЖУРБІН** ■

# ІКАР СВАЙГО ЧАСУ

## Рэктар Белдзяржуніверсітэта Сяргей Абламейка лічыць, што заўжды адшукаюцца людзі, апантаныя навукай

**Вучоны, выкладчык, удзельнік і старшыня шматлікіх навуковых аб'яднанняў і канферэнцый і перадусім рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сярод кола даследчыкаў ён вядомы як знаўца інфармацыйных і касмічных тэхналогій, а таксама апрацоўкі малюнкаў і распазнавання вобразаў. Пад кіраўніцтвам Сяргея Абламейкі вядучы ўніверсітэт краіны ўвайшоў у пяцьсот найлепшых ВНУ свету. Пра тое, як гэта стала магчымым, а таксама пра перспектывы развіцця БДУ і не па чутках вядомай акадэміку аэракасмічнай сферы, даведвалася газета «Звязда».**



**— Сяргей Уладзіміравіч, вы з'яўляецеся членам аўтарытэтных міжнародных асацыяцый, а нядаўна былі выбраны замежным членам (акадэмікам) Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук і віцэ-прэзідэнтам Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў. На што «працуе» такое высокае прызнанне калег: на рэйтынг БДУ ці толькі папаўняе прафесійную скарбонку вучонага Абламейкі?**

— Упэўнены, што гэтыя два паняцці ўзаемазвязаныя. Кожная навучальная ўстанова ганарыцца сваімі, скажам так, тытулаванымі выкладчыкамі. Між тым удзел у працы грамадскіх асацыяцый патрабуе шмат часу. Але прафесійнае прызнанне вучонага немагчымае без яго навукова-арганізацыйнай працы. Для пазнавальнасці навукоўца або школы толькі адных даследчых вынікаў недастаткова. У сухім астатку — радок у энцыклапедыі або раздзел у падручніку.

Пасля распаду СССР перад Беларуссю стаяла задача зарэкамендаваць сябе на міжнароднай арэне. Неабходна было паказаць свету ключавыя супольнасці нашых вучоных, прадэманстраваць індывідуальныя вынікі і публікацыі...



Зразумела, што званні падымаюць аўтарытэт як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. Удзел у працы розных камісій, саветаў, камітэтаў дазваляе пашырыць эрудыцыю, веды, а таксама пераняць вопыт старэйшых калег у прыняцці рашэнняў. Выходзячы з матэматычнай логікі «усё сістэматызаваць», я вылучыў чатыры асноўныя напрамкі сваёй прафесійнай дзейнасці. Адзін з іх — адміністрацыйная лесвіца і грамадская праца. Раю вучоным-пачаткоўцам не пазбягаць арганізацыйнай і публічнай работы.

**— Што сёння можа матываваць маладога чалавека пайсці ў навуку? Дарэчы, якая яе галіна лічыцца найбольш запатрабаванай?**

— Думкі чалавека спыніць нельга. Заўсёды будуць ікары свайго часу, будуць людзі апантаныя навуковай справай. Відавочна, сёння мала хто з моладзі выбірае даследчую дзейнасць. Гэта ўсвядомлены выбар выключных. Хачу падкрэсліць, што сёння БДУ робіць усё магчымае, каб падтрымаць маладога вучонага. У адпаведнасці з выбранай тэмай заўсёды можна заняцца выкладчыцкай дзейнасцю на факультэтах. У нас імкнуцца фінансаваць паездкі на канферэнцыі, аказваюць садзейнічанне ў падрыхтоўцы публікацый і нават займаюцца пошукамі грантаў.

Што тычыцца кан'юнктуры, найбольш запатрабаванай навуковай вобласці, то я нагадаю адну прыказку: нам не трэба шукаць чорную кошку ў цёмным пакоі. Упор у Беларусі павінен рабіцца на ўжо эфектыўныя прыкладныя даследаванні і распрацоўкі. На тое, што сёння забяспечвае рэальнае інавацыйнае развіццё. Дарэчы, пасля крушэння Савецкага Саюза ў нас, мабыць, у адзінай з 15 краін, захаваліся і вытворчасць, і інжынерны патэнцыял.

Беларусь заўсёды славілася сваімі інжынерна-тэхнічнымі кадрамі. Як вядома, нашы навукова-даследчыя інстытуты працавалі над закрытымі праектамі і стварэннем праграмнага забеспячэння ўсяго Савецкага Саюза. Мы працягваем развіваць тое, над чым заўсёды працавалі, у чым маем карт-бланш.

**Нам не трэба шукаць чорную кошку ў цёмным пакоі. Упор у Беларусі павінен рабіцца на ўжо эфектыўныя прыкладныя даследаванні і распрацоўкі. На тое, што сёння забяспечвае рэальнае інавацыйнае развіццё.**

**— Як вы лічыце, якая вынаходка вучоных кардынальна змяніла свет і беларускую навуку ў прыватнасці? І якія дасягненні супрацоўнікаў комплексу БДУ можна сёння ўзгадаць у першую чаргу?**

— Калі коратка, без філасофскіх разважанняў, то, на мой погляд, любое сапраўднае навуковае адкрыццё можа ў корані змяніць наш свет і побыт чалавека. Дастаткова ўспомніць мабільныя тэлефоны, без якіх яшчэ 15 гадоў таму чалавецтва выдатна існавала. А калі сур'ёзна, стварэнне электрычнасці моцна паспрыяла на сусветнае развіццё. Адносна дасягненняў нашых вучоных прыгадаю фізічныя даследаванні, звязаныя з распрацоўкай лазераў. Яны былі вынайдзены і зроблены ў нас, у Беларусі. Гэта было ў мінулым стагоддзі. Што тычыцца апошніх дзесяцігоддзяў, то магу прывесці прыклад, што разам з расіянамі мы стварылі моцныя камп'ютары серыі «СКІФ». Гэта дазволіла адкрыць новую галіну ў нашых краінах — **суперкамп'ютарабудаванне.**

У БДУ таксама ёсць сферы, у якіх мы сапраўды робім поспехі. Нядаўна атрымалі Дзяржаўную прэмію нашы вучоныя-хімікі акадэмік Алег Івашкевіч, Анатоль Лесніковіч і Міхаіл Арцем'еў. Яны ўнеслі вялікі ўклад у развіццё неарганічнай хіміі. Гэтаму мы можам знайсці пацвярджэнне ў публікацыях самых вядомых навуковых часопісаў. Акрамя таго, калектыў вучоных Інстытута прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі, які ўзначальвае доктар фізіка-тэхнічных навук Барыс Бяляеў, стварыў цэлы шэраг прыбораў для касмічнай прамысловасці, якія і ў нашы дні выкарыстоўваюцца на міжнароднай касмічнай станцыі.

**— У інтэрв'ю, якое вы далі «Российской газете» ў 2006 годзе, я знайшла такія радкі: «Трэба вучыць і студэнтаў ВНУ, і тых, хто працуе з касмічнай інфармацыяй у міністэрствах. Плануецца, што адукацыя будзе дыстанцыйнай, галаўным цэнтрам у гэтай сістэме стане, магчыма, Белдзяржуніверсітэт». Як аказалася з цягам часу, вы выказалі прарочую думку...**

— Не ўпэўнены наконт прароцтва. Увогуле, шчыра кажучы, на той час я нават не марыў пра пасаду рэктара самага лепшага ўніверсітэта нашай краіны. Але з цягам часу ўсё змянілася, і сёння прыемна адзначыць, што у нас нават ліцэісты БДУ запускаюць спадарожнікі! Запуск першага з іх яны ажыццявілі яшчэ тры гады таму. Акрамя ведаў у галіне механікі, радыёсувязі і праектавання бартавой электронікі, юныя даследчыкі касмічнай галіны павінны ведаць яшчэ і матэматыку, інфарматыку, валодаць асновамі 3D-мадэлявання, ды і ўвогуле ўмець працаваць у камандзе.

З 2011 года ў БДУ дзейнічаюць новыя спецыяльнасці «аэракасмічныя інфармацыйныя сістэмы» і «касмааэракартаграфія». На факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій створаны першы ў краіне Цэнтр аэракасмічнай адукацыі. Мы маем добрае тэхнічнае абсталяванне, супрацоўнічаем з НАН Беларусі і расійскімі ўніверсітэтамі.

**— Дарэчы, даўно цікаўлюся: даследаванні ў космасе, запуск спадарожнікаў і наяўнасць касмадрома — прэстыж краіны ці камерцыйная неабходнасць?**

— І тое, і другое адначасова. Толькі заўважу: наяўнасць касмадрома ў краіне яшчэ не азначае пакарэння касмічных вяршынь. Вядома, перад даследаваннямі ў гэтай галіне, як і перад іншымі дысцыплінамі, стаяць задачы камерцыйнага характару. А чаму не?

Сёння ў БДУ функцыянуе адзіны ў Беларусі Цэнтр аэракасмічнай адукацыі, дзе рыхтуюць высакакласных спецыялістаў для патрэб сучаснай касмічнай сферы. У разрэзе міжнароднага падзелу навуковай працы ў Беларусі выраблюецца эксклюзіўныя



прыборныя базы, фотакамеры, відэа- і фотаспектральныя сістэмы. Яны эксплуатуюцца на арбітальных навуковых станцыях «Салют-4, -6, -7», арбітальным комплексе «Мір» і Міжнароднай касмічнай станцыі. Фотаспектральная сістэма ФСС і блок аптычных датчыкаў «Фатон гама» працуе з 2010 года. У выніку гэтых даследаванняў атрымана вялікі аб'ём інфармацыі аб аптычным полі атмасферы і паверхні Зямлі. Яе апрацоўка таксама мае кошт на міжнародным рынку. Наш навуковы патэнцыял дазваляе зарабляць грошы на расшыфроўцы гэтай інфармацыі для іншых краін.

**— Давайце вернемся з космасу ў аўдыторыю БДУ. Раней выкладчык для студэнтаў меў непахісны аўтарытэт, з якім нельга было спрачацца. Сёння сучасны выкладчык — гэта...**

— ...суразмоўца, які арганізоўвае жывы і цікавы навучальны працэс. Працэс, у якім студэнты з'яўляюцца раўнапраўнымі ўдзельнікамі заняткаў. Выкладчык павінен зацікавіць студэнтаў. Зразумела, што ёсць план, працоўная праграма. Ад іх нельга адхіляцца. Таксама вядома, што моладзі недастаткова, як 10-20 гадоў таму, толькі напісаць на дошцы формулы. Ім патрэбны наглядныя матэрыялы і аргументаваныя тэматычныя выявы. Сёняшні выкладчык у сваёй працы актыўна выкарыстоўвае розныя мультымедыйныя сродкі. І, дарэчы, сваю выкладчыцкую дзейнасць я не ўяўляю без гэтых сучасных дапаможнікаў.

**Не трэба быць вялікім аналітыкам, каб адзначыць той факт, што бюджэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта значна меншы, чым у аналагічных еўрапейскіх ці амерыканскіх вядучых навучальных устаноў.**

**— Нарэшце, Сяргей Уладзіміравіч, што трэба зрабіць, каб наш самы буйны ўніверсітэт у краіне трапіў у сотню найлепшых універсітэтаў свету?**

— Гэта досыць няпросты шлях, і «на раз-два» не атрымаецца. Зразумейце адно: славутыя сістэмы ранжыравання разлічаны на англамоўныя ўніверсітэты. Пры складзе рэйтынгу ўлічваецца ўзровень навуковай дзейнасці, колькасць публікацый у англамоўных часопісах. Безумоўна, уплывае і фінансаванне. Не трэба быць вялікім аналітыкам, каб адзначыць той факт, што бюджэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта значна меншы, чым у аналагічных еўрапейскіх ці амерыканскіх вядучых навучальных устаноў. А калі сродкаў у ВНУ дастаткова, то абсталяванне і арганізацыя навучальнага працэсу будуць на парадак вышэйшымі. Напрыклад, можна нават запрасіць чытаць лекцыі нобелеўскіх лаўрэатаў.

Па выніках сусветнага вэбаметрычнага рэйтынгу ўніверсітэтаў «Webometrics Ranking of World Universities» БДУ заняў 612 месца і ўвайшоў у тройку лепшых універсітэтаў СНД. У разліковай табліцы ўлічваліся звесткі аб 22 000 вышэйшых навучальных устаноў, а ўсяго ў свеце налічваецца больш за 30 000 ВНУ. БДУ саступіў толькі Маскоўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя М.В. Ламаносава (129 месца) і Санкт-Пецярбургскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту (539 месца). Так што нам ёсць куды расці і над чым працаваць.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

## Дзяніс ДУДЗІНСКІ:

# «Можна быць свабодным, нават седзячы ў чатырох сценах»

Абаяльны, гаваркі і лёгкі на пад'ём. Такое першае ўражанне застаецца пасля знаёмства з вядомым тэлевядучым, салістам гурта DaVinci і заядлым вандроўнікам Дзянісам Дудзінскім

**Для адных стала добрай традыцыяй сустракацца з ім на «Беларусь 1» у эфіры «Добрай раніцы, Беларусь», другія чакаюць працягу яго далейшых вандровак у праекце «Турыст» на тэлеканале «Беларусь 2», а трэція не ўяўляюць свята без гэтага вядучага. Пры сустрэчы Дзяніс падзяліўся ўражаннямі ад нядаўняга падарожжа, а таксама расказаў, дзе заканчваюцца межы ўласнай цікаўнасці, у чым выяўляецца для яго свабода і што сёння ў яго жыцці займае прыярытэтныя пазіцыі.**



***— Вы як чалавек, які любіць вандраваць, па натуры сваёй рамантык, «качэўнік» ці той, хто знаходзіцца ў пошуку сябе?***

— Я проста чалавек цікаўны, хаця па сутнасці, можна сказаць, дамасед. У Мінску мяне немагчыма некуды выцягнуць. Нават калі сябры запрашаюць схадзіць у клуб альбо на нейкае мерапрыемства, не згаджаюся. А ў вандроўках спалучаюцца мая праца і захапленне. Цяпер, паколькі з'явілася яшчэ і сваё турыстычнае агенцтва, трэба шукаць і пракладваць новыя маршруты, каб было што прапанаваць людзям...

***— Адкуль бярэ пачатак ваша захапленне падарожжамі?***

— Маёй першай сур'ёзнай кнігай, якую мне спачатку чытала бабуля, быў твор "Таямнічы востраў" Жуля Верна. Я потым і чытаць навучыўся найперш для таго, каб даведацца працяг гэтай гісторыі. І цяпер кажу, што не варта дзецям чытаць такія кніжкі, а то вырастуць і будуць усе грошы на падарожжы траціць.

***— Але гэта і добры стымул зарабляць...***

— Усё ж такі выдаткаў заўсёды больш. Бо пры жаданні з'ехаць на месяц, напрыклад, у Цэнтральную Амерыку ты траціш тысячы...

***— Што не дазваляе вам спыніцца?***

— Жаданне вандраваць — нібы залежнасць, ты не можаш патлумачыць, чаму не здольны спыніцца. І прыемна, калі мне ўдаецца не толькі для сябе рабіць адкрыцці ў вандроўках. Напрыклад, ездзілі людзі штогод у Барселону альбо ў Тайланд, а потым ты кажаш ім, што ёсць яшчэ лепшыя месцы, і яны згаджаюцца ехаць з табой. Безумоўна, прапанаваўшы некаму паехаць у Гандурас, вы сустрэнеце здзіўленне і боязь адважыцца на такое. І гэта нармальна, бо ў любой краіне, горадзе ёсць месцы, куды лепш не лезці... Але прыемна, лежачы пад пальмай, разумець, што можаш спакойна заказаць сабе па інтэрнэце візу з Гандураса ў Сальвадор. Ты проста садзішся, распісваеш план і пры жаданні можаш трапіць у такія месцы, якіх нават на карце не знойдзеш. Не адзін месяц часам затрачваецца, каб прадумаць маршрут. На розных форумах я разведваю ў замежнікаў, на што варта звярнуць увагу ў тым ці іншым месцы. Спісваюся з праваднікамі ў той мясцовасці, куды мы плануем наведацца, а потым ужо паведамляю людзям, што сабраліся вандраваць са мной за кампанію, з якіх этапаў будзе складацца наша падарожжа.

**Без фотаапарата я магу лёгка зліцца з натоўпам, калі вандрую па Еўропе альбо ў арабскіх краінах. У Афрыцы што ні рабі — ты белы чалавек і замаскіравацца не атрымаецца!**

***— Ёсць нейкая мяжа ў вашай цікаўнасці? Куды вы не рызыкнулі б адправіцца ў вандроўку?***

— Я чалавек цвярозага розуму і разумею: калі сусветная грамадскасць не раіць кудысьці ехаць, то трэба быць дурнем, каб не прыслухацца і дзейнічаць насуперак. Хаця, безумоўна, часам адважваешся на нейкія вар'яцкія ўчынкі. Напрыклад, у тым жа Гандурасе ў мяне быў транзіт праз гарадок Сан-Пэдра-Сула. Ён, паводле інфармацыі ў інтэрнэце, лічыцца недзе другім па ўзроўні злачыннасці ва ўсім свеце. Але ж мне было цікава даведацца, што гэта за месца. Пакінуўшы рэчы ў камеры захоўвання ў аэрапорце, я ўзяў з сабой толькі дзесяць долараў у мясцовай валюце і паехаў знаёміцца з мясцовасцю. Здавалася б, сядзяць людзі ў кавярнях, іншыя гуляюць у футбол — жыццё цячэ сваім ходам. А потым да цябе падыходзіць чалавек і папярэджвае, што лепш табе не гуляць тут, бо ты турыст. Таму заўсёды варта мець на ўзбраенні інфармацыю пра тое, чаго рабіць нельга.

***— У вандроўках вы не любіце проста назіраць збоку. Якія прыёмы вам дапамагаюць «стаць сваім»?***

— Мне гэта ўдаецца за кошт знешнасці і назіральнасці. У той жа Лацінскай Амерыцы мяне спакойна прымаюць. Калі я там буду ісці ў натоўпе, то наўрад ці ў некага з'явіцца думка: вось турыст і яго можна развесці на грошы. Звычайна, апынуўшыся ў незнаёмым горадзе, я іду ў царкву, на галоўную плошчу і на мясцовы базар. Гляджу, як паводзяць сябе людзі, як размаўляюць, спрабую зразумець, што ў іх адбываецца ў жыцці. Карысна таксама наведаць нейкую кавярню на ціхай вулачцы. І ўжо праз некалькі гадзін ты будзеш мець уяўленне пра тое, якія людзі цябе атачаюць, і на падставе гэтага арыентавацца, як сябе паводзіць з імі. Толькі фотаапарат і выдае, што ты турыст. Без фотаапарата я магу лёгка зліцца з натоўпам, калі вандрую па Еўропе альбо ў арабскіх краінах. У Афрыцы што ні рабі — ты белы чалавек і замаскіравацца не атрымаецца!

***— Вам цікава было б здзейсніць падарожжа ў мінулае?***

— Ведаеце, чым больш чытаеш, тым часцей пераконваешся, што найлепшы час той, дзе ты цяпер. Бо ў мінулых эпохах ёсць розныя свае нюансы. Тыя ж пытанні гігіены для мяне маюць важнае значэнне. Таму, мабыць, я выбраў бы падарожжа ў будучыню, але сур'ёзна пра такое ніколі не задумваўся.

***— Тыя ж паездкі ў краіны Афрыкі таксама ставяць камфорт пад пытанне...***

— Так, аднак разумееш, што гэта часовая з'ява. І недзе праз тыдзень ты вернешся з джунгляў і будзеш есці нармальную ежу, прыняўшы гарачую ванну. Наогул не люблю разважаць катэгорыямі «а вось калі б...».

***— Пазіцыя «жыць тут і цяпер» дае вам адчуванне асалоды ці ўсведамленне няспыннай плыні часу?***

— Хуткабежнасць дае мне пачуццё асалоды. Прачынаючыся раніцай і лежачы перад тэлевізарам, я разумею: у гэты момант марную гадзіны новага дня. І думаю, што вось так і цікае час, праходзяць гады. Здаецца, год назад з Эфіопіі вярнуўся, а адчуванне, быццам толькі некалькі месяцаў таму ўсё адбылося. У гэтым і крыецца момант асалоды. Мяне радуе, што мой арганізм зрабіў выбар растрачваць свой час у падарожжах.

***— Падзяліцеся ўражаннямі з нядаўняй вандроўкі...***

— Я даўно марыў убачыць адно таямнічае месца на зямлі — Дар'енскі прабел. Ён знаходзіцца на мяжы Панамы і Калумбіі. Па заходнім узбярэжжы Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі праходзіць Панамерыканская шаша, якая перарываецца толькі ў адным месцы, дзе і знаходзіцца «прабел». Там джунглі непраходныя, банды, і трапіць туды турыстам даволі складана. Яшчэ перад ад'ездам трэба сабраць шмат розных дакументаў, а ў Панама-Сіці ідзеш па дазвол у міністэрства навакольнага асяроддзя, потым афармляеш дакументы ў пагранічнай службе... Словам, не адзін дзень на збор папер траціш, а затым наймаеш гіда і вандруеш па джунглях. Паколькі там няма людзей, то прырода проста неверагодная. Цябе кусае ўсё, што можа кусаць, ты мыешся ў ручаях, спёка пад сорак градусаў... Спачатку ты жахаешся ўсяго, а на трэці дзень бярэш скарпіёна за хвост амаль без страху...



«Добрай раніцы, Беларусь!»

***— Неяк вы сказалі, што цяпер у вас той узрост, калі можна сабе дазволіць быць самім сабой...***

— Я заўсёды такі, які ёсць. І тыя, з кім я кантактую, сябрую, добра ведаюць, што я адкрыты і шчыры. А вось на сцэне і ў кадры — гэта ўжо зусім іншая гісторыя. У працы прысутнічае пэўны элемент акцёрства. Бо здараюцца, напрыклад, дні, калі ты ў дрэнным настроі, але трэба на сцэне ўсміхацца. Настройваеш сябе і выходзіш да публікі. Наогул, лічу, што важна ўмець размяжоўваць жыццё і працу.

***— Вы лічыце сябе паспяховым?***

— Не, хаця, калі разглядаць поспех як наяўнасць свабоды, здароўя і добрага настрою, то гэта, дзякаваць Богу, ёсць. Наогул паняцце «паспяховасць» вельмі агульнае. Галоўнае, што я адчуваю сябе свабодным чалавекам.

***— У чым выражаецца для вас свабода?***

— Яна бывае рознай. Варыянт «сабрацца і з'ехаць некуды» — гэта праява знешняй свабоды. Але ёсць яшчэ і ўнутранае адчуванне, калі разумееш, што можаш адправіцца ў вандроўку, маючы для гэтага час, грашовыя сродкі і жаданне. Нават магчымасць прыняць рашэнне паехаць, напрыклад, у Бразілію заўтра, а не сёння — таксама свабода. А можна быць свабодным, нават седзячы ў чатырох сценах...

***— Сёння ў вас тры напрамкі дзейнасці: музыка, тэлебачанне і турыстычны бізнес. Што ў прыярытэце?***

— На першым месцы пакуль што турыстычнае агенцтва. Бо яшчэ і года не прайшло, як мы з маім прыяцелем пачалі сваю справу. Для мяне ўсё гэта новае, цікавае і нязведанае. Я імкнуся туды ўкладаць сілы, фінансы, душу. Тэлебачанне і музыка ўжо сталі адладжаным канвеерам, дзе ты арыентуешся, што да чаго, і проста вырашаеш бягучыя пытанні. Атрымліваеш пры гэтым задавальненне і даход. А турыстычнае агенцтва — нібы новая галаваломка, якая мне вельмі падабаецца. Нават калі справа прагарыць, я не пашкадую ні аб адной укладзенай капейцы. Бо сёння я маю магчымасць знаёміцца з новымі людзьмі, набываць вопыт, і гэта класна!

***— Даводзілася заставацца ў пройгрышы?***

— Так, і неаднойчы. Калі здараецца такое, што вы падаеце. Варта запытаць у сябе, ці можаце вы нешта змяніць? Не маеце магчымасці выправіць сітуацыю — не варта і перажываць. У жыцці бывае рознае. Пазбаўцеся ад негатыву ў кампаніі сяброў і ідзіце далей.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва Дзяніса ДУДЗІНСКАГА.**

«Натхненне шукаю ў вандроўках» (Ісландыя).



## СЕРАДА, 3 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**8.45** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
**9.10, 22.05 Серыял «След».**
**10.50, 20.00 Меладрама «Ідэальны шлюб».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Чужы твар».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.50 Серыял «Былая жонка».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Дэтэктыў «Метад Фрэйда 2».**
**10.10** Беларуская кухня.
**10.45, 21.40** Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.45, 22.50 Серыял «Косці».**
**12.40** «Зразумець і абясшкодзіць».
**13.15** Вышэй за дах.
**13.45, 18.55 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**14.55, 20.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**15.50** Рэпарцёр.
**17.55, 1.10 Серыял «Смерць у раі».**
**21.00** Рэальны свет.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.40 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.10 Серыял «Быць чалавекам».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.00, 19.00, 1.30** Калейдаскоп.
**8.10, 21.05** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**8.35 «Шлях да прычалу». Драма.**
**10.00, 17.25 «Белыя ночы». Меладрама.**
**11.30, 23.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, народнага артыста Беларусі Юрыя Семянякі.
**12.10 «Таежная аповесць». Драма.**
**13.45** «Наперад у мінулае».
**14.10** «Розныя лёсы Тацяны Пілецкай». Дак. фільм.
**14.40 «Сямёра адважных». Драма.**
**16.10 «Жыццё адно...». Маст. фільм.**
**19.10 «Дзень шчасця». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.30 «Майстэрства жыць у Адэсе». Драма.**
**23.40** «Стихи и музыка, любовь и Петербург». Марафон аўтарскай песні, прысвечаны дню нараджэння А.С. Пушкіна.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 0.15** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Спорт-кадр.
**8.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ. «Баварыя» — «Барселона».
**10.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ. «Рэал» — «Ювентус».
**12.40** Баскетбол. НБА. Фінал Усходняй канферэнцыі. Сёмы матч. «Атланта» — «Клівленд».
**14.50** Козел пра футбол.
**15.10** Тэніс. Турнір ВТА. Рым.
**16.50** Баскетбол. Міжнародны турнір памяці С. Халіпскага. Беларусь — Румынія.
**18.30** Хакей. Чэмпіянат свету. Чвэрцьфінал. ЗША — Швейцарыя.
**20.30** Хакей. Чэмпіянат свету. Чвэрцьфінал. Фінляндыя — Чэхія.
**22.40** Більярдны спорт. Чэмпіянат свету.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Дарослыя дочкі».**
**23.00 Маст. фільм «Атамны Іван».**
**0.45** «Вячэрні Ургант».
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Баявік «Пад прыцэлам».**
**10.10** «Далёкія сваякі».
**10.40 «Салдаты 5». Серыял.**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Каханне 911».
**14.50, 23.00 «Пантэра». Серыял.**
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Вам і не снілася»: «Шпіёны Яго Вялікасці».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Ну ты і прыдурак!».**
**22.05** «Глядзець усім!».
**0.35** «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30 Маст. фільм «Старая, старая казка.»**
**11.15 Маст. фільм «Аўрора.»**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 1.30 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
**14.15, 4.10 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Кука».**
**21.10, 23.15 Серыял «Метад Лаўровай».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**2.25 Маст. фільм «Сведка на вяселлі».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 17.10** «Маскоўскі дэтэктыў. Чорная воспа».
**12.30 Маст. фільм «Міхайла Ламаносаў».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55** «Загадка лёсу».
**21.55, 23.10 Серыял «Плюс Любоў».**
**23.55** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05** «Сонечна. Без ападкаў».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45** «Усё будзе добра!».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Інспектар Купер-2».**
**21.30 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.15** «Анатомія дня».
**23.55 Серыял «Аперацыя «Лялькавод».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.45, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Сонны гарадок».**
**8.25, 18.25 Серыял «Высакародная жанчына».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак.
**11.00 Драма «Іп Ман».**
**12.55 Серыял «Канец парада».**
**13.50, 15.45, 16.45, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**14.10 Серыял «Амазонія».**
**16.20** «Золата маўчання».
**16.55 Серыял «Мёртвая зона».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Маст. фільм «Мексіканец».**
**23.10 Серыял «Байкі са склепа».**
**23.35** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00** Серыял «Васьмідзясятыя».
**10.00, 19.00** Серыял «Тата на вырост».
**11.00** Камедыя «Два светы».
**13.15** Серыял «Гармідар».
**14.00, 1.00** Серыял «Дочкі-маці».
**15.00, 3.00** «Давай развядзёмся!».
**16.00, 20.00** Серыял «Сваццці».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**21.10** Меладрама «Караліна».
**23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15, 23.40** «Маленькая міс Маркер». Маст. фільм.
**13.05** Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага. Успамінаючы вялікія старонкі. Фартэпіяна.
**14.00, 22.20** «Узыход цывілізацый». Дак. серыял.
**14.55, 19.30, 23.10** П.І. Чайкоўскі. «Поры года. Ліпень» («Песня касца»).
**15.10** «Пушкін і лёсы рускай культуры». «19 кастрычніка».
**15.40** «Хірург Валерый Шумакоў — зорка ў сузор'і Скарпіёна». Дак. фільм.
**16.10** Штучны адбор.
**16.50** «Гісторыі ў фарфоры». Дак. серыял.
**17.20** «Больш, чым каханне». Пётр Капіца і Ганна Крылова.
**18.05** Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага. Успамінаючы вялікія старонкі. Скрыпка.
**19.15** Галоўная роля.
**19.35** «Абсалютны слых».
**20.15** «Добрай ночы, малыя!».
**20.30** «Бывай, XX стагоддзе! Віктар Астаф'еў».
**21.10** «Правілы жыцця».
**21.40** Успамінаючы Святаслава Бэлзу. «Незададзеныя пытанні». Дак. фільм.
**1.30** «Васіль Ладзюк: Уроки спеваў». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2007 год.
**7.00, 8.50, 9.40, 11.00, 11.30, 13.00, 14.30, 15.40, 17.00, 17.30, 17.50, 18.45, 20.40, 21.40, 23.00, 23.45, 23.50, 0.40, 2.00, 2.35, 3.30, 5.30** Музычная Настальгія.
**7.30** Маст. фільм «Дубраўка».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**13.30** Маст. фільм «Мары на сустрач». 1963 год.
**15.00** «Мінулы час».
**16.00** «Народжаныя ў СССР» з Уладзімірам Глазуновым. Паўтор ад 02.06.2015.
**17.20** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**17.40** М/ф «Таежная казка».
**18.00** Праграма «Адамаў яблык». 1991 год.
**19.30** Маст. фільм «Дачка Стратыёна».
**21.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР» з Уладзімірам Глазуновым. Прамы эфір.
**23.20** М/ф «Страла ляціць у казку».
**0.00** «Акулы пяра». Любоў Успенская. 1995 год.
**1.30** «Назад у СССР» з У. Мукусевым: «Варожыя галасы». 2007 год.
**3.00** М/ф «Залатая антылопа».
**4.00** Маст. фільм «Ваенна-палявы раман».

### EUROSPORT

**9.30** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
**10.00** Фехтаванне. Серыя Гран-пры. Масква.
**11.00, 15.00** Тэніс. «Ралан Гарос».
**13.30, 1.00** Тэніс. Супрацьстаянні дня.
**14.30, 21.00, 2.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**21.30, 0.55** Выбранае па серадах.
**21.35** All Sports.
**21.40** Конны спорт. Вялікі шлем Ролекс.
**22.40** Конны спорт.
**23.15** Гольф. Тур PGA.
**0.15** Гольф. Еўрапейскі тур.
**0.45** Гольф-клуб.
**0.50** Парусны спорт. Яхт-клуб.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.10** Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
**7.00** Камедыя «Той яшчэ Карласан!».
**8.25** Камедыя «Касцюм Санты».
**11.00** Камедыя «Усе вырaслі».
**12.35** Меладрама «Нерэальнае каханне».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.00, 21.45, 0.40, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Выкрутасы».
**17.40, 22.00** Серыял «Вялікая школа».
**18.40** Камедыя «Зануда».
**20.20** Камедыя «На здрадзе».
**23.10** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
**1.15** Камедыя «Патрабуюцца карэктныя паводзіны».
**4.10** Камедыя «Віктар».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Доктар І.».
**8.05, 18.55, 2.00** «Эзэль». Серыял.
**9.40, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.30, 4.40** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.25, 18.00** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.20, 17.00** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.15, 20.50** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**14.10, 3.30** «Простыя складанасці».
**14.40, 1.10** «Управа». Серыял.
**15.35, 22.45** «Зорныя гісторыі».
**16.30, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**21.50, 0.25** «М.У.Р.». Серыял.
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00** Камедыя «Берні».
**7.45, 15.20** Меладрама «Двухсотгадовы чалавек».
**10.00** Драма «Бабёр».
**11.30** Драма «Вялікія надзеі».
**13.40** Драма «Усё самае лепшае».
**17.35** Фантастыка «Галодныя гульні».
**20.00** Фантастыка «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
**22.30** Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».
**0.20** Драма «Паляванне».
**2.15** Драма «28 дзён».
**4.00** Камедыя «Ромавы дзённік».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Мюзікл «Нябесныя ластаўкі».
**9.10** Прыгоды «Краіна добрых дзетачак».
**10.40, 1.30** Камедыя «Кітайская бабуля».
**12.10** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**13.30** Драма «Ганна і камандор».
**15.00** Камедыя «Механічная сюіта».
**16.50** Фантастыка «Паляўнічы».
**18.40** Камедыя «Вось гэта каханне!».
**20.20** Трагікамедыя «Рэпетыцыі».
**22.10** Фантастыка «Кантакт».
**0.00** Драма «Васьмёрка».
**3.20** Дэтэктыў «Канец аперацыі «Рэзідэнт».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 10.55** Мегазаводы.
**6.45, 2.35** Зрабі або памры.
**7.10** Гульні розуму.
**7.30** Папулярная навука.
**7.55** Непаражальныя канструкцыі.
**8.40, 17.10, 3.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**9.25** Код небяспекі.
**11.40** Цяжкае золата Аляскі.
**12.30** Скарбашукальнікі.
**13.15, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**14.00, 19.30** Код небяспекі.
**15.35** Няўлоўная расамаха.
**16.20** Дзікая прырода Амерыкі.
**17.55, 21.00, 0.45, 3.45** Шаша праз пекла.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Дзікі тунец.
**22.30** Золата ў халоднай вадзе.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Уварванне на Зямлю.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Хаос у дзеянні.
**9.40, 13.50** Калекцыянеры аўто.
**12.10, 18.00** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**13.00, 0.40, 6.25** Ванная пад ключ.
**14.40, 5.35** Не спрабуйце паўтарыць.
**16.20, 4.00** Пятая передача.
**17.10, 4.45** Махінатары.
**18.50** З-за любові да машын.
**19.40** Хуткія і гучныя.
**20.30** У пагоні за класікай.
**22.10** Склады.
**23.00** Экстрэмальныя калекцыянеры.
**23.50** Скарбы з каморкі.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Багажныя войны.

## Гараскоп на



**АВЕН.** Фінансавыя справы і становішча дома досыць стабільныя і ўтульныя, няма неабходнасці нешта мяняць, але вось жаданне такое можа з'явіцца. Стан, калі хочацца, а чаго менавіта, вы не ведаеце, ці калі трэба нешта рабіць і пры гэтым усё роўна што, не прыводзіць да нейкіх відавочных вынікаў, акрамя стомы і яшчэ большай заблытанасці. У выніку да канца тыдня можаце ўвязацца ва ўсе магчымыя авантуры і занятکі, каб нejak сябе пацешыць, хоць сапраўднае задавальненне заўсёды было побач.



**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень спрыяльны для адпачынку або вырашэння нескладаных бягучых задач. Добра гэты час прысвяціць догляду сябе, свайго фізічнага і духоўнага цела. Ёсць тэндэнцыя да канфармізму, адсутнасці жадання што-небудзь рабіць, бо і так усё добра. Такі падыход дапушчальны, але ў меру, бо ўсё ж такі варта заняцца прыярытэтнымі рэчамі, у першую чаргу па доме. Да сярэдзіны тыдня з'явіцца мноства спраў, якія запатрабуюць вашай увагі. У гэты час ваш сацыяльны статус дазволіць лабіраваць свае інтарэсы сярод іншых людзей.



**БЛІЗНЯТЫ.** Ва ўсіх пытаннях прытрымлівайцеся дакладнага плана і прынятых загадзя рашэнняў. Ваша любоў да зносін у гэты раз пойдзе вам на карысць і дасць магчымасць наладзіць патрэбныя кантакты, пагутарыць і пасябраваць з цікавымі і карыснымі людзьмі. Канец тыдня падыходзіць для замацавання сваіх адносін сур'ёзнымі ўчынкамі (змовіны, шлюб, сумеснае жыццё і гэтак далей). Гэтак жа ў канцы тыдня добра заключаць любога роду дагаворы, звязаныя з фінансавымі пытаннямі і нерухомасцю.



**РАК.** Вельмі спрыяльны тыдзень. Нейкіх асаблівых здзяйсненняў чакаць не даводзіцца, але і мірны працяг жыцця ў прыемнай абстаноўцы — таксама вельмі добрая падзея, хоць і не такая прыкметная. У фінансавай сферы будуць невялікія грашовыя паступленні. Спрабавадь змяніць сітуацыю, шукаць новую працу і г.д. цяпер не варта; настаў час, калі лепш не рабіць якіх-небудзь канкрэтных дзеянняў, а чакаць выніку ад зробленай раней працы. У сярэдзіне тыдня магчымы яркія і нечаканыя падзеі ў сферы асабістага жыцця.



**ЛЕЎ.** У вас усё, як заўсёды, добра, і тыдзень пачынаецца з пераможнага шэсця. Ёсць задачы — іх заўсёды можна даручыць іншым і пракантраляваць, каб яны ўсё зрабілі правільна. Асаблівы поспех чакае вас у асабістым жыцці, ёсць магчымасць абзавесціся новымі або надаць свежасць ужо наяўным адносінам. Другая палова тыдня падыходзіць для розных забаўляльных мерапрыемстваў і проста адпачынку на прыродзе. Спалучэнне эмацыйнага задавальнення і дзелавой актыўнасці можа прывесці да творчых парываў.



**ДЗЕВА.** Тыдзень багаты на розныя значныя падзеі ў вашым жыцці. З'яўляецца магчымасць вырашыць мноства пытанняў, выправіць сітуацыю, стабілізаваць сваё матэрыяльнае становішча. Час падыходзіць як для заключэння новых пагадненняў і кантрактаў, так і для завяршэння і канчатковага вырашэння праведзенай раней працы. Вам будзе ўласцівая ініцыятыўнасць і значны запас лідарскіх сіл, што дазволіць разабрацца з многімі пытаннямі на сваю карысць. Буйныя набыцці і ўкладанні будуць паспяховыя.

## СУБОТА, 6 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

6.40 Існасць.
**7.05, 15.30 Меладрама «У ракі два берагі. Працяг». 1—2-я серыі.**
8.45 Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Буйным планам.
**9.40, 0.15 Серыял «Кухня».**
10.40 «Пра ежу!».
10.55 Уступныя іспыты па беларускай мове ў V клас гімназій, гімназій-інтэрнатаў, гімназій-каледжаў мастацтваў.
11.25 Дача.
12.10 «Здароўе». Ток-шоу.
12.50 Кулінарная дыпламатыя.
13.25 Выхад ёсць.
**14.00 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
**17.20 Меладрама «Насуперак усяму». 1-я і 2-я серыі.**
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал. «Ювентус» (Італія) — «Барселона» (Іспанія).
1.10 Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

7.00 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**7.50 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
9.55, 21.30 Тэлебарометр.
10.00 Азбука густу.
10.35 Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
11.00 Анімацыйны фільм «Сезон палявання 2».
12.20 Капейка ў капейку.
12.55 «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
15.05 Вось гэта дзіва!
**15.40 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**17.25 Дэтэктыў «Марыя Верн: Тайна мёртвых пташак». 1-я — 4-я серыі.**
21.00 Рэальны свет.
21.35 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40 Меладрама «Джулі і Джулія. Рыхтуем шчасце па рэцэпце».**
23.55 «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
0.40 «Зразумець і абясшкодзіць».
1.10 «Халі-галі». Скетч-шоу.

### БЕЛАРУСЬ 3

7.45, 13.05, 15.20, 23.45 Калейдаскоп.
7.55, 21.05 «АРТіШОК». Артыст тэатра і кіно Павел Харланчук-Южакоў.
**8.20, 15.30 «Белыя Росы». Камедыя.**
9.45 «Камертон». Генадзь Гарбук.
**10.15 «Чакаю і спадзяюся». Драма.**
12.20 «Спіс Кісялёва. Выратаваныя з аду». Дак. фільм.
13.15 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.50 «У адзін цудоўны дзень». Камедыя.**
14.55 «Душа, адлітая ў бронзе. Міхаіл Анікушын: жыццё і творчасць». Дак. фільм.
16.55 «Аляксей Дудараў. Крыніца часу». Дак. фільм.
17.20 «Аляксей Дудараў. Рака часу». Дак. фільм.
**17.45 «Іван Грозны». Драма.**
20.45 Калыханка.
**21.30 «Смяротныя думкі». Дэтэктыў.**
23.05 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Дзмітрый Смольскі.

### БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 1.15 PRO спорт. Навіны.
8.00, 15.35 Сэлфі.
8.15 Піт-стоп.
8.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — «Дынама» (Мінск).
10.45 Баскетбол. НБА. Фінал. Першы матч.
13.00 Змешаныя адзінаборствы. M-1 Global.
15.55 Формула-Е. Гран-пры Масквы.
17.05 Дзюдо. Этап Кубка Еўропы.
20.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
21.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал. «Ювентус» (Італія) — «Барселона» (Іспанія).
0.25 Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.25 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 «Разумніцы і разумнікі».
13.00 «Ералаш».
**13.25 Маст. фільм «Звычайны цуд».**
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Татулі-2».
18.00 «Акадэмія талентаў. Курс чацвёрты».
21.05 «Сёння вечарам».
22.40 «Легенды Live». «AC/DC».
**23.25 Трылер «Без мяжы».**

### СТБ

**6.20 Маст. фільм «Кур'ер».**
8.05 «Тайны свету».
9.00 «Разумней не прыдумаеш».
10.05 «Сакрэтныя тэрыторыі».
11.00 «Мінск і мінчане».
**11.35 «Салдаты 2». Серыял.**
13.30, 16.30, 19.30 «24 гадзіны».
**13.40, 1.20 Камедыя «Оскар».**
15.15 «На 10 гадоў маладзейшыя».
15.55 «Вялікі горад».
16.45 «Наша справа».
16.55 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.30 Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы».**
20.00 «СТБ-спорт».
**20.10 Баявік «Апошні байскаўт».**
22.10 Урачыстае адкрыццё XV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2015». Канцэрт «Беларусь незалежная ў песнях і вершах».
0.25 «Масква. Дзень і ноч».

### МІР

6.00, 8.40, 12.10, 5.20 М/ф.
**6.25 Маст. фільм «Старая, старая казка».**
8.10 «Саюзнікі».
9.05 «Эксперыментатары».
9.30 «Ой, мамачкі!».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Любімыя акцёры».
**10.45 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены!».**
**12.50 Маст. фільм «Кідок у Монтэ-Карла».**
15.15 «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Закладнікі кахання».**
**23.05 Маст. фільм «Два жыцці».**
**1.05 Маст. фільм «Еці. Праклён снежнага дэмана».**
**2.50 Маст. фільм «Любоўная немач».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 «ХА». Маленькія камедыі.**
7.30 «Планета сабак».
**8.05, 11.10 Маст. фільм «Бесталковая нявестка».**
11.00, 14.00 Весткі.
11.40 «Суботнік».
**12.20 Маст. фільм «Маладая жонка».**
**14.30 Маст. фільм «Каханне на два полюсы».**
16.15 «Вызваліцелі». «Сапёры».
17.10 «Суботні вечар».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
**20.40 Маст. фільм «Ты будзеш маёй».**
**22.30 Маст. фільм «Мая мама супраць».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05, 8.20 Серыял «ППС».**
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Урачэбныя тайны плюс».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
11.05 «Паедзем, паядзім!».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «ГРУ: Тайны ваеннай разведкі».
**14.15 Серыял «Каця».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
18.05 «Следства вялі».
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.05 «Новыя рускія сенсацыі».
22.05 «Ты не паверыш!».
**22.40 Баявік «Антыкілер ДК».**
0.15 «Ахтунг, русіш!».

### 8 КАНАЛ

9.00, 13.55, 19.10, 21.00, 23.25 «Надвор'е».
9.05 М/ф.
**10.30 Серыял «Высакародная жанчына».**
11.30 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.40, 15.45 «Хатняя крама».
**11.55 Трылер «Ідэнтыфікацыя Борна».**
**14.00 Трылер «Перавага Борна».**
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Маст. фільм «Каралева ракі».**
**18.25 Серыял «Месца злачынства Маямі».**
**19.15 Камедыя «Цалкам сакрэтна».**
20.50 «Вечарніца».
21.05 «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Драма «Шпіёнская гульня».**
23.30 «Хобі TV».

### ВТБ

6.00 «PLAY».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 17.00 Серыял «Гармідар».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 2.00 «Турбамiксер».
12.00 Фантастыка «Зыходны код».
14.00, 23.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.30 «Хатняя кухня».
15.00, 5.00 Серыял «Калыска над безданню».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Сямейны бізнес».
20.30 Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана».
22.40 Скетч-шоу «6 кадраў».
0.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
0.30, 4.30 «Лаві момант».
1.00 «Нерэальная гісторыя».
1.30 Скетчком «Студэнты».

### КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Біблейскі сюжэт.
10.35 «Паўстанак». Маст. фільм.
11.45 Вялікая сям'я. Барыс Шчарбакоў.
12.40 Пернікавы домік. «Чэрнь па серабру».
13.05 Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага. Успамінаючы вялікія старонкі. Сольны спеў.
14.00 Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
14.25 «Кахі Каўсадзэ. А ці ёсць там тэатр?!». Дак. фільм.
15.25 Пушкінскі дзень Расіі. «Гульня ў бісер». «А.С. Пушкін. «Капітанская дачка».
16.05 «Капітанская дачка». Маст. фільм.
17.45 Успамінаючы Святаслава Бэлзу. «Лінія жыцця».
18.35 Святаславу Бэлзу прысвячаецца... Вечар у Вялікай зале кансерваторыі.
20.30 Да 75-годдзя Леаніда Кулагіна. «Прывалаўскія мільёны». Маст. фільм.
23.10 «Белая студыя».
23.50 «Любімыя рамансы і песні». Канцэрт Яўгена Дзятлава ў Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.
0.55 «Лятаючыя монстры». Дак. фільм.
1.35 «Рыцарскі раман». «Дару табе зорку». М/ф для дарослых.
1.55 «Шукальнікі». «Завяшчанне Сцялецкага».
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 20.30 «Прэс-экспрэс». 1995 год.
6.05, 6.50, 8.30, 9.40, 11.00, 11.40, 13.00, 14.40, 15.40, 17.00, 17.45, 19.00, 19.45, 20.40, 21.40, 23.00, 0.40, 2.00, 2.35, 3.40, 5.00, 5.50 Музычная Настальгія.
6.40 М/с «Прыгоды Рэкса».
7.10 Маст. фільм «На вастрыі мяча».
9.00, 15.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.25 М/ф «Дзядуля і унучак».
12.00, 18.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1964-ы. 2011 год.
13.20 Маст. фільм «Без сына не прыходзь».
16.00 «Колба часу».
17.20 «Атланты трымаюць неба». «Новая Галандыя».
19.40 М/с «Болек і Лёлек».
21.00 «Быў час». 2009 год.
22.00 Маст. фільм «Мае дарагія».
23.25 М/ф «Казка пра рыбака і рыбку».
0.00 Праграма «Адамаў яблык». 1991 год.
1.30 Маст. фільм «Дачка Страцьёна».
5.20 М/ф «Страла ляціць у казку».

### EUROSPORT

9.30, 14.30, 20.00, 2.30 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
10.00 All Sports.
10.30, 21.45 Тэніс. «Ралан Гарос».
13.30 Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
15.00 Тэніс. Супрацьстаянні дня.
15.45, 21.30 Тэніс.
16.00, 20.30, 1.00 Тэніс. «Ралан Гарос». Фінал. Жанчыны.
18.00 Тэніс. «Ралан Гарос». Фінал. Мужчынскія пары.
22.45, 0.15 Конны спорт.
0.30 Ралі. ERC.

### КАМЕДЫЯ

6.00, 9.50 Серыял «Вялікая школа».
7.00 Камедыя «Зануда».
8.25 Камедыя «На здрадзе».
10.50 Меладрама «Каханне з акцэнтам».
12.35 Камедыя «Дублёр».
14.05 Камедыя «Два светы».
16.00 Камедыя «Няўдачнікі».
17.45, 22.00 Серыял «Месцовы хлопчык».
18.35 Камедыя «Тры дні з прыдуркам».
20.00, 22.50, 0.50, 2.50 Скетчком «Паміж намі».
20.20 Камедыя «Сямейны план».
23.10 Камедыя «Шосты элемент».
1.15 Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
3.10 Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
4.10 Камедыя «Выкрутасы».

### ТБ3

6.00 М/ф.
10.25, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
11.20 «Prокіно».
11.30 «Хронікі маскоўскага быту».
12.20 «Гісторыі выратаванняў».
12.55, 1.30 «Пацалунак лёсу». Серыял.
16.20 «Тры волаты і Шамаханская царыца». М/ф.
17.35, 4.30 «Без тэрміну даўнасці».
18.35 «Іншыя. Дзеці Вялікай мядзведзіцы». Дак. фільм.
20.10 «Гузік».
22.00 «Чырвоныя агні». Маст. фільм.
0.00 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

6.00 Трылер «Дар».
8.00 Драма «У пагоні за шчасцем».
10.00 Камедыя «Настаўнік англійскай».
11.30 Камедыя «А вось і Полі!».
13.05 Драма «У пагоні за шчасцем».
15.05 Фантастыка «Галодныя гульні».
17.30 Фантастыка «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
20.00 Меладрама «Цяжкасці перакладу».
21.45 Меладрама «Сямейка Джонсаў».
23.25 Трылер «Тэорыя змовы».
1.20 Камедыя «Кошкі-мышкі».
3.20 Меладрама «Здзелка».
5.00 Прыгоды «Залаты Компас».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Дэтэктыў «Канец аперацыі «Рэзідэнт».
9.10 Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!».
10.55 Камедыя «Марфа і яе шчанюкі».
12.30 Камедыя «Год цяляці».
14.00 М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
15.20 Камедыя «Калачы».
16.50 Фантастыка «Кантакт».
18.40 Камедыя «Вясёлая моладзь».
20.20 Драма «Бумеранг».
22.00 Камедыя «Карпаратыў».
0.05 Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
1.30 Трылер «Самнамбула».
2.50 Прыгоды «Краіна добрых дзетачак».
4.10 Камедыя «Саламяны капялюшык».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 10.55 Мегазаводы.
6.45 Зрабі або памры.
7.10 Гульні розуму.
7.30 Папулярная навука.
7.55, 20.15, 23.15, 2.15 Код небяспекі.
8.40 Космас. Прастора і час.
9.25 Навука будучыні.
10.10 Папулярная навука.
10.55, 5.15 Навуковыя недарэчнасці.
12.30 Больш чым фокусы.
13.15 Гісторыя ежы.
14.00 Неразгаданыя тайны «Лузітаніі».
14.45 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
15.35 Асветленае бяздонне.
16.20 Цар кракадзілаў.
17.10 Асушыць акіян.
18.40 Зона 51. Сакрэтныя файлы ЦРУ.
19.30 Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
21.00, 0.45, 3.45 Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

8.00, 17.10, 5.35 З-за любові да машын.
8.50, 15.30 Хуткія і гучныя.
9.40, 16.20, 0.40, 6.25 У пагоні за класікай.
10.30 Рэальныя дальнабойшчыкі.
11.20 Залатая ліхаманка.
13.00, 4.00 Скарбы з каморкі.
13.50, 23.50 Склады.
14.40 Экстрэмальныя калекцыянеры.
18.00 Дамы на дрэвах.
18.50 Ванная пад ключ.
19.40 Акварыумны бізнес.
20.30, 21.20, 22.35 Бітвы за кантэйнеры.
23.00 Востраў з Беарам Грылсам.
1.30 Зроблена ў Кітаі.
2.20 Перш за ўсё — самалёты.
3.10 Аэрапорт знутры.
4.48 Як гэта ўстроена?
5.12 Як гэта зроблена?
7.12 Праз магію да зорак.

## Кінагід

# ...За дона Педра!

**Фільм «Прывітанне, я ваша цёця!» сёлета адзначыць 40-годдзе.**



Двухсерыйная камедыя рэжысёра Віктара Цітова, знятая паводле п'есы драматурга XIX стагоддзя Брэндана Томаса «Цётка Чарлея», трапіла на экраны ў 1975 годзе. Аповед пра бяздомнага Бабса Баберлея, які ў памкненні паправіць сваё матэрыяльнае становішча пагадзіўся прыкінуцца мільянеркай донай Розай д'Альвадорэс, прынёс акцёру Аляксандру Калягіну ўсесаюзную славу і прыйшоўся даспадобы некалькім пакаленням гледачоў.

У чорна-белай «гістарычнай хроніцы» напачатку фільма пастановачныя кадры з Калягіным чаргуюцца з рэальнымі фрагментамі з паказу мод Марлен Дзітрых, жаночага боксу, сцэсцярвавага параду і іншых яркіх мерапрыемстваў. У выбраную рэжысёрам стылістыку нямога кіно выдатна «ўкладзіся» падкрэслена тэатральная касцюмы і грым: буйныя вяснушкі ў Васільевай, бычным наклеены дагары «нагамі» вусы ў Джыгарханяна, а таксама сукенка з бахрамой ад звычайных штор, у якую пераапрануўся герой Калягіна.

Як узгадвалі ўдзельнікі здымачнай групы, многія сцэны даводзілася здымаць уначы, бо занятыя ў карціне акцёры былі надзвычай запатрабаванымі на асноўных месцах працы — у тэатрах. Прастора для здымак таксама была надзвычай абмежаванай — усяго толькі адзін тэатральны павільён, які дзякуючы майстэрству аператара-пастаноўшчыка Георгія Рэртбэрга ператвараўся ў багаты маёнтак з мноствам пакояў і нават зімнім садам...

Аляксандра Калягіна зусім не адразу зацвердзілі на ролю фальшывай мільянеркі доны Розы — гэты вобраз прымяралі на сябе таксама Яўген Лявонаў, Алег Табакоў і нават Уладзімір Этуш! Аднак мэтры саступілі ў вачах рэжысёра арганічнасці і абаянню Калягіна, які пазней адзначаў, што ніякіх асаблівых тэхнік для ўвасаблення ў ролю ён не выкарыстоўваў — проста прыглядаў усіх больш ці менш знаёмых яму дзяўчат і жанчын, пераймаючы іх жэсты і мініку.

Для «сапраўднай» доны Розы Тамары Носавай доўга шукалі «партнёрку» — малпачку. Аднак шымпанзэ па мянушцы Яша, якога зацвердзілі спачатку на гэту ролю, з самага пачатку павёў сябе як хуліган, нават напаў на другога рэжысёра, пракусіўшы таму руку. Рэжысёру давялося доўга лячыцца, а Яшу замянілі ручной малпачкай з жывога кутка Дурава, якая ні на кога не кідалася, затое вельмі баялася гуку матору камеры.



**Любімыя цытаты з фільма:**

*«Я цётухна Чарлі з Бразіліі, дзе ў лясах многа-многа дзікіх малпаў»;*
**«Я цябе пацалую. Потым. Калі захочаш»;**
*«Ці мала ў Бразіліі Педраў? І не палічыць!»;*
**«Давайце закурым — па-нашаму, па-бразільску!»;**
*«— Што хочацца мілэдзі?*
**— Мілэдзі вельмі хочацца чарачку каньячку»;**
*«Яна любіць выпіць. Трэба гэтым скарыстацца»;*
**«Мярзотнік! Назваць даму сэрам!»;**
*«Сусветна вядомая мільянерка! Ажаніцца з ёй — мара майго дзяцінства!»;*
**«Дона Роза, я стары салдат і не ведаю слоў кахання...».**

■ Zамор'е

## КАЧКІ НА ДАРОЗЕ

**У трох гарадах Англіі — Лондане, Бірмінгеме і Манчэстэры — з'явіліся вылучаныя палосы для качак на дарогах уздоўж вадаёмаў, рэк і каналаў, піша Daily Mail.**



Ініцыятарам стварэння дарожак для птушак стаў дабрачынны фонд Canal & River Trust, які адказвае за ўтрыманне ўнутраных водных шляхоў Англіі і Уэльса. Вылучаныя палосы пазначаны белымі лініямі, на дарожках намаляваны сілуэты качак. Мэта праекта — нагадаць людзям аб эфектыўным выкарыстанні грамадскай прасторы. Менеджар фонду Клэр Рызіна распавяла газеце Metro, што дарожкі трэба было зрабіць для большай колькасці жывёл, але вырашана было спыніцца на качках.

Падобныя праекты ажыццяўляліся і раней. Летась у кітайскім горадзе Чунцын была адведзена паласа для людзей з мабільнымі тэлефонамі. Арганізатары палічылі, што тыя, хто занадта захоплены сваім смартфонам, часта не глядзяць, куды ідуць, і налятаюць на іншых пешаходаў. Ды што там Кітай, такія дарожкі, думаецца, можна ўжо рабіць і ў Беларусі, бо тых, хто не выймае носа з сваіх мабільных прылад, усё больш і больш. Можа, іх адправіць у тую ж паласу, для качак?

## АЎТОБУС-РЭКАРДСМЕН ЕЗДЗІЦЬ НА... ГНОІ

**На выпрабавальным палігоне ў брытанскім графстве Бэдфардшыр аўтамабіль, які працуе на гноі, разагнаўся да 123,5 кіламетра ў гадзіну.**



У Англіі аўтобус з назвай Bus Hound — першы аўтамабіль у свеце, які атрымлівае энергію за кошт каровінага гною — пабіў рэкорд хуткасці для пасажырскіх аўтобусаў. Ён здолеў разагнацца да 123,5 кіламетра ў гадзіну. Назва Bus Hound была выбрана не выпадкова — яна адсылае да звышхуткаснай легкавой машыны Bloodhound SSC. Аўтамабіль працуе на біяметане, які атрымліваецца ў выніку анаэробнага дыгерыравання (шэрагу працэсаў, у выніку якіх мікраарганізмы раскладаюць біяразбуральныя матэрыялы ў адсутнасці кіслароду) гною бактэрыямі ў біярэактарах. Газ перапрацоўваецца ў звадкаваны, які пры гэтым мала чым адрозніваецца ад звычайнага прыроднага газу. Ён размяшчаецца на сямі баках на даху аўтамабіля і з'яўляецца «зялёнай» крыніцай энергіі. Пры гэтым ён не толькі дазваляе абыходзіцца без бензіну — новая тэхналогія спальвае метан, які ў іншым выпадку перайшоў бы з гною ў атмасферу ў выглядзе парніковага газу.

Для таго, каб пераадолець хуткасць у 90 кіламетраў за гадзіну, давялося ўнесці змены ў канструкцыю аўтобуса, у прыватнасці ў падвеску. «На палігоне аўтобус уяўляў сабой уражанне відовішча. Ён роў, як бамбавік Avro Vulcan, бо яго аэрадынаміка не разлічана на хуткасць у 120 кіламетраў за гадзіну», — падзяліўся ўражаннямі галоўны інжынер кампаніі Джон Бікертан.

**Іван КУПАРВАС** ■

# НЯДЗЕЛЯ, 7 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.25, 15.30 Меладрама «У ракі два берагі. Працяг». 3—4-я серыі.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40, 0.30 Серыял «Кухня».**
**10.45** «Пра ежу!».
**11.20** XXL WOMAN TV.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.05** Тайны следства.
**13.40** Каробка перадач.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**17.10** Нашы.
**17.25 Меладрама «Спадчынніца». 1— 4-я серыі.**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.15** Дыялогі пра цывілізацыю.
**22.50 Меладрама «Улетку я аддаю перавагу вяселлю».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.45** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**8.05, 21.40 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**10.00** Я хачу гэта ўбачыць!
**10.35, 20.05** Тэлебарометр.
**10.40** «Fitnews».
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**12.05** Хачу ў тэлевізар!
**12.10** «Зразумець і абясшкодзіць».
**12.45 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**14.50 Меладрама «Джулі і Джулія. Рыхтуем шчасце па рэцэпце».**
**17.05** «Comedy woman».
**18.10** Ікра.
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.00** Рэальны свет.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.40 Фантастыка «Я, робат».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.50, 12.55, 15.40, 0.10** Калейдаскоп.
**8.00 «Іван Грозны». Драма.**
**11.00** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Дзмітрый Смольскі.
**11.40** «Наперад у мінулае».
**12.05** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**13.05, 21.55 «Пацалунак Сакрата». Фільм першы «Смяротны водар». 1-я і 2-я серыі.**
**14.45** «Музеі Беларусі». Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж».
**15.50 «Павуцінне хлусні». Драма.**
**18.00, 23.30** «Культпрасвет».
**18.35 «Зайздрасць багоў». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.05** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 1.00** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Дзюдо. Этап Кубка Еўропы.
**9.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал. «Ювентус» (Італія) — «Барселона» (Іспанія).
**12.35** Формула-Е. Гран-пры Масквы.
**13.45** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — «Дынама» (Мінск).
**15.30** Хакей. Чэмпіянат свету. Матч за трэцяе месца. ЗША — Чэхія.
**17.55** Футбол. Таварыскі матч. Расія — Беларусь.
**20.00** Дзюдо. Этап Кубка Еўропы.
**22.35** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінал. Канада — Расія.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.40** «Фазэнда».
**11.10** «Віктар Ціханаў. Апошні з атлантаў».
**12.10** «Шлюб па завяшчанні. Вяртанне Сандры».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.15** «Кропля ў кроплю!». Фінал.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вызваленая Еўропа».
**22.00** «Што? Дзе? Калі?».
**23.10** «Містар і місіс СМІ».
**23.45 Маст. фільм «Выхаванне Арызоны».**



### СТБ

**6.05 «Студэнты International». Серыял.**
**7.35** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.55, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.20 Баявік «Апошні байскаўт».**
**10.15** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 2». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.50 Камедыя «Укол парасонікам».**
**15.25** «Дарагая перадача».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «Іствікскія ведзьмы».**
**22.35** III тур рэспубліканскага этапу Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні ў суправаджэнні Заслужанага калектыву «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі». Канцэрт «Вялікія песні вялікага народа».

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** М/ф.
**7.25 Маст. фільм «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».**
**9.05** «Ведаем рускую».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Чаму я?».
**10.45 Серыял «Чалавек-амфібія. Марскі д'ябал».**
**14.15 Маст. фільм «Еці. Праклён снежнага дэмана».**
**16.15, 22.00 Серыял «Тонкая мяжа».**
**21.00** «Разам».
**0.10 Маст. фільм «Барсаліна».**
**2.30 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
**3.20 Маст. фільм «Пакуты кахання».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Мая мама супраць».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**13.20** М/ф.
**14.15** «Расія. Геній месца».
**15.10 Маст. фільм «Чараўнік».**
**16.40** «Смяяцца дазваляецца».
**18.10** «Жывы гук».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.50 Камедыя «Вяселля не будзе».**
**23.40** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05, 8.20 Серыял «ППС».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Медыцынскія тайны».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.20** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «Я худжэю».
**14.15 Серыял «Каца».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**20.00 Маст. фільм «Небяспечнае каханне».**
**23.30** «Спіс Норкіна».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 15.25, 18.50, 21.00** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**10.05** «Адшукваецца адпачынак».
**10.35, 13.35, 17.00, 20.55** «Хатняя крама».
**10.50, 23.30** «Хобі TV».
**11.40** «Кінаблакнот».
**11.50 «Залаты век». Маст. фільм «Дарога».**
**13.45 Камедыя «Сонца ацтэкаў».**
**15.30 Драма «Дастукацца да нябёсаў».**
**17.30 Серыял «Каломба».**
**18.55 Драма «Сіністэр».**



**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Выжыць».**

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** Серыял «Гармідар».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Сямейны бізнес».
**13.30, 4.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.30** «Рублёва-Бірулёва».
**15.30** Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана».
**17.40, 22.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**18.00, 1.00** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**19.00** «Уральскія пельмені».
**20.30** Камедыя «Усё ўключана 2».
**23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Нерэальная гісторыя».
**0.00** Скетчком «Студэнты».
**0.30, 4.30** «Лаві момант».
**5.00** Серыял «Калыска над безданню».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Тайна Залатой гары». Маст. фільм.
**11.45** «Легенды сусветнага кіно». Генадзь Шпалікаў.
**12.15** «Расія, любоў мая!».
**12.40** Геніі і ліхадзеі. Луі Брайль.
**13.10** «Лятаючыя монстры». Дак. фільм.
**13.50** «Пешшу...» Ад Масквы да Берліна.
**14.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...». Аркестр імя Н.П. Осіпава.
**15.25** «Выхадкі ў старадаўнім духу». Маст. фільм.
**16.35** «Уладзімір Самойлаў. «В яростном мире лицедейства». Дак. фільм.
**17.15, 1.55** «Шукальнікі». «Бярмудскі трохвугольнік Белага мора».
**18.00** «Кантэкст».
**18.40** «Любімыя рамансы і песні». Канцэрт Яўгена Дзятлава ў Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.
**19.45** Юбілей Таццяны Друбіч. «Тыя, з якімі я...».
**20.45** «Сто дзён дзяцінства». Маст. фільм.
**22.15** Барыс Беразоўскі, Зубін Мета і Аркестр Maggio Musicale Fiorentino на VI Міжнародным фестывалі Мсціслава Растраповіча.
**23.55** «Барыс Беразоўскі. Музыка для свята». Дак. фільм.
**0.35** «Выхадкі ў старадаўнім духу». Маст. фільм.
**1.45** «Буравеснік». М/ф для дарослых.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1964-ы. 2011 год.
**7.00, 8.40, 9.40, 11.00, 11.45, 13.00, 13.45, 14.30, 17.00, 18.45, 20.05, 22.40, 23.30, 0.05, 0.50, 2.35, 3.40, 5.00, 5.40** Музычная Настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Без сына не прыходзь».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**11.20** «Атланты трымаюць неба». «Новая Галандыя».
**13.40** М/с «Болек і Лёлек».
**14.30, 0.00** «Прэс-экспрэс». 1994 год.
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Мае дарагія».
**17.25** М/ф «Казка пра рыбака і рыбку».
**18.00** «Акулы пяра». Група «Арыя». 1996 год.
**19.10, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**20.30** М/ф «Высокая горка».
**21.00** Маст. фільм «Апёк».
**23.20, 0.40** М/ф «Прыгоды Рэкса».



**1.10** Маст. фільм «На вастры мяча».
**5.25** М/ф «Дзядуля і ўнучак».

### EUROSPORT

**9.30, 18.30, 21.45** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**10.00** Тэніс. «Ралан Гарос». Фінал. Жанчыны.
**11.30, 22.15** All Sports.
**12.00** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**14.00, 19.45** Веласпорт.
**15.55** Тэніс.
**16.00** Тэніс. «Ралан Гарос». Фінал. Мужчыны.
**19.00** WATTS.
**19.15** Суперспорт. Чэмпіянат свету.
**22.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны.
**1.00** Аўта- і матаспорт.
**1.15** Супербайк. Чэмпіянат свету.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.55, 3.10** Серыял «Вялікая школа».
**7.00** Камедыя «На здрадзе».
**8.25** Камедыя «Дублёр».
**10.55** Камедыя «Няўдачнікі».
**12.40** Камедыя «Тры дні з прыдуркам».
**14.05** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**16.00** Камедыя «Шосты элемент».
**17.35, 22.00** Серыял «Месяцовы хлопчык».
**18.25** Камедыя «Сямейны план».
**20.00, 22.50, 0.40, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**20.20** Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
**23.10** Камедыя «Вяселле Бэтсі».
**1.15** Меладрама «Каханне з акцэнтам».
**4.10** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.25** «Нераскрытыя тайны».
**11.20** «Паненка і кулінар».
**11.55, 1.45** «Тайны следства». Серыял.
**15.15** «Сто пытанняў даросламу».
**16.00** «Жонка. Гісторыя кахання».
**17.20** «Без падману».
**18.10, 4.40** «Авіякатастрофы. Кропка незвароту». Дак. фільм.
**19.40** «Доказ віны».
**20.30** «Гаспадар мораў». Маст. фільм.
**22.50** «Асцярожна, махляры!».
**23.20** «Часова даступны».
**0.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.55** Трагікамедыя «Гуманітарныя навукі».
**8.40, 16.10** Камедыя «Коткімышкі».
**10.40** Прыгоды «Залаты Компас».
**12.40** Камедыя «Квартэт».
**14.20** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**18.05** Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».
**20.00** Меладрама «Даю год».
**21.50** Трылер «Ілюзія падману».
**0.00** Меладрама «Настрой індыга».
**2.30** Трылер «Дзень Святога Валянціна».
**4.20** Камедыя «А вось і Полі!».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».
**8.05** Камедыя «Кітайская бабуля».
**9.35** Камедыя «Падарунак з характарам».
**11.05** М/ф «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч».
**12.15** Драма «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
**13.30** Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
**14.55** Драма «Бумеранг».
**16.35** Драма «Чэмпіёны».
**18.15** Камедыя «Карпараты».
**20.20** Камедыя «Горка!».
**22.10, 0.00, 2.05, 4.10** Фантастыка «Паляўнічы».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45** Зрабі або памры.
**7.10** Гульні розуму.
**7.30, 10.10** Папулярная навука.
**7.55** Код небяспекі.
**8.40** Космас. Прастора і час.
**9.25** Навука будучыні.
**10.55, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**12.30** Больш чым фокусы.
**13.15** Гісторыя ежы.
**14.00** Сакрэтная атака Гітлера на Амерыку.
**14.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.35** Прыручыць дракона.
**16.20** Ласасёвыя войны.
**17.10, 22.30, 4.30** Сутыкненне з астэроідам.
**17.55** Шляхі эвалюцыі.
**18.40** Пастка для дыназаўраў.
**19.30** Цуда-юда дыназаўры.
**20.15** Дынаманія.
**21.00, 0.00, 3.00** Праект. Дыназаўр.
**23.15** Маманцяня.
**1.30** Асушыць акіян.

### DISCOVERY

**8.00** Скарбы з каморкі.
**8.50, 2.20** Экстрэмальныя калекцыянеры.
**9.40** Склады.
**10.30** Зроблена ў Кітаі.
**11.20** Аэрапорт знутры.
**12.10, 3.10** Аляска: сям'я з лесу.
**13.00** Выжыць разам.
**13.50** Акварыумны бізнес.
**14.40, 18.00, 19.40, 5.35, 7.10** Ванная пад ключ.
**15.30, 22.10, 1.30** Хуткія і гучныя.
**16.20, 23.00** Злыя геніі.
**16.45, 23.25** Навука магіі.
**17.10, 23.50** Праз магію да зорак.
**20.30** Залатая ліхаманка.
**0.40** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**4.00** Аляска: апошняя мяжа.
**4.48** Як гэта ўстроена?
**5.12** Як гэта зроблена?

# За свае грошы і мы харошы,

## або Навошта адпраўляць жонку на мора... Лапцевых

**Амаль кожны з нас з самага нараджэння займаецца збіраннем. Пачынаецца гэта яшчэ ў дзяцінстве калекцыянаваннем марак, значкоў, паштовак і іншых цікавінак. Потым дзяўчаты хваляцца перад сяброўкамі бранзалетамі ды пярсцёнкамі, а хлопцы — новенькімі веласіпедамі ці вострымі сцізорыкамі. А пасля юнацтва мы ўваходзім у дарослае жыццё, дзе назапашванне трапляе ў больш фінансавую сферу. Калі гэта робіцца амаль сэнсам жыцця, то ў народзе падобнае калекцыянаванне называецца сквапнасцю. А калі ёсць пэўная мэта, часам і мара, то збіранне грошай на яе здзяйсненне — толькі неабходны сродак. На што ж людзі збіраюць грошы? Пра гэта сёння нашы «Размовы...»**



Калаж Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Куркачу з Кулецкім экстрыму ў Мінску яўна не хапае...

### КІШЭНЯ ДУМКАМІ НЕ ПОЎНІЦЦА?

**У. К.** — Не надта ахвотна гэта прызнаю, аднак большасць чалавечых мар не можа ажыццявіцца без грошай. На кожнае сваё жаданне трэба працаваць і зарабляць. Бо, каб збіраць грошы на нейкую мэту, трэба гэтыя грошы мець. І пажадана з лішкам, хаця б невялікім — іначай што адкладаць? Шкада, але кішэня думкамі не поўніцца.

**С. К.** — Калі ты маеш на ўвазе Ямелю, які сядзіць на печы і марыць аб казачным шчупаку, то я згодны з табою. Але сур'ёзная ідэя таксама каштоўнасць мае. У тым выпадку, калі да яе прыкладаюцца намаганні. Напрыклад, мае дочкі-школьніцы па выніках чвэрці атрымліваюць за добрыя адзнакі грашовыя бонусы з сямейнага бюджэту. За «дзявяткі» і «дзясяткі» ў дзённіку яны атрымліваюць дадатковую прэмію. А калі адзнака меншая за «васьмёрку», школьны «аклад» змяншаецца на тую ж суму.

**У. К.** — Але ж, па-спартанску вы з імі. А проста так кішэнныя грошы не спрабавалі даваць?

**С. К.** — Не заробленыя самастойна грошы не тую вагу маюць. І траціцца яны будуць толькі на чыпсы. А так мае дзеці вучацца адкладваць з дапамогай свайго розуму на больш сур'ёзныя пакупкі. Аднак сёння гэтая сістэма назапашвання іх ужо не задавальняе. Бо школьны «заробак» абмяжоўваецца і даходам сям'і.

**У. К.** — А ў працоўныя летнікі вы іх яшчэ не адпраўлялі? Можна не толькі «розумам» зарабляць, але і трошкі ручкамі. І нават ножкамі. Я, напрыклад, у дзяцінстве здаваў паціху назапашаныя гадамі ў падвале бутэлькі і меў з гэтага стабільны даход...

**С. К.** — Шклатара сёння ў малых не ў пашане. А старэйшая дачка мінулым летам і сапраўды на адной камерцыйнай фірме дапамагала прадаваць ваду. Абзваньвала патэнцыйных пакупнікоў, шукала іх праз сеціва. Такім чынам, па яе словах, яна «выходзіла на шырокі прастор фінансавання». Занадта шырокім ён не быў, але паўтара мільёна за 40 дзён атрымала. Потым цягам паўгоддзя пра кішэнныя грошы нават не намякала. Пры гэтым зрабіла некалькі значных (на яе погляд) пакупак. Напрыклад, споўнілася яе мара аб стыльным скураным заплечніку.

### БЕЗ КРЭДЫТУ НІЯК?

**У. К.** — Гэта добра, што яна разумее цану грашам. Бо я часам як пагляджу на сваіх аднагодак, то ніяк іх зразумець не магу. Відаць, цярпення для збірання грошай не хапае. І мары ў іх парадкам абмялелі — у асноўным смартфоны ды планшэты. Каб папантавацца, яны гатовы ўзяць у крэдыт самае дарагое, замест таго, каб купіць нешта па кішэні. Залазяць у даўгі... Мне здаецца, што такія мэты лепей сабе і не ставіць.

**С. К.** — Наконт крэдытаў я ўвогуле катэгарычны: у даўгі банкам можна залазіць толькі пры ажыццяўленні галоўнай ідэі. Яна ўласнага жылля тычыцца. Аднак сёння і з гэтай марай трэба быць асцярожным, бо крэдыт можа быць непад'ёмным. Ільготнае крэдытаванне стала рэальна даступным толькі для шматдзетных. Для іх цяпер жыллёвы крэдыт пад 1% на 40 гадоў даецца. Таму мара пра ўласнае жыллё павінна ісці поруч з марай пра вялікую сям'ю.

**У. К.** — Альбо патрэбен вельмі высокі заробак, з якім можна будзе назбіраць за 7-10 гадоў без усялякіх крэдытаў. Такі заробак павінен дазваляць адкладваць мільёнаў 15 у месяц. Падобныя зарплаты атрымліваюць адзінкі. Двухпакаёвая кватэра (каля 70 кв. м) толькі ў панэльным выкананні будзе каштаваць прыкладна 1,1 млрд рублёў. Крэдыт на агульных умовах даюць на 15 гадоў пад 40-50% гадавых. І не на ўсю кватэру, а толькі на тры чвэрці кошту. Першапачатковы ўзнос складзе прыкладна 275 млн рублёў. Збіраць гэты ўзнос трэба будзе мінімум два гады (пры ўмове адкладвання 11 млн штомесяц). Калі адразаць ад заробку толькі 5 мільёнаў, то спатрэбіцца 4,5 года.

**С. К.** — Не вельмі радасная карціна атрымліваецца. Падлічы сам: астатнія 825 мільёнаў крэдыту пад 40% гадавых таксама трэба будзе вяртаць. Там толькі працэнтамі больш за 25 млн штомесяц атрымліваецца. Таму такія крэдыты ніхто і не бярэ. Аднак мне здаецца, што ў нас гэта часовыя праблемы.

### ФАНТАЗЁРЫ І РЭАЛІСТЫ

**У. К.** — Так, галоўнае спадзявацца. А ўвогуле нашы мары могуць спраўджвацца зусім нечакана. Бывае, што мы яшчэ толькі падумалі, а нехта гэта ўжо зрабіў. Яшчэ нядаўна з горада пад вадой смяяліся б у твар, а сёння такі марскі квартал збіраюцца будаваць у Японіі. Адным словам, марыць вельмі карысна. Праўда, пра рэалістычнасць жаданняў таксама нядрэнна памятаць.

**С. К.** — Ну-ну. «Нам бы, нам бы ўсім на дно. Там бы, там бы піць віно...» Ты, мабыць, нядаўна перагледаў «Чалавека-амфібію». Нам у Беларусі падводныя палацы не патрэбны. У нас жаданні больш сціплыя, хаця... Гадоў пяць-сем таму я глядзеў у крамах на вялізныя «плазмы» і толькі аблізваўся, бо разумеў, што такі шык мне не па кішэні. За гэты час мой заробак істотна не павялічыўся, аднак ужо магу дазволіць сабе такі тэлевізар, асабліва пры ўмове растэрміноўкі. Проста мара стала больш даступнай па цане. Камп'ютары таксама былі ў рэдкім доме, а цяпер ледзь не на кожнага члена сям'і прыпадае або ПК, або планшэт.

**У. К.** — Нейкія мяшчанскія ў вас мары. А як жа заваяванне космасу? А як жа далёкія краіны? Няўжо вы ўжо дасягнулі таго ўзросту, калі мяккія тапачкі і цёплы халат побач з вялікім тэлевізарам — гэта адзінае, што патрэбна? Скончыўся авантурызм... А наша пакаленне, мне здаецца, павінна марыць пра цікавую і карысную працу, пра тое, каб не сядзець на месцы, варушыцца, імкнуцца, змагацца. Толькі спачатку варта зразумець, чаго ты дакладна хочаш. Няма сэнсу імкнуцца стаць банкірам, калі ты ведаеш, што можаш лепей за ўсіх будаваць дамы. А іначай атрымаецца так, як з адным маім аднакурснікам. Калі яго спыталі, чаму ён пайшоў на журфак, той адказаў: «Толькі тут не трэба было здаваць матэматыку»...

**С. К.** — Ты на мае тапачкі гнеўна не зыркай. Мабыць, забыўся, што менавіта маё пакаленне фінансуе гэтыя самыя мары сваіх дзетак. У нас задача суперглабальная — разгледзець у дзяцей таленты і здольнасці. На мой погляд, не трэба прымушаць усіх абавязкова атрымліваць вышэйшую адукацыю. Шчасце твайго дзіцяці можа быць у зусім іншым. «Залатыя рукі» ў нашай краіне не менш патрэбныя. Галоўнае ўбачыць, што яны ў твайго малога ёсць. Лепей бясплатна вучыцца ў каледжы цікавай для цябе справе, чым платна атрымліваць дыплом нікому не патрэбнага (у першую чаргу самому сабе) спецыяліста.

### У КОЖНАГА СВАЕ «ТАПАЧКІ»

**У. К.** — А мне яшчэ цікава: ці здольны вы, Сяргей Андрэевіч, на непрадуманыя ўчынкі? Вы ўсё тут пра нейкія планы і звышзадачы кажаце — і ніякіх пачуццяў, уражанняў, эмоцый. А сёння, кажуць, менавіта ў іх і варта ўкладваць свае зберажэнні, бо той жа тэлевізар зламаецца праз некалькі гадоў і вы яго выкінеце, а ўражанні застануцца з вамі на ўсё жыццё.

**С. К.** — Ага, кветкі на дзень народзінаў я жонцы заўсёды купляю. Казаць, каб яна мне за гэта гапака вытанцоўвала... Не памятаю. А са сваім сямігадовым сынам мы ў парку адпачынку ўсе атракцыёны аблазілі. З сынам і дачкой на катамаране па Свіслачы каталіся пакуль не абрыдла (тым больш, што каштуе такі праменад па вадзе ўсяго 70 тысяч рублёў за гадзіну). Уражанні і эмоцыі ў дзетак зашкальвалі! А вось жонку ў катамаран не зацягнулі — вельмі моцна ўпіралася.

**У. К.** — Жонка ваша, відаць, хацела на катамаране па моры плаваць, а не па Свіслачы. Узялі б ды паехалі на адпачынак удваіх, маладосць успомнілі...

**С. К.** — На якое мора? Мора Лапцевых хіба што? Ты забыўся: сёлета паступаць трэба старэйшай. Як паступіць — не мора, а цэлы акіян уражанняў будзе. А ты, мабыць, са сваёй «перлінкай» на Канары сабраўся ці так, па-простаму, у Грэцыю якую? Грошы пасля вяселля яшчэ засталіся ў маладога авантурыста?

**У. К.** — Не, разам з вамі на мора Лапцевых паедзем. Даўно я на аленевых запрэжках не катаўся... Насамрэч вы ўгадалі з Грэцыяй — мы даўно марылі наведаць краіну старажытнай цывілізацыі. Грошы збіралі. Аднак малая дачка (каля года) наўрад ці нас адпусціць, а ехаць утраіх страшнавата і нязручна. Пакуль. Таму, хутчэй за ўсё, з'ездзім на Блакітныя азёры на пару дзянькоў у ліпені. На Грэцыю збіраліся каля 2 тысяч долараў выдаткаваць, а беларускі адпачынак значна танней абыдзецца. І сэканомім, і ўражанні не горшыя атрымаем. Але калі раптам мы вырашым ляцець, то грошай будзе не шкада, хоць мы і пра машыну падумвалі — потым назбіраем тое, чаго не хопіць.

**С. К.** — Мне здаецца, што ты таксама не толькі ў аблоках лятаеш — пра ўласныя колы задумаўся. Я гляджу, што і ў цябе свае «тапачкі» ёсць: кругленькія, гумовыя. Не спяшайся ў гэтыя тапачкі залазіць. Зможаце вы яшчэ набыць машыну — у 25 гадоў трэба быць больш лёгкім на пад'ём.

**У. К.** — А ўласнае аўто будзе не перашкаджаць вандроўкам, а толькі дапамагаць. Куды захацеў, туды і паехаў. Прынамсі, уся Беларусь для нас будзе адкрытай.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,**
**Сяргей КУРКАЧ**


РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) по поручению государственного предприятия «ЦЕНТРКУРОРТ»

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ ПО ПРОДАЖЕ:**

**ЛОТ №1** – Автобус VANHOOL 927, номер рамы YF2927SD366M25819 2000 г.в. Начальная цена с НДС – 1 062 379 200 бел. руб. Задаток с НДС – 20 000 000 бел. руб.

**ЛОТ №2** – Автобус SETRA S228, номер рамы WKK13900001030775 1992 г.в. Начальная цена с НДС – 262 070 400 бел. руб. Задаток с НДС – 5 000 000 бел. руб.

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества государственного предприятия «ЦЕНТРКУРОРТ» (Лот №__),* **проводимом 12 июня 2015 г.**

Аукцион состоится **12.06.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 10.06.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.03.2015.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Условия участия, срок заключения договора купли-продажи и условия оплаты содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**Телефоны для справок: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **ОАО «Витязь», г. Витебск, ул. П. Бровки, 13 А.** |

**Лот № 1**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Модуль «Кисловодск - 5» (площадка 4) | Здание неустановленного назначения | 976,6 кв.м | 200/С-72854 | Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 50/5 |

В состав Лота № 1 входит проезжая часть, пл. 1072,3 кв.м, ограждение.

**Начальная цена с НДС 20% – 1 477 200 000 бел.руб.**

**Лот № 2**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Здание производственного участка (площадка 4) | Здание неустановленного назначения | 145 кв.м | 200/С-72853 | Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 50/3 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 635 169 600 бел.руб.**

**Лот № 3**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Здание складских помещений (площадка 4) | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 169 кв.м | 200/С-72855 | Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 50/4 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 870 417 600 бел.руб.**

Лоты 1–3 расположены на неделимом земельном участке пл. 10,1010 га, предоставленном в общую долевую аренду по 25.01.2064 г. При реализации объекта недвижимости покупателю будет определена доля в праве аренды на данный земельный участок. Лоты №№ 2–3 арендуются.

**Лот № 4**

| Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|
| Нежилое помещение (расположено в подвале жилого дома) | 48,5 кв.м | г. Москва, ш. Ленинградское, д. 8, корп. 2. |

**Начальная цена с НДС 20% – 107 280 долларов США**

**Лот № 5**

| Наименование | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|
| Нежилое помещение (расположено в подвале жилого дома) | 102,5 кв.м | г. Москва, пер. Новоподмосковный 2-й, д. 5. |

**Начальная цена с НДС 20 % – 198 000 долларов США.**

**Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона (Лота) в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **10** рабочих дней после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. Оплата за предмет аукциона производится резидентами РБ в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа; нерезидентами РБ в белорусских рублях, либо в иностранной валюте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **30.06.2015 в 14.00 по адресу: г. Витебск, ул. П. Бровки, 13 А (административное здание ОАО «Витязь»), к. 330.** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **26.06.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:**

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 29 июня 2015 г. в 11.00 состоится открытый аукцион по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Рембыттехника» (продавец), в составе:**

| | |
|---|---|
| **Лот № 1 (предмет торгов): капитальное строение с инвентарным номером 710/С-70821, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта (гаражи), общ. пл. 204,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, д. 44** | |
| **Продавец предмета торгов** | **Открытое акционерное общество «Рембыттехника», УНП 700060113 (г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 44, р/с 3012420245017 ЦБУ № 831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйска, код 739)** |
| **Организатор торгов** | **Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» код 153001369, ОКПО 55484006)** |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| **Начальная цена продажи** | 700 000 000 без учета НДС, задаток 10% – 70 000 000 рублей, шаг аукциона – 10% |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа – филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» код 153001369, УНП 102353509** |
| **Информация о земельном участке** | Для обслуживания продаваемого объекта выделен земельный участок пл. 0,0339 га, входящий в состав неделимого земельного участка пл. 0,3662 с кадастровым номером 741000000006000109, который предоставлен в общее долевое постоянное пользование ОАО «Рембыттехника» доля в праве – 4136/10000 и ЧПТУП «Жесть» доля в праве – 5864/10000. Правовой режим – право постоянного пользования |
| **Характеристика предмета торгов** | |
| Лот № 1 – одноэтажное кирпичное здание гаражей, 1999 г. п., фундамент – бетон, перекрытие – ж/б, кровля – рубероид, полы – бетон, отопление, водопровод и канализация отсутствуют, имеется элетроснабжение | |
| **Условия продажи** | 1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%. 2. Объект продается без подключения к существующим на территории коммуникациям, в связи с отсутствием технической возможности подключения |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 3 (Трех) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Сроки и условия оплаты** | Определяются по согласованию Победителя торгов (претендента на покупку) с Продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | по 23 июня 2015 г. включительно до 16.00 |

**Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы:** заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус. (рус.) язык; **представителям юр. лиц и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Порядок проведения торгов: Шаг аукциона определяется в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.** Задаток, внесенный Победителем торгов будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5(пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до даты их проведения.

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30**

## Извещение о проведении 12 июня 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | «Здание гаража» общей площадью 228,6 кв. м, инв. номер 200/С-53207, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 30Г; «кирпичное здание» общей площадью 28,3 кв. м, инв. номер 200/С-87802, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 30Г/1 (составные части и принадлежности: подвал, ограждение, ворота, покрытие, здание). |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,0721 га, кадастровый номер 240100000001000588, целевое назначение – для обслуживания гаражей |
| **Продавец имущества** | ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», г. Минск, ул. Казинца, 121А, к. 327 |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 600 000 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 60 000 000 белорусских рублей |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2,4 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **12 июня 2015 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 01.06.2015 по 10.06.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 12 июня 2015 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (состав и сведения о продаваемом имуществе)** | Двухэтажное кирпичное здание административно-бытового корпуса общей площадью 634,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-457; здание склада хозяйственного с подвалом (одноэтажное кирпичное хозяйственного склада) общей площадью 84,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-311; одноэтажный дом из гипсолита общей площадью 27,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-308; одноэтажное кирпичное здание столярного цеха общей площадью 1983,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-458; одноэтажный железобетонный цех лесопиления общей площадью 915,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-314; навес для сушки пиломатериалов общей площадью 229,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-592; одноэтажный склад – ангар из металлического профиля общей площадью 333,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-309; одноэтажное кирпичное здание гаража общей площадью 205,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-310; двухэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции общей площадью 47,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-638; одноэтажная кирпичная сушильная камера общей площадью 64,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-589; одноэтажное кирпичное здание склада общей площадью 255,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-456; одноэтажное кирпичное здание мебельного цеха общей площадью 367,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-313; навес столярного цеха (инв. № 113018); покрытие асфальтобетонное (инв. № 113013); теплогенератор (инв. № 4013); забор железобетонный (инв. № 113012); ворота (3 шт.); эстакада для хранения леса (инв. № 113015); наружные электросети (инв. № 31358); кран подвесной ПТ 4363 (2 шт.) (инв. №№ 413152, 413153); камера КСО и шинный мост (инв. № 413131); конденсаторная установка ФЕБ (инв. № 413245); аспирационные системы АС-3, АС-5 (инв. №№ 413266, 413268); сети водопроводные чугунные (инв. № 308); сеть канализационная (инв. № 309); пожарный резервуар (2 шт.) (инв. №№113014, 113101); нагреватель Булеран (инв. № 6132171); шкаф СН1-3Р (инв. № 413120); шкафы СИЛ. ШРС (2 шт.) (инв. №№ 413125, 413126). |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Минская область, Воложинский район, Раковский с/с, аг. Раков, ул. 17 сентября, 17 |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер – 622085700062000019, площадь – 1,7569 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений завода |
| **Продавец имущества** | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС)** | 25 025 957 857 рублей |
| **Сумма задатка** | 1 500 000 000 белорусских рублей |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **12 июня 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 01.06.2015 по 10.06.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Кобринский районный исполнительный комитет 6 июля 2015 года в 11.00 в актовом зале райисполкома по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25 проводит аукцион**

## по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса на территории Кобринского района для ведения охотничьего хозяйства

**на срок 10 (десять) лет общей площадью 13 415,0 га, из них:**

**5 286,0 га – лесные угодья;**
**6 860,0 га – полевые угодья;**
**1 269,0 га – водно-болотные угодья, расположенных в следующих границах:**

северная: от канала Ореховский по границе биологического заказника «Званец» до административной границы с Дрогичинским районом;

южная: по государственной границе с Украиной до Теребовичского канала;

восточная: по административной границе Дрогичинского района на юг до государственной границы с Украиной;

западная: по Теребовичскому каналу на север до канала Ореховский, далее на север по каналу Ореховскому до границы биологического заказника «Званец».

Участниками торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий могут быть юридические лица, заинтересованные в получении их в аренду.

**Начальная цена объекта аукциона – 2 634 570 рублей.**

*Участники аукциона вносят задаток в размере 20% начальной цены объекта аукциона, что составляет* **526 914 рублей** *на расчетный (текущий) счет 3641000000011 в филиале № 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 237, получатель платежа – Кобринский райисполком, УНП 200042468. Срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.*

Затраты на организацию и проведение аукциона – расходы на публикацию извещения в СМИ возмещаются участником аукциона, выигравшим торги, в течение **10 дней со дня проведения аукциона.**

Предварительное ознакомление с расположением охотничьих угодий возможно по предварительной записи по телефонам: 8 016 42 2 22 45 и 8 016 42 2 13 41.

Секретарь комиссии по проведению аукциона находится по адресу: **Брестская область, г. Кобрин, ул. Суворова, д. 25, каб. 217. Телефон: 8 016 42 2 22 45.**

Для участия в торгах участникам необходимо предоставить до 30 июня 2015 года в комиссию следующие документы:

1) заявление с указанием сведений об охотничьих угодьях, которые данный участник торгов желает получить в аренду по результатам аукциона;

2) биолого-экономическое обоснование на испрашиваемые в аренду охотничьи угодья, разработанное в соответствии с требованиями законодательства;

3) копию платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;

4) доверенность представителя участника аукциона и копию документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копию документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов.

**Прием комиссией документов заканчивается 29 июня 2015 года в 17.00.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 20 января 2015 г. № 26 «Об утверждении Положения о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса».

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, каб. 217, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 30 июня 2015 года включительно.**

**Контактные телефоны: 2 22 45, 2 13 41, сайт www.brest-region.by.**

# ВЕДЫ ЯК ВЕЧНЫ РУХАВІК

## Што назапасіла навука пра Беларусь?

**Паліца з кнігамі — фактычна ўводзіны ў падзею. На падыходзе да залы, дзе збіраюцца ўдзельнікі VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў, выставу з кнігамі ніяк не абмінеш. Гэта як візітоўка, якая сведчыць: вось яна, асаблівая беларуская культура, і найперш вы гэта зразумееце па яе пісьмовай традыцыі, прадстаўленай у тым ліку і ў кнігах. Яна і ў зборніках літаратуры, і ў навуковых кнігах. Але нават кубачкі для гарбаты ці кавы ў традыцыйных арнаментах адразу скажуць, што імі карыстаецца чалавек, неабыякавы да беларускай культуры, і ў шматлікіх дробязях-сувенірах, па якіх можна пазнаць нашу краіну. Тых, хто сабраўся на кангрэс, праўда, агітаваць не мае сэнсу — самі гэта робяць, жывучы ў самых розных краінах свету. А вывучаюць і даследуюць Беларусь.**

Краіна гэта цэніць: у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прывітаць даследчыкаў-беларусістаў прыйшлі прадстаўнікі дзяржаўных структур, якія найбольш цікавяцца і нават карыстаюцца напрацоўкамі сучаснай навукі, што дае арыенціры для развіцця нацыі і краіны.

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН:**

— Нацыя, якая здраджвае назапашаным за стагоддзі духоўным асновам, становіцца безабароннай да выклікаў часу і чужых ідэй, губляецца ў лабірынце гістарычнага шляху. Менавіта члены Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў праводзяць плённыя навуковыя даследаванні ў галіне моваведства, літаратуразнаўства, культуралогіі, гісторыі і этнаграфіі, сваёй працай дапамагаюць фарміраваць і падтрымліваць пазітыўны імідж Беларусі ў сусветнай супольнасці. Навукова-даследчая праца, якая скіравана на захаванне нацыянальнай адметнасці, будзе не толькі спрыяць духоўнаму і культурнаму развіццю беларускага грамадства ва ўмовах значных выклікаў глабалізацыі, але і садзейнічаць цеснаму супрацоўніцтву з замежнымі навуковымі школамі. Час патрабуе актывізацыі ўзаемадзеянняў вучоных нашай краіны з замежнымі калегамі. Дзеля пашырэння ў інфармацыйнай прасторы еўрапейскіх краін дасягненняў беларускага народа патрэбна падтрымка і плённая навуковая дзейнасць.

Насамрэч, у навуцы немагчыма рухацца наперад у адасобленасці ад свету. Таму прыжылася вось такая практыка — збіраць на кангрэс з 1991 года раз на пяць гадоў тых, хто звязаны з беларускай тэмай у навуцы, абмяркоўваць разам навіны, дасягненні, зрухі, тэндэнцыі. І таму ёсць тлумачэнне: наш народ гістарычна і культурна адчуваў уплывы звонку, рэагаваў на іх, выпрацоўваючы свае падыходы да жыцця, свой асаблівы менталітэт, ствараючы культуру, дзе спляталіся свая традыцыя з сусветнымі тэндэнцыямі. Так і зараз — мы не існуем у адасобленасці ад свету як на грамадскім узроўні, так і на ўзроўні навуковых кантактаў. Таму на пленарным пасяджэнні разам з беларускімі навукоўцамі выступалі замежныя. Напрыклад, Гун-Брыт Колер з Германіі (якая рабіла даследаванне ў супрацоўніцтве з Паўлам Навуменкам з БДУ) пасля свайго даклада пачула шчырыя словы захаплення сваёй беларускай мовай: нават без акцэнту!

Пра мову (што зразумела) гаварыць у гэтыя дні будуць шмат. І не толькі навукоўцы, але і прадстаўнікі тых галін, дзе беларуская мова запатрабавана традыцыйна.

**Васіль ЧЭРНІК, намеснік міністра культуры Беларусі:**

— Сёлета на кангрэсе прадстаўлены даследаванні ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук, культурна-гістарычнай спадчыны і сучаснага развіцця беларускага народа, якія паспрыяюць пашырэнню і папулярызацыі ведаў пра Беларусь, развіццю ўзаемадзеяння беларусазнаўцаў з розных краін свету, пасадзейнічаюць умацаванню супрацоўніцтва Беларусі з іншымі краінамі ў навуковай і культурна-асветніцкай галіне. Адна з галоўных тэм VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў — 500-годдзе беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. «Круглы стол» «Францыск Скарына і яго час», які праводзіцца падчас кангрэса, закране праблематыку вывучэння беларускага кнігадрукавання ў XVI-XVII стагоддзях з з'явіцца важкім унёскам у праграму мерапрыемстваў да гэтай знакавай юбілейнай даты. Упэўнены, што найноўшыя навуковыя публікацыі ўдзельнікаў кангрэса па гісторыі айчыннай культуры, мовы і літаратуры будуць спрыяць больш шырокаму распаўсюджванню нашай роднай мовы і беларускай прысутнасці ў свеце.

Гэтую ж тэму працягнуў і дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Сяргей Важнік, які звярнуўся з прывітальным словам ад імя міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаіла Жураўкова: «Постаць Францыска Скарыны цікавая тым, што да сённяшняга часу беларускі першадрукар з'яўляецца праваднікам беларускай нацыянальнай ідэі ў свет еўрапейскай навукі і еўрапейскай культуры. Знамянальна, што асобны тэматычны блок будзе прысвечаны праблемам выкладання беларускай мовы як замежнай. І гэта невыпадкова: у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь ёсць вопыт выкладання беларускай мовы замежным студэнтам. Так, напрыклад, на кафедры сучаснай беларускай мовы БДУ створаны сапраўдныя школы беларускай мовы як замежнай. Больш за тое, некалі быў добры вопыт правядзення ў нашай краіне міжнародных летніх школ беларускай мовы і беларускай культуры. На жаль, такія школы былі нерэгулярнымі. Прапануем аднавіць гэтую добрую традыцыю, з улікам той цікавасці, якая ёсць у свеце да беларускай мовы і беларускай культуры. Як некалі заўважыў Хайдэгер: «Мова — гэта дом быцця». Беларуская мова — гэта дом быцця беларусаў, што нельга не ўлічваць пры будаўніцтве нацыянальнай сістэмы адукацыі. І мне вельмі хацелася б, каб у нашым доме ўсе мы знайшлі агульную мову».

Між іншым, сведчанне таму, што беларуская культура і мова выклікаюць цікавасць замежнікаў, яшчэ і ў выданні размоўнікаў. Напрыклад, Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны ўжо выдала англа-беларускі і шведска-беларускі размоўнікі, працуе над стварэннем французска-беларускага, а таксама збіраецца зрабіць фінска-беларускі. Улічваючы асаблівыя адносіны Беларусі з Кітаем, выказваюцца думкі пра тое, што было б добра зрабіць і кітайска-беларускі размоўнік. Старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў распавёў: "У мінулым годзе пад кіраўніцтвам нашай арганізацыі выйшлі тэсты па шасці ўзроўнях для ацэнкі ведаў беларускай мовы як замежнай. Нас вельмі цешыць той факт, што ў рамках кангрэса адбудзецца абмеркаванне гэтай працы. Мы вельмі рады, што навукоўцаў цікавіць беларуская мова, карэнне якой сягае ў другое тысячагоддзе да нашай эры. Невыпадкова яна захавала некаторыя прыкметы старажытнага санскрыту, найперш слова «веды». Пакуль ёсць каму збіраць веды пра Беларусь, яе культуру і мову, яна застанецца на карце Еўропы і свету як незалежная дзяржава».

Акрамя гісторыі і моваведства, цікавасць замежных даследчыкаў выклікае і беларуская літаратура, у тым ліку сучасная. І можа быць, нам адкрыюць тое каштоўнае, што мы маем цяпер, чым можам ганарыцца. Веды — рухавік развіцця як на персанальным узроўні (чым больш ведаеш, тым больш разумееш, умееш, дасягаеш), так і на ўзроўні самога грамадства. І як жа неабходна дзеля таго, каб разумець, куды рухаешся і дзеля чаго, лепш разумець сябе. Так і з народам.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# НАРОДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ ДА КАРЫНТЫІ ДАВЯДЗЕ

**Творчыя калектывы і выканаўцы — прадстаўнікі розных дыяспар нашай краіны — з поспехам далі канцэрты ў паўднёвай правінцыі Аўстрыі Карынтыі і Славеніі, прысвечаныя 70-годдзю Вялікай Перамогі.**



**На фота (злева направа): старшыня Рускага культурнага таварыства Carinthia (г. Філах, Аўстрыя) Эла ХРАШАН; прадстаўнік апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр САСНОВІЧ; саветнік Пасольства Беларусі ў Вене Яраслаў ХМЫЛЬ; прадстаўнік магістрата г. Філах (Аўстрыя) Андрэас ЗУХЕР.**

З 14 па 19 мая 2015 года па ініцыятыве апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, пры садзейнічанні Пасольства Рэспублікі Беларусь у Аўстрыйскай Рэспубліцы і Рускага культурнага таварыства Carinthia (г. Філах, Аўстрыя) адбыўся візіт беларускай дэлегацыі. У яе складзе — члены кансультатыўнага міжэтнічнага савета пры Упаўнаважаным — кіраўнікі і творчыя калектывы армянскага, азербайджанскага, грузінскага, карэйскага, яўрэйскага, польскага, татара-башкірскага, чувашскага, туркменскага, рускага і ўкраінскага нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў рэспублікі.

Аўстрыя — сёмая па ліку краіна, якую наведалі беларускія «народныя дыпламаты». Дагэтуль адпаведныя форумы суайчыннікаў нацыянальна-культурных аб'яднанняў нашай краіны і замежжа з поспехам прайшлі ў Польшчы, Літве, Украіне, Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі. Па словах **каардынатара праекта Аляксандра САСНОВІЧА**, мэта падобных паездак — паказаць Беларусь у свеце як шматнацыянальную, многаканфесійную і мультыкультурную дзяржаву. Той факт, што ў нас цяпер пражывае больш за 140 прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў — унікальны. Да таго ж трэба дадаць, што гісторыя і сучаснасць Беларусі не ведалі канфліктаў на этнічнай і рэлігійнай глебе.

«У нас замацаваны ўсе правы нацыянальных меншасцяў: на мову, культуру ды іншае. На думку незалежных міжнародных экспертаў, айчыннае заканадаўства ў гэтай галіне не саступае міжнароднаму», — адзначыў Аляксандр Сасновіч на афіцыйнай сустрэчы ў магістрацe аўстрыйскага горада Філах.

У складзе беларускай дэлегацыі — шырокі зрэз беларускага грамадства. Тут ёсць студэнты, пенсіянеры, выкладчыкі, прадпрымальнікі, медыцынскія работнікі і г.д. Фармат мерапрыемстваў складаўся з дзвюх частак. Па-першае, кіраўнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў нашай краіны мелі магчымасць падзяліцца вопытам сваёй работы з замежнымі калегамі. Яны расказалі пра канструктыўную нацыянальную палітыку беларускай дзяржавы ў дачыненні да дыяспар, прывялі прыклады супрацоўніцтва суполак з органамі дзяржкіравання рэспублікі. Па-другое, беларуская нацыянальна-культурныя аб'яднанні непасрэдна прэзентавалі замежным суайчыннікам свае творчыя калектывы (прычым усе яны не з'яўляюцца прафесійнымі). Сіламі дыяспар былі падрыхтаваны дзве канцэртныя праграмы, прысвечаныя 70-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа над фашызмам. Сёлета іх убачылі гледачы ў гарадах Філах (Аўстрыя) і Любляна (Славенія). Пацюль беларускіх артыстаў прымалі бурнымі апладысментамі.

Чарговы форум прадстаўнікоў нацыянальна-культурных аб'яднанняў Беларусі прайшоў пры садзейнічанні апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Беларусі і Рускага культурнага таварыства Carinthia (Аўстрыя). Прадстаўнік апарату Упаўнаважанага Аляксандр Сасновіч перадаў таварыству нацыянальныя касцюмы і бібліятэчку беларускіх кніг.

На думку **кіраўніка арганізацыі Элы ХРАШАН**, такія паездкі вельмі важныя і запамінаюцца нашым суайчыннікам за мяжой: «Праз гэтыя сустрэчы і канцэрты людзі больш даведваюцца пра Беларусь як пра шматнацыянальную краіну».

Трэба нагадаць, што Рускае культурнае таварыства Carinthia было заснавана нашай суайчынніцай у 2008 годзе. Сёння ў ім актыўна працуюць каля шасцідзесяці чалавек, а на агульныя святкаванні збіраецца каля трохсот членаў арганізацыі. Усе яны — беларусы, рускія, украінцы, казахі, чачэнцы — ураджэнцы былога СССР.

Эла жыве ў Аўстрыі з 2002 года, мае трох сыноў і пасплахова працуе ў турбізнесе. Муж — аўстрыец. На пытанне «Навошта вам грамадская праца ў «Карынтыі»?» адказвае: «Я так выхавана, не магу аддзяліць сябе ад Беларусі, Расіі і Украіны. Трэба ведаць свае карані. Аўстрыйскую культуру я разумею, прымаю, паважаю, але ў мяне ёсць і свая, беларуская. Гэта нармальная з'ява, так павінна быць. І яшчэ для мяне вельмі важна, каб людзі жылі не паасобку, а разам. Гэта і ёсць асноўная мэта — аб'ядноўваць людзей, няглездзячы на палітычныя падзеі».

Паводле яе слоў, людзі, якія прыехалі ў Аўстрыю ў розныя часы і па розных прычынах, з радасцю сустрэлі навіну аб стварэнні нашай грамадскай арганізацыі. У іх з'явілася магчымасць размаўляць на роднай мове, далучаць дзяцей да культурнай спадчыны продкаў. У «Карынтыі» таксама дапамагаюць тым людзям, хто ўпершыню прыязджае ў Аўстрыю: па ўсіх пытаннях, з якімі сутыкаецца чалавек у чужой краіне.

«Мы не па чутках ведаем, як складана адаптавацца на новым месцы, без падтрымкі, сяброў, знаёмых ці бацькоў», — гаворыць Эла.

Намаганнямі гэтай маладой жанчыны і актывістак таварыства створана руская нядзельная школа для дзяцей у Філаху і Клагенфурце. Тут вучаць чытаць і пісаць па-руску, робяць пастаноўкі паводле народных казак. Да таго ж у Філаху створана група па навучанні дзяцей народным рамёствам, маляванню, мастацкай творчасці.

У найбліжэйшых планах кіраўніка арганізацыі — садзейнічаць таму, каб Філах стаў пабрацімам аднаго з беларускіх гарадоў. Дарэчы, ініцыятывы Элы Храшан заўсёды падтрымліваюць у Пасольстве Беларусі ў Вене. Паводле інфармацыі саветніка беларускага дыппрадстаўніцтва Яраслава Хмыля, у Аўстрыі пражывае каля 400 беларусаў — тых, хто стаў на консульскі ўлік. Па неафіцыйных звестках, іх каля 1,5-2 тысяч.

«Прыезд нашай дэлегацыі яшчэ раз дэманструе, наколькі Беларусь адкрытая свету. Гэта сапраўдная «народная дыпламатыя», — падкрэсліў Яраслаў Хмыль.

**Наталля КАРОТКАЯ.**
**Фота аўтара.**

**Армянскі фальклорны танцавальны ансамбль «Эрэбуні».**



алімпіец
ЗВЯЗДА
Выпуск № 4 (32)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



■ ЧС па хакеі-2015: пастскрыптум

# ЯК БОБ І БОБЕК ПЕРАШКОДЗІЛІ ЗАЙЧЫКУ-ХАКЕІСТУ

**Колькі людзей наведала турнір, хто з'яўляецца самым вопытным хакеістам першынства і колькі літраў вады спатрэбілася хакеістам падчас спаборніцтваў? «Звязда» сабрала разам самыя цікавыя факты і склала невялічкі даведнік па чэмпіянаце свету па хакеі, які прайшоў у Чэхіі.**



**1. Сёлетняе першынство свету стала 79-м па ліку.** Першы (і апошні) раз турнір у 1920 годзе прымала Бельгія. Ён праходзіў у межах Алімпійскіх гульняў у Антверпене і быў афіцыйна прызнаны сусветным першынством толькі ў 1982 годзе. Матч цягнуўся тады толькі 40 хвілін, сустрэчы судзілі трэнеры і гульцы не задзейнічаных у паядынку зборных, а каманды Германіі і Аўстрыі наогул не допусцілі да турніру з-за ролі агрэсараў у Першай сусветнай вайне. Што датычыцца Чэхіі (у мінулым Чэхаславакіі), яна прымала найбуйнейшы хакейны форум дзясяты раз. А ўпершыню суайчыннікі Гашака арганізавалі чэмпіянат у 1933 годзе. Дзеля гэтага ў Празе пабудавалі першы стадыён са штучным лёдам.

**2. За права прымаць чэмпіянат Чэхія спаборнічала з Украінай.** Перамога чэхаў у галасаванні была значнай — 84 галасы супраць 22-х.

**3. Хакейныя паядынкі праходзілі ў Празе і ў Астраве.** Менавіта ў Астраве на «CEZ Арена» ўсе матчы груповай стадыі праводзіла наша зборная. На гэтым лядовым стадыёне выступае каманда «Віткавіцэ», сапернік гродзенскага «Нёмана» па будучай Лізе чэмпіёнаў. Матч паміж беларускай і чэшскай камандамі адбудзецца ў Астраве 3 верасня.

**4. Сёлетні чэмпіянат свету пабіў рэкорд наведвальнасці.** На ўсіх матчах першынства прысутнічала звыш 741 тысячы гледачоў. Фінал паміж Канадай і Расіяй наведалі 17 383 заўзятары. Такім чынам, турнір у Чэхіі пераўзышоў па гэтым паказчыку чэмпіянат свету ў Мінску, — год таму матчы ў нашай сталіцы наведалі 640 тысяч чалавек.

**5. Калі талісманам мінскага першынства быў зубр Волат, у Чэхіі хадзячымі сімваламі выбралі трусоў Боба і Бобека,** вядомых герояў тамтэйшага мультфільма, які з'явіўся на экранах у 1979 годзе. Цацачныя варыянты талісманаў сталі настольскі папулярнымі сярод балельшчыкаў, што зніклі з прылаўкаў крам у Астраве яшчэ задоўга да завяршэння чэмпіянату. Дарэчы, Боб і Бобек перашкодзілі зайчыку-хакеісту стаць талісманам наступнага першынства, якое пройдзе ў Расіі. Аляксей Марозаў, былы хакеіст, кіраўнік экспертнага журы конкурсу, сказаў, што гэта няправільна, калі залік два гады запар будуць талісманамі чэмпіянатаў. У выніку выбралі Лайку.

**6. Дырэктар спарткамітэта спаборніцтваў Ян Чэрны яшчэ да пачатку спаборніцтваў прагназаваў, што зборным спатрэбіцца 1200 кілаграмаў пральнага парашку,** 70 тысяч літраў вады, 2300 ручнікоў, 2500 шайбаў для трэніровак і 3000 для матчаў.

**7. Чэхія — край піўны. І падчас хакейнага першынства гэта яшчэ раз пацвердзілася. Падчас спаборніцтваў заўзятары выпілі 280 тысяч літраў пеннага напою.** Пра гэта паведаміў Павел Барвік з піваварні «Стапрамэн», якая забяспечвала арэны півам. Кажуць, абсалютны рэкорд устанавілі на матчы Швецыя—Швейцарыя: падчас гэтай сустрэчы балельшчыкі выпілі 16 тысяч куфляў!

**8. Канада 25-ы раз стала чэмпіёнам свету.** Больш залатых медалёў толькі ў скарбонцы зборнай Расіі (з улікам зборнай СССР) — 27.

**9. У Чэхіі былі закінуты 354 шайбы.** У Мінску, для параўнання, 352, а ў Стакгольме і Хельсінкі, якія прымалі чэмпіянат у пазамінулым годзе, хакеісты пацэлілі ў вароты 332 разы. Самымі багатымі на шайбы матчамі аказаліся сустрэчы Чэхія — Швецыя (5:6) і Канада — Германія (10:0).

**10. Самым вопытным удзельнікам першынства стаў 43-гадовы легендарны чэшскі хакеіст Ярамір Ягр,** маладым — 18-гадовы амерыканец Джэк Эйчэл. А вось самым высокім на першынстве аказаўся беларус Алег Евенка. Яго рост — 201 см. Ён на 30 сантыметраў вышэйшы за немца Яніка Сэйндэнберга, самага мініяцюрнага гульца першынства.

**11. Ніводзін хакеіст зборнай Расіі, якая заняла другое месца, не трапіў у сімвалічную зборную чэмпіянату.** У ёй апынуліся: варатар Конар Хэлебайк (ЗША), абаронцы Брэнт Бёрнс (Канада), Олівер Экман-Ларсан (Швецыя), нападаючыя Ярамір Ягр (Чэхія), Джэйсан Спеца і Тэйлар Хол (абодва — Канада).

**12. Гэты чэмпіянат свету стаў 16-м для зборнай Беларусі ў вышэйшым дывізіёне.** Наш найлепшы вынік — 6-е месца ў 2006-м годзе. У сімвалічную зборную таго першынства трапіў варатар Андрэй Мезін, які сёння таксама ў зборнай. Але ў іншым амплуа — у ролі трэнера.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Наша будучыня

# Зноў у фаварытах

**Хакейная школа «Юнацтва» ў чарговы раз стала найлепшай у краіне. У гэтым сезоне адразу чатыры каманды славутай СДЮШАР сталі чэмпіёнамі Беларусі.**

На афіцыйным закрыцці сезона на лёдзе крытага катка ў парку Горкага сабраліся ледзь не ўсе маладыя выхаванцы школы. Апранутыя ў гульнявую форму, засяроджаныя, яны перашэптваліся, чакалі, калі атрымаюць заслужаныя ўзнагароды.

— Мы па праве ганарымся тым, што занялі першае месца ў агульнакамандным заліку, — сказаў пасля завяршэння цырымоніі **Андрэй КАРНАВУХАЎ, дырэктар СДЮШАР «Юнацтва».** — Ад сезона засталіся толькі прыемныя ўражанні. Наша школа — адна з найлепшых у краіне, нашы выхаванцы выступаюць за нацыянальную, маладзёжную і юніёрскую зборныя Беларусі.

Пакуль юных хакеістаў чакаюць канікулы, але ўжо з ліпеня распачнуцца зборы. Хлопцы будуць займацца ў загарадных лагерах, у парку Горкага.

Хакейная школа актыўна «сілкуе» і дарослую каманду майстроў, якая выступае ў беларускай Экстралізе. Сёлета падапечныя Міхаіла Захарава ў чэмпіянаце краіны занялі другое месца.

— Навошта нам маладых запрашаць з-за мяжы, калі ў нас ёсць свая школа, — кажа **Аляксей ТОРБІН, спартыўны дырэктар хакейнага клуба «Юнацтва».** — Больш за тое, нашы хлопцы гуляюць і ў іншых клубах. Калі мы не гарантуем ім месца ў складзе, прапануем іх кандыдатуры іншым камандам, каб гулялі, не губляліся, а развівалі сваё майстэрства. На працягу сезона мы прымалі ў асноўны склад больш маладых хакеістаў. Гэтую тэндэнцыю збіраемся працягваць надалей.

***— А хто з ліку ўчарашніх юніёраў ужо паспеў праявіць сябе ў «Юнацтве»?***

— Раман Дзюкаў, аўтар шайбы «Шахцёру» ў фінальнай серыі, Крысціян Хенкель, якога прызналі найлепшым маладым хакеістам Экстралігі. Як бачна, падобныя прыклады ў нас ёсць.

***У сістэму хакейнага клуба «Юнацтва» ўваходзяць тры каманды: адна выступае ў беларускай Экстралізе, другая — ў Вышэйшай лізе чэмпіянату краіны, а яшчэ адна выступае ў міжнароднай Маладзёжнай хакейнай лізе.***

**Тарас ШЧЫРЫ, фота аўтара**



■ Дайджэст

# ЗГУЛЯЕМ АЛІМПІЙСКУЮ ПАРТЫЮ, ТАЙГЕР?

## Гольф вяртаецца ў праграму Гульняў, а бразільскія рабочыя распачалі забастоўку

**Белае.** За алімпійскія медалі гальфісты змагаліся толькі двойчы — у 1900 і 1904 гадах. Апошнім алімпійскім чэмпіёнам у адзіночным разрадзе з'яўляецца канадзец Джордж Лаян, які памёр 77 гадоў таму! Дарэчы, на Гульнях-2016 у Рыа паабяцаў выступіць легендарны гальфіст Тайгер Вудс. Праўда, амерыканскі спартсмен цяпер перажывае не лепшы час: упершыню з 1996 г. ён выпаў з першай сотні сусветнага рэйтынгу і нават вырашыў узяць паўзу у кар'еры, каб наладзіць гульню. Зрэшты, гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

Між іншым, гольф ужо быў апрабаваны ў алімпійскай праграме. Гаворка ідзе пра другія летнія юнацкія Гульні, якія праходзілі летась у кітайскім Нанкіне. Так, алімпійскім чэмпіёнам у хлопцаў стаў італьянец Рэната Парато рэ, а ў дзяўчат перамогу атрымала карэянка Саюн Лі. Яшчэ падчас нанкінскіх Гульняў кіраўнік Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах станоўча ацаніў дэбют гольфа ў алімпійскай праграме. Рэпетыцыя прайшла ўдала, так што правядзенню алімпійскага турніру ў Рыа нішто не пагражае. А пакуль краіна-гаспадыня Алімпіяды-2016 актыўна падаграе інтарэс да гэтай падзеі. Цэнтральны банк Бразіліі, напрыклад, выпусціў партыю памятных манет з выявай відаў спорту, якія будуць прадстаўлены на Гульнях. Гольф адлюстраваны на манеце наміналам 1 бразільскі рэал разам з іншымі відамі спорту, такімі як лёгкая атлетыка і плаванне. Абсалютная большасць гэтых манет ужо ўвайшла ў абарачэнне.



**Чорнае.** У гэты ж час тэрміновая здача алімпійскіх спартыўных аб'ектаў знаходзіцца пад пагрозай. Тысячы бразільскіх рабочых, занятых на будаўніцтве, абвясцілі забастоўку. Яны патрабуюць павышэння зарплаты на 8,5%. Па рашэнні суда ў чаканні вырашэння спрэчкі хаця б 30% рабочых павінны працягваць працу. Аднак, па вялікім рахунку, усе алімпійскія будоўлі спыніліся з-за забастоўкі (пратэстуюць каля 70% з 12 тысяч працоўных). У першую чаргу гэта датычыцца будаўніцтва алімпійскага парку, алімпійскага стадыёна і метро.

У найбліжэйшы час кіраўнікі і работнікі павінны зноў сустрэцца ў судзе і паспрабаваць прыйсці да пагаднення. Чакаецца, што забастоўка працягнецца тыдзень. Будаўнікі збіраюцца дачакацца камісіі МАК, якая планавала наведаць алімпійскія аб'екты ў пачатку чэрвеня.

***

Раней пачаўся продаж квіткоў на Алімпіяду-2016. Самы танны абыдзецца спартыўным заўзятарам у 14 еўра. Гэта кошт квіткоў на адборачныя турніры такога віду спорту, як хакей на траве. Зніжкі для льготных груп грамадзян не прадугледжаны.



Даражэй за ўсё будзе наведаць фінал бегу на 100 метраў. Паглядзець на Усейна Болта і кампанію можна будзе за 420 еўра — гэта найлепшыя месцы. У Лондане, дарэчы, цэннік аналагічных квіткоў перавышаў 900 еўра.

Найлепшыя месцы на цырымоніі адкрыцця каштуюць 1600 еўра, на цырымоніі закрыцця — 1050 еўра, а на фіналах тэніснага турніру — 245 еўра.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■ Футбол

# У чаканні «Чырвонай фурыі»

**Зборная Беларусі рыхтуецца да першых матчаў кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы-2016. Але спачатку падапечныя Аляксандра Хацкевіча правядуць таварыскую сустрэчу са зборнай Расіі. Дарэчы, галоўны трэнер нацыянальнай каманды ўжо вызначыўся з колам кандыдатаў на ўдзел у чэрвеньскіх матчах.**

Да гэтых гульняў будуць рыхтавацца 26 футбалістаў:

**Варатары** — Андрэй Гарбуноў («Атраміта с», Афіны, Грэцыя), Юрый Жаўноў («Тарпеда», Масква, Расія), Сяргей Чэрнік (БАТЭ, Барысаў), Аляксандр Гутар («Дынама-Мінск»);

**Абаронцы** — Максім Жаўнерчык, Дзяніс Палякоў, Максім Валадзько (БАТЭ, Барысаў), Ігар Шытаў («Мардовія», Саранск, Расія), Аляксандр Мартыновіч («Краснадар», Расія), Сяргей Паліцэвіч («Дынама-Мінск»), Ягор Філіпенка («Малага», Іспанія), Дзмітрый Верхаўцоў («Уфа», Расія), Максім Бардачоў («Растоў», Расія);

**Паўабаронцы** — Іван Маеўскі («Завіша», Быдгашч, Польшча), Сяргей Кісляк («Рубін», Казань, Расія), Сяргей Крывец («Мец», Францыя), Антон Пуціла («Тарпеда», Масква, Расія), Аляксандр Глеб («Генчлербірлігі», Анкара, Турцыя), Станіслаў Драгун («Крылы Саветаў», Самара, Расія), Цімафей Калачоў («Растоў», Расія), Міхаіл Гардзяйчук, Ігар Стасевіч (БАТЭ, Барысаў), Павел Няхайчык («Том», Томск, Расія), Сяргей Балановіч («Амкар», Перм, Расія);

**Нападаючыя** — Сяргей Карніленка («Крылы Саветаў», Самара, Расія), Мікалай Сігневіч (БАТЭ, Барысаў).

Трэніровачны збор беларускай каманды пачнецца 3 чэрвеня ў Мінску. Адзначу, што прадстаўнікі камандаў з чэмпіянату Беларусі далучацца да легіянераў 6 чэрвеня. На таварыскі матч у Маскву, які адбудзецца 7 чэрвеня, адправяцца 18 гульцоў, сярод якіх у асноўным будуць футбалісты з замежных клубаў. Пасля вяртання зборная працягне трэніроўкі на комплексе футбольных палёў АБФФ. Матч кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы з Іспаніяй адбудзецца 14 чэрвеня на «Барысаў-Арэне».

Пасля 5 тураў становішча камандаў у кваліфікацыйнай групе С такое: Славакія — 15 ачкоў (розніца мячоў — 11-2), Іспанія — 12 (14-3), Украіна — 9 (6-2), Беларусь — 4 (4-10) , Македонія — 3 (5-12), Люксембург — 1 (3-14).

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

# АДМОЎНАЯ ЎНІКАЛЬНАСЦЬ

## Што вымушае літоўскіх пенсіянераў выходзіць на акцыі пратэсту

**Пенсіянеры Літвы адчуваюць сябе пакрыўджанымі. Крыўда даўняя, яшчэ з 2010 года, калі ўрад Літвы пад кіраўніцтвам тагачаснага прэм'ер-міністра Андруса Кубілюса сваімі рашэннямі моцна ўдарыў па кішэні пенсіянераў. Тады за кошт пажылых людзей было вырашана выходзіць з крызіснай сітуацыі ў эканоміцы краіны. З мэтамі паніжэння дэфіцыту Фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання («СОДРА») урад, нягледзячы на тое, што ў Літве і так былі самыя маленькія пенсіі ў Балтыйскім рэгіёне, у 2010 годзе да 10% знізіў пенсіі па старасці і інваліднасці.**




На мітынгу пратэсту прадстаўнікі Партыі пенсіянераў Літвы.

Яшчэ больш пацярпелі працуючыя пенсіянеры. Ім была рэзка абмежавана выплата пенсій. Улады разважалі так: калі ты атрымліваеш заработную плату і пенсію, то можаш пражыць і за адну зарплату. Пенсію ўрэзалі прапарцыянальна зарплаце. Чым большы заробак, тым больш скарачалі пенсію (яе маглі паменшыць на 50 і больш працэнтаў).

Выйсце з эканамічнага крызісу ёсць рознае. Але толькі ўрад Літвы прыдумаў гэты цяжар перакласці на пенсіянераў. У той час дрэнныя эканамічныя паказчыкі былі і ў суседніх Латвіі, Эстоніі, іншых краін Еўрапейскага саюза. Але толькі Літва асмелілася ўлезці ў кішэнь найменш сацыяльна абароненых грамадзян. Вестка пра тое, што яна ў гэтых адносінах не толькі першая ў Еўрасаюзе, але і адзіная, яе жыхароў не радавала. Наадварот.

Гэтае ўзаконенае самаўпраўства сустрэла рэзкае супраціўленне грамадскасці. Людзі не раз выходзілі на мітынгі перад парламентам, пратэстуючы супраць паніжэння пенсій і эканамічнай палітыкі ўрада, якая прывяла некаторых людзей да мяжы галечы. Пенсіянераў падтрымалі прафсаюзы і нядаўна створаная Партыя пенсіянераў Літвы.

«Стварэнню нашай партыі спрыяла беднасць людзей пенсійнага ўзросту, іх бядотнае сацыяльнае становішча, нездавальняючая дзейнасць урада і Сейма», — гаворыць старшыня Партыі пенсіянераў Літвы Вітаўтас Каджыс.

Такія рашэнні ўрада былі абскарджаны ў Канстытуцыйным судзе. Суд пастанавіў, што ўлады парушылі Канстытуцыю Літвы і павінны кампенсаваць пенсіянерам скарочаныя пенсіі. Урад пайшоў на ўступкі. Пачынаючы з 2012 года пенсіі былі аднаўлены, яны вярнуліся на дакрызісны ўзровень. Было абвешчана, што двухгадовае скарачэнне пенсій урад плануе кампенсаваць тады, калі бюджэт «СОДРА» будзе збалансаваны, аднак у якім годзе гэта адбудзецца, не ўказвалася.

Грошы на кампенсацыю пенсій трэба было знайсці не малыя: 1,2 млрд літаў. Дзе іх узяць? Урад Літвы пачаў віляць, адцягваць выплаты. Пачалі прыдумляць новыя падаткі. Урад выказаў ідэю ўвесці падатак на аўтамабілі, а сабраныя грошы выкарыстаць для кампенсацыі пенсій. Гэтую ідэю сустрэлі ў штыкі.

«Урад, кажучы, што ўвядзенне падатку на аўтамабіль патрэбна для кампенсацыі пенсій, уносіць разлад паміж пенсіянерамі і астатняй часткай грамадства, паколькі тыя, хто будзе плаціць гэты падатак, у першую чаргу будуць лаяць менавіта пенсіянераў», — гаварыла старшыня Літоўскай асацыяцыі пажылых людзей Грасілда Макаравічэне. Рэспубліканская газета «Лietувос айдас» падкрэслівала: аўтамабілі ёсць у большасці пенсіянераў, таму калі ўвядуць гэты падатак, высветліцца, што пенсіянеры самі заплацяць за кампенсацыю сваіх пенсій, аргументы кіруючых органаў наконт увядзення падатку на аўтамабіль няслушныя і абражаюць саміх жа пенсіянераў. Палітолагі гаварылі, што плануемы падатак — наступства прагнасці і карысталюбства ўлады, калі на павышэнне заробкаў сабе грошы знайшліся, а на кампенсацыі пенсій — не.

> **На другі дзень пачалося тое, чаго ніхто не чакаў. Ужо раніцай у вільнюскіх паштовых аддзяленнях сабралася мноства пенсіянераў. Яны спяшаліся на пошту, каб забраць паведамленні аб кампенсацыі пенсій.**

«Нашы галоўныя патрабаванні — каб хутчэй вярнулі нам пенсіі, каб пенсіі былі індэксаваны для ўсіх, паколькі за 6 гадоў ніхто не спрабаваў іх павышаць, толькі паніжалі, а праз інфляцыю пакупніцкая здольнасць пенсіянераў знізілася амаль на 20%. Улады не спяшаюцца гэта рабіць, хоць у суседніх краінах такія крокі робяцца. З пенсіянераў цынічна здзекуюцца. Улады знайшлі грошы для павелічэння заробкаў для дзяржаўных служачых, а для пенсіянераў — адна крыха», — гаварыў на мітынгу пратэсту ля будынка Урада старшыня Партыі пенсіянераў Літвы Вітаўтас Каджыс.

Праект закона аб падатку на аўтамабілі для кампенсацыі пенсій праваліўся. У канцы мінулага года ўрад абвясціў, што пенсіі будуць кампенсавацца паступова, праз некалькі гадоў, і пенсіянеры паведамленні аб кампенсацыі атрымаюць па пошце.

На другі дзень пачалося тое, чаго ніхто не чакаў. Ужо раніцай у вільнюскіх паштовых аддзяленнях сабралася мноства пенсіянераў. Яны спяшаліся на пошту, каб забраць паведамленні аб кампенсацыі пенсій. Многія думалі, што адразу атрымаюць і частку абяцаных грошай. Ля некаторых паштовых аддзяленняў узніклі доўгія чэргі, таўханіна, выказванне незадавальнення. Людзі не хацелі чакаць, пакуль паведамленні прынясе ім на дом паштальён. Вельмі ўжо ім не цярпелася атрымаць доўгачаканую вестку...

Мала радасці і ў людзей, якія набліжаюцца да пенсійнага ўзросту. Яны жывуць з адчуваннем, што «даганяюць» пенсію, якая з кожным годам усё больш адсоўваецца. Гэта здарылася пасля таго, як былы ўрад кансерватараў пад кіраўніцтвам прэм'ера Андруса Кубілюса не толькі ўрэзаў пенсіі, але і вырашыў павялічыць пенсійны ўзрост жанчын і мужчын да 65 гадоў. Супраць гэтага закона выступалі многія. 85% літоўцаў не ўхваляюць павышэнне пенсійнага ўзросту, такія былі вынікі рэпрэзентатыўнага апытання, праведзенага па ініцыятыве навукоўцаў Каўнаскага тэхналагічнага ўніверсітэта. Улічваючы негатыўнае стаўленне большасці насельніцтва і жадаючы пазбегнуць масавых пратэстаў, урад гэты закон стаў уводзіць паступова. З 1 студзеня 2012 года пенсійны ўзрост пачалі павышаць для жанчын на 4 месяцы, а для мужчын — на два месяцы штогод з тым, каб да 2026 года і мужчыны, і жанчыны выходзілі на пенсію ўжо ў 65 гадоў. З пачатку 2015 года мужчыны могуць выходзіць на пенсію ва ўзросце 63 гадоў і 2 месяцаў, жанчыны — у 61 год і 4 месяцы.

Такое стаўленне да пенсіянераў не магло не адбіцца на выніках выбараў. Кансерватары прайгралі выбары ў Сейм, а сёлета за іх неахвотна галасавалі і на выбарах у мясцовае самакіраванне. Страцілі яны падтрымку і ў другім па велічыні горадзе Літвы — Каўнасе, дзе бесперапынна выйгравалі выбары з постсавецкіх часоў.

Урад сацыял-дэмакратаў, які прыйшоў на змену, атрымаў дрэнную спадчыну. Закон аб павышэнні і параўнанні пенсійнага ўзросту для жанчын і мужчын адмяняць не сталі. Кампенсацыі раней зрэзаных пенсій выплачваюць з доўгімі затрымкамі. Бюджэт «СОДРА» па-ранейшаму трашчыць па швах...

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве. Фота аўтара.**

*Вільнюс.*

---

■ Неасабісты суб'ектыў



# ПРАКТЫЧНАЕ РАДЗІМАЗНАЎСТВА

## Хто раскажа нашым дзецям аб каранях і гісторыі?

НА рэспубліканскім з'ездзе прафсаюзаў Прэзідэнт агучыў навіну, надзвычай важную для адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў. Кіраўнік дзяржавы фактычна падтрымаў ідэю прафсаюзаў і Міністэрства адукацыі ўключыць у школьную праграму абавязковае наведванне значных мясцін Беларусі. Практыку падобных паездак мы не забыліся яшчэ з савецкіх часоў, патрыятычнаму выхаванню гэта прынясе несумненную карысць, дый шосты школьны дзень субота — акурат для такіх мерапрыемстваў і адведзены.

Тое, што ў гэтым пасыле да канкрэтных дзеянняў прысутнічае слова «абавязковае», таксама вельмі важна. Таму што цяпер (і тут бацькі не дадуць зманіць) праграма пазакласных мерапрыемстваў з выездам са школьнага двара ў многіх выпадках складаецца з наведвання заапарка, батанічнага саду, забаўляльнага парка. І, вядома, «МакДональдса»! Як жа без яго? Для дзяцей, прынамсі з правінцыі, асабліва з вёскі, ён стаў сімвалам сталіцы. Ты можаш не ведаць, дзе знаходзіцца Траецкае прадмесце ці Нацыянальная бібліятэка, але калі табе пашчасціла з'есці ў цуда-рэстаране марожанае ці піражок з варэннем і атрымаць у падарунак папяровы сцяжок з рэкламай гэтага самага рэстарана — можаш усім хваліцца, што ў Мінску ты ўжо свой чалавек...

АДБЫВАЕЦЦА так хутчэй з-за нашых — бацькоў і настаўнікаў — абыякавасці і нежадання рабіць лішнія рухі. Не думаю, што нешта змянілася кардынальна ў нашым уласным успрыняцці гісторыі і рэчаіснасці. Нас у гэтым плане выхавалі правільна (нездарма Прэзідэнт згадаў вопыт савецкіх часоў). Вучні нават невялікай вясковай школкі ведалі, што такое Брэсцкая крэпасць і Хатынь, не па падручніках і не па карцінках у кніжцы. Дзеля справядлівасці варта сказаць, што ў кожнага з нас быў і свой «макдональдс», але зусім іншы. У маім жыцці, напрыклад, гэта быў сталічны рэстаран «Журавінка», куды мы заязджалі на абед пасля падрабязнай і цікавай экскурсіі па Мінску (менавіта дзякуючы падобным экскурсіям мы з дзяцінства ведаем і пра сімволіку абеліска Перамогі, і пра гісторыю дамка ля Купалаўскага тэатра, і пра мемарыял на месцы гета, і пра домік Багдановіча ў Траецкім). Дык вось, паход у «Журавінку» быў таксама падзеяй. Усім класам за некалькі дзён да паездкі мы пачыналі штудзіраваць кніжку па этыкеце: як сядзець у сапраўдным рэстаране, як трымаць відэлец і нож... Падобныя пазакласныя мерапрыемствы — а іх за гады вучобы было нямала — рабілі з нас (даруйце за патэтыку) паўнавартасных членаў грамадства...

Калі ў школьнай праграме з'явяцца папраўкі на патрыятычнае выхаванне, мы ўсё гэта, несумненна, успомнім. І зразумеем нарэшце, што гэта патрэбна нашым дзецям не менш, чым валоданне замежнай мовай і камп'ютарам. І (давайце будзем шчырымі) з палёгкай уздыхнём, што за гэты вельмі важны момант выхавання цяпер афіцыйна будзе адказваць менавіта школа, усё будзе ісці па строгай праграме. Зноў можна будзе не рабіць лішніх рухаў, а толькі крытычным вокам назіраць за адукацыйным працэсам. І сумленне будзе чыстае: сына ці дачку ў Полацк або на Курган Славы ў абавязковым парадку звозяць, дзіця да гісторыі далучыцца. Так што можна працягваць спакойна ляжаць на канапе і філасофстваваць пра тое, што калісьці і вада была макрэйшая.

ТАК, школа за нас у плане выхавання робіць многае. Калі ў адукацыйнай праграме з'явяцца гэтыя абавязковыя экскурсіі — зробіць яшчэ больш. Але калі мы пакінем тое, што называем патрыятычным выхаваннем, толькі школе, шмат важнага страцім. Бо любая, самая дасканалая, праграма не ахопіць усе мясціны, якія менавіта ваша дзіця павінна ведаць. Вёсачку, дзе жыла ваша бабуля, дзе на могілках ляжыць уся радня да сёмага калена, дзе расце старая ліпа, якую пасадзіў ваш прадзед. Возера, можа, не такое вядомае, як Свіцязь ці Нарач, але з якім звязана дзівосная мясцовая легенда. Замчышча ў вашым гарадку, цяпер, можа, проста ўзвышша, на якім пасвяцца козы, але яно памятае бітвы і балі далёкай мінуўшчыны... Дый у Брэсцкую крэпасць або Полацк з'ездзіць яшчэ раз пасля школьнай экскурсіі не пашкодзіць, бо гэта будзе ўжо ваша, сямейная, гісторыя, якая ў свядомасці цесна звяжацца з агульнай гісторыяй народа і краіны.

Род і Радзіма ў нашай мове — словы аднакарэнныя. І каранямі за гэту зямлю не адно стагоддзе трымаюцца. А «макдональдс» што? Глынуў і забыўся.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■

---

■ Ну і ну!

## Такі «спорт» да дабра не давядзе

**Аператыўнікі Цэнтральнага РУУС сталіцы вышукваюць маладога чалавека, які скраў з падземнага гаража дома па вуліцы Піянерскай веласіпед коштам больш за 20 мільёнаў рублёў.**

Прычым зламыснік, складваецца ўражанне, адмыслова падрыхтаваўся да крадзяжу. Камеры відэаназірання, размешчаныя на будынку, а таксама ў падземным гаражы, зафіксавалі маладога чалавека, апранутага ў... прызначаную для заняткаў веласпортам форму. Вось толькі хлопец вырашыў скарыстацца не ўласным веласіпедам, а чужым. Ён зайшоў у падземны гараж і, пераканаўшыся, што вакол нікога няма, накіраваўся да двухколавай машыны. А далей, перарэзаўшы трос, якім веласіпед быў замацаваны, малады чалавек выкаціў яго з гаража і з'ехаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

---

Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

ЯРЫЛА — старажытны славянскі бог урадлівасці, які ўвасабляў вясновае абуджэнне прыроды (корань «яр»- у рускай, беларускай, украінскай мовах азначае «малады, вясновы, поўны сіл, новы»).

◈ У славянскай міфалогіі боства Сонца мела некалькі персаніфікаваных пераўвасабленняў. Уладаром неба (нябёсаў, паднябесся) быў Сварог, яго сынам стаў Дажбог — бог Сонца, а ў Дажбога і Лады нарадзіўся сын Ярыла, які і стаў увасабленнем «маладога», набіраючага моц Сонца.

◈ Ярыла паўстае ў выглядзе прыгожага юнака, які гарцуе па палях на белым кані, у белым адзенні, на яго галаве — вянок з вясновых кветак і траў.

◈ Па народных уяўленнях, там, дзе праехаў Ярыла, хутчэй абуджаліся пупышкі на дрэвах, пачыналі моцна квітнець сады, узыходзіць збажына і г.д.

◈ Акрамя таго, Ярыла сімвалізаваў абуджанае вясной каханне ў сэрцах дзяўчат і юнакоў: «погляд яго п'яніць стрэчнага і ахоплівае сэрцы каханнем», «на каго паглядзіць, у таго ў сэрцы разгарыцца каханне».

◈ У дзень святкавання Ярылы (канец красавіка-пачатак мая) дзяўчаты апраналі найлепшае адзенне, на галаву надзявалі вяночкі з вясновых кветак і траў, потым выбіралі самага прыгожага юнака, саджалі яго на каня, вазілі па палях і спявалі абрадавыя песні.

◈ Да Ярылы звярталіся з просьбай аб цёплым леце, добрым ураджаі, каханні, шлюбе і нараджэнні дзетак.

◈ Народнае гулянне — карагоды, песні, гульні — працягвалася ўвесь дзень і заканчвалася ўначы каля вогнішчаў, якія раскладалі на пагорку, узвышшы.

◈ Абрад «Пахаванне Ярылы» звычайна прымяркоўвалі да дня летняга сонцастаяння (з 23 на 24 чэрвеня), таму што зерне ўжо прарасло новым коласам — дало ўраджай, а Сонца страчвала моц.

◈ У Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобласці да нашых дзён захавалася назва вёскі Ярылаўка, паходжанне якой звязана з культам Сонца. Акрамя таго, у беларускай і рускай мовах існуе шмат слоў, утвораных ад адзінага кораня «яр»: яскравы або яркі; яры (узбуджаны, агрэсіўны), адсюль — ваяры (воіны); яравыя культуры (пасеяныя вясной), да-яр-ка (тая, якая ідзе даіць кароў на поле).

# ЧАЛАВЕК. ВЕРСІЯ 10.0

## ЯКІМ СТАНЕ «ЦАР ПРЫРОДЫ» Ў ДАЛЁКАЙ БУДУЧЫНІ



**Свет змяняецца кожнае наступнае дзесяцігоддзе, стагоддзе або тысячагоддзе. Пры гэтым хуткасць пераменаў толькі ўзрастае. Эвалюцыя працягваецца, хай сёння і малюсенькімі крокамі. Хаця многія змены, якія адбываюцца з чалавекам, незаўважныя, з цягам часу некаторыя з іх праявяцца ў поўную сілу. На нас па-ранейшаму дзейнічае натуральны адбор, нягледзячы на развіццё сучаснай медыцыны і тэхналогій.**

**Існуе мноства розных тэорый, якія даюць свае варыянты развіцця чалавека ў будучыні. Аднак некаторыя антраполагі і даследчыкі ўсё ж лічаць, што эвалюцыйныя працэсы ўжо не адыгрываюць такой важнай ролі, як раней. Так, напрыклад, на думку прафесара Стыва Джонса з універсітэцкага каледжа Лондана, эвалюцыя адыходзіць на другі план. Калі ў далёкім мінулым выжываў мацнейшы, то ў сучасным свеце чалавек, акружаны камфортам, наўрад ці працягне мутацыю. У той жа час навукоўцы не выключаюць верагоднасці змен і развіцця нашых цел.**

**Многія з іх не спыняюцца на спрэчцы «за» ці «супраць» эвалюцыі, а вылучаюць свае здагадкі на тэму таго, як чалавек будзе выглядаць у будучыні і якімі эвалюцыйнымі зменамі нам пагражаюць наступныя тысячагоддзі. Якімі ж асаблівасцямі мы будзем валодаць у далёкай будучыні? Вось спіс самых вялікіх змен, што могуць адбыцца з чалавекам праз некалькі дзясяткаў/сотняў тысяч гадоў. Калі, вядома, чалавецтва столькі працягне.**













### ЗМЕШВАННЕ РАС

Развіццё сучасных транспартных сродкаў і камунікацый прыводзіць да таго, што ўсё менш людзей застаюцца ізаляванымі ад іншых. Усё часцей адбываецца змешванне рас паміж прадстаўнікамі, чые продкі мелі паходжанне з розных куткоў нашай планеты. У выніку гэтага генетычныя адрозненні паміж людзьмі пачынаюць сцірацца, а расавыя адрозненні становяцца менш прыкметнымі. Іншымі словамі, людзі будучыні будуць яшчэ больш падобныя адзін на аднаго. Па прагнозах розных даследчыкаў, колер скуры і валасоў пацямнее. Таму ёсць меркаванне, што праз некалькі стагоддзяў або крыху пазней большая частка насельніцтва Зямлі будзе выглядаць прыблізна як бразільцы.

Ёсць і паралельны пункт гледжання, прыхільнікі якога лічаць, што з часам чалавецтва або асобныя людзі набудуць здольнасць да мімікрыі, а гэта значыць, з'явіцца магчымасць мяняць колер скуры па ўласным жаданні. Падобныя заявы можна было б лічыць фантастыкай, аднак ужо цяпер навукоўцы эксперыментуюць з укараненнем храматафораў (клетак, якія ўтрымліваюць пігменты і якія прысутнічаюць у земнаводных, рэптылій і г.д.).

### АСЛАБЛЕНЫ ІМУНІТЭТ

Паступова людзі становяцца ўсё больш залежнымі ад лекаў для выжывання, а наша імунная сістэма пачынае слабець. Людзі будучыні будуць больш успрымальныя да хваробатворных мікраарганізмаў. Сучасныя медыцынскія тэхналогіі і адкрыццё антыбіётыкаў палепшылі наша здароўе і павялічылі працягласць жыцця, але прывялі да таго, што імунная сістэма чалавека даводзіцца менш працаваць. З пункту гледжання біялогіі, яна ўжо не так неабходна, як раней, і мы яшчэ больш будзем залежаць ад медыцынскіх тэхналогій.

### АТРАФІЯ МЫШЦ

Эвалюцыя пазбаўляецца ад тых прыкмет, якія людзям больш не патрэбны. Адным з кандыдатаў на выбыванне ў гэтым сэнсе з'яўляецца фізічная сіла. Людзям ужо не даводзіцца спадзявацца на моцныя мышцы для выканання працаёмкіх задач. Мы ўсё больш залежым ад тэхналогій, якія выконваюць за нас гэтую працу. Даследаванні паказалі, што мы нашмат слабейшыя за нашых далёкіх сваякоў, а ў будучыні, магчыма, станем яшчэ больш кволымі. Акрамя таго, калі пачнём усё больш даследаваць іншыя месцы ў космасе, то, хутчэй за ўсё, страцім вялікую частку нашай мышачнай масы. Касманаўты, якія пабылі ў працяглым касмічным палёце, вярталіся на Зямлю, страціўшы здольнасць да фізічнай працы на 40 %. Між тым ужо цяпер праводзяцца сур'ёзныя распрацоўкі па стварэнні штучных і ўзмоцненых частак цела, мышцавых тканін, экзашкілетаў і іншага.

### ВЫСОКІ РОСТ

Рост чалавека за апошнія два стагоддзі значна павялічваўся. Толькі за апошнія 150 гадоў чалавек стаў у сярэднім вышэйшы на 10 сантыметраў. Так, напрыклад, кожны пяты жыхар Італіі цяпер мае рост, большы за 180 сантыметраў, а пасля Другой сусветнай вайны колькасць людзей з такім ростам складала не больш за 6% ад усяго насельніцтва.

Лічыцца, што асноўнай прычынай гэтага з'яўляецца багацце даступнай нам ежы. Чым больш дзіця есць, тым больш энергіі ў яго для росту. Пакуль людзі здольны есці з лішкам, мы будзем працягваць расці яшчэ вышэй. Ці ёсць мяжа нашаму росту, пакажа эвалюцыя.

### МАЛА ВАЛАСОЎ

Людзей ужо называюць безвалосымі малпамі. Аднак, як і ва ўсіх млекакормячых, у нас ёсць валасы, але іх нашмат менш, чым у нашых чалавекападобных сваякоў і продкаў. Адзенне і сучасныя тэхналогіі зрабілі сагравальную функцыю валасоў састарэлай. Паводле новых веянняў моды, жанчыны цяпер лічацца больш прывабнымі без валасоў на асобных частках цела (а следам у гэта кінуліся і многія мужчыны). Магчыма, з часам валасы наогул будуць адсутнічаць ці іх застанецца зусім няшмат.

### НЯМА ЗУБОЎ МУДРАСЦІ

Асноўная прычына, па якой выдаляюць зубы мудрасці, заключаецца ў тым, што ў большасці сучасных людзей сківіца занадта малая, каб іх размясціць, не замінаючы іншым зубам. Іх лічаць рудыментарнымі карэннымі зубамі, якія з'явіліся ў старажытных людзей, калі іх сківіца была большай, а харчаванне складалася ў асноўным з жорсткай ежы. Нядзіўна, што зубы мудрасці пачынаюць знікаць. Больш за тое, 35% людзей ужо нараджаюцца без зародкаў зубоў мудрасці, у іншых ёсць толькі адзін, два ці тры зубы (усяго іх 4). Акрамя таго, нашы зубы стануць яшчэ меншымі. За апошнія 100 000 гадоў яны паменшыліся амаль удвая, і гэтая тэндэнцыя можа працягнуцца і ў будучыні.

### ПАГАРШЭННЕ ПАМЯЦІ

Тэхналогіі ўжо даволі моцна ўплываюць на тое, як працуе наша памяць. Чалавечы мозг нібыта машына, якая імкнецца да максімальнай эфектыўнасці, як правіла, запамінае, дзе захоўваецца інфармацыя, а не саму інфармацыю. У час інтэрнэту гэтая асаблівасць стала яшчэ больш важнай. Як часта вы спрабавалі ўспомніць нешта і замест гэтага проста глядзелі адказ у «Вікіпедыі» або пошукавай сістэме? Звычка правяраць усё ў інтэрнэце навучыла нас выкарыстоўваць камп'ютар і інтэрнэт у якасці «знешняй памяці», пазбаўляючы наш мозг ад неабходнасці захоўваць інфармацыю. Таму ў будучыні вялікая верагоднасць пагаршэння стану нашай памяці. З іншага боку, чалавецтва не раскрыла яшчэ ўвесь свой «мазгавы» патэнцыял, таму за будучыя пакаленні не варта надта баяцца.

### МЕНШ ПАЛЬЦАЎ

Да таго, як людзі навучыліся прамахаджэнню, нашы пальцы на нагах выкарыстоўваліся для хапання, таксама як рукі. З цягам часу, калі чалавек стаў менш лазіць і больш хадзіць, пальцы ног пачалі памяншацца да сучасных памераў. У той час, як вялікі палец падтрымлівае раўнавагу і дапамагае пры хадзе, у мезенца няма нейкага адмысловага прызначэння. Магчыма, з гэтай прычыны ў будучыні людзі могуць стаць істотамі з чатырма пальцамі на назе.

### ІНШЫ ПАМЕР ГАЛАВЫ

Навукоўцы да гэтага часу спрачаюцца — будзе чалавек у будучыні валодаць вялікім ці малым аб'ёмам чэрапа. Большасць прытрымліваецца думкі, што ў чалавека не можа развіцца больш буйная галава, бо гэта зробіць натуральныя роды немагчымымі і павялічыць смяротнасць у маці. З гэтай прычыны памер галавы чалавека, хутчэй за ўсё, застанецца нязменным, ці, можа, нават зменшыцца. Але варта ўлічыць той факт, што ўсё больш аперацый кесарава сячэння дазваляюць выжываць дзецям з буйной галавой. Многія нават лічаць, што з часам яны стануць бяспечнейшымі за натуральныя роды, і ў дзяцей з маленькай галавой, народжаных натуральна, будзе менш шанцаў выжыць, чым у тых, чые маці прайшлі праз аперацыю.

### САМАЎДАСКАНАЛЕННЕ

Людзі могуць дасягнуць той стадыі, калі яны змогуць кіраваць развіццём чалавека з дапамогай тэхналогій. Біянічныя органы і генетычны адбор дазволіць будучым бацькам выбіраць асаблівасці дзіцяці яшчэ да нараджэння. Гэта можа выкараніць калі не ўсе, то многія, дэфекты і непажаданыя прыкметы. Як толькі такая практыка стане распаўсюджанай, гэта можа прывесці да знікнення шматлікіх негатыўных якасцяў.

### ЯК БУДЗЕ ВЫГЛЯДАЦЬ ЧАЛАВЕК БУДУЧЫНІ?

Менавіта такую выяву чалавека будучыні, на думку некаторых экспертаў, можна намаляваць зараз. Што пры гэтым зменіцца і як праз тысячы гадоў:

— Рост каля 180-210 сантыметраў з прычыны паляпшэння харчавання і прагрэсу ў медыцыне.

— Больш кароткі кішэчнік, каб паглынаць менш цукру і тлушчу і прадухіліць атлусценне.

— Больш доўгія рукі і пальцы, каб пазбавіць нас ад неабходнасці цягнуцца за рэчамі. Больш нервовых канчаткаў на пальцах для выкарыстання розных тэхнічных прыстасаванняў.

— Меншы памер мозга праз тое, што задачу запамінання і мыслення ў асноўным выконваюць камп'ютары.

— Вялікія вочы будуць кампенсаваць маленькі рот. Зносіны будуць грунтавацца на міміцы і руху вачэй.

— Менш зубоў, таму што ежа становіцца мякчэйшай і не патрабуе моцнага разжоўвання.

— Чацвярны падбародак з прычыны таго, што наш арганізм створаны, каб менш есці і выкарыстоўваць больш энергіі, чым цяпер.

— Аднолькавая форма носа, таму што клімат менш уплывае на арганізм дзякуючы кандыцыянерам і сродкам ацяплення.

— Менш валасоў або лысіна праз выкарыстанне цёплых рэчаў і сродкаў абагравання, але больш маршчын з прычыны выкарыстання электронных прылад.

— Абвіслая скура на шыі і мяшкі пад вачыма праз моцнае ўздзеянне Сонца.

— Больш цёмны колер скуры з прычыны змешвання рас.

**Іван КУПАРВАС.**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

# ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта | Право заключения договора аренды помещений сроком 10 лет, общей площадью 337,1 кв.м, расположенных на цокольном этаже здания по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37 |
| Начальная цена продажи | 10 113 000 (десять миллионов сто тринадцать тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды | - коэффициент 3,0; |
| Условия аукциона | размещение на арендуемых площадях кафе быстрого питания |
| Сумма задатка | 1 011 300 (один миллион одиннадцать тысяч триста) белорусских рублей |
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта | Право заключения договора аренды помещений сроком 10 лет, общей площадью 122,3 кв.м, расположенных на первом этаже здания по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37 |
| Начальная цена продажи | 3 669 000 (три миллиона шестьсот шестьдесят девять тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды | - коэффициент 3,0; |
| Условия аукциона | размещение на арендуемых площадях магазина |
| Сумма задатка | 366 900 (триста шестьдесят шесть тысяч девятьсот) белорусских рублей |
| **ЛОТ 3** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта | Право заключения договора аренды помещений сроком 10 лет, общей площадью 575,0 кв.м, расположенных на первом и втором этажах здания по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37 |
| Начальная цена продажи | 17 250 000 (семнадцать миллионов двести пятьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды | - коэффициент 3,0; |
| Условия аукциона | размещение на арендуемых площадях ресторана (кафе) |
| Сумма задатка | 1 725 000 (один миллион семьсот двадцать пять тысяч) белорусских рублей |
| Продавец | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора аренды | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012000046251 в ф-ле № 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 152101752, УНП 500156921, ОКПО 01064077. Получатель – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно |

**Аукцион состоится 30 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 24 июня 2014 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

---

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 622/С-42668 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 85), площадью 104,4 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Товарная, 27 |
| Земельный участок | Кадастровый номер 625450100001003768, (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания здания магазина № 85), площадью 0,0232, расположенном по адресу: Минская область, Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Товарная, 27 |
| Начальная цена продажи | 610 000 000 (шестьсот десять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 61 000 000 (шестьдесят один миллион) белорусских рублей |
| Продавец | ОАО «ДорОрс», 220099, г. Минск, ул. Брестская, 77, тел./факс 8-017-240-61-79 |
| Обременения со стороны третьих лиц | объект находится в аренде сроком до 05.06.2015 г. |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012600240014 в ф-ле 527 «Белжелдор» ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 254, г. Минск, УНП 100065331, ОКПО 01100689. Получатель – ОАО «ДорОрс», 220099, г. Минск, ул. Брестская, 77. |

**Аукцион состоится 16 июля 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 10 июля 2015 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

---

09 июня 2015 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О сделках общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

Начало регистрации – 11.00.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания с 10.00 до 16.00, начиная с 02.06.2015 г: Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

УНП 100008291

---

**В опубликованную проектную декларацию по объекту: «Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и №9 по г/п в квартале пр. Победителей – ул. Проектируемая №3 – ул. 4-ое Кольцо – ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий» в газете «Звязда» от 23.02.2013 г.**

## ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩИЕ ИЗМЕНЕНИЯ:

Жилой дом № 9 (по генплану)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц

Однокомнатные – общей площадью 47,1 м² – 1 квартира;

Однокомнатные – общей площадью 46,8 м² – 1 квартира.

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», зарегистрировано Минским горисполкомом от 01.06.2012 г. № 0042025 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных представителей за № 191450284.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» по адресу: г. Минск, пл. Свободы, 17.

Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства директор Валерий Иванович Самущик, действует на основании Устава. *Тел.: 8 (017) 226 43 99; 8 029 314 11 14.*

---

И З В Е Щ Е Н И Е

УНП 100071325

**Государственное производственное объединение**

## «Минскстрой»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 12 (по генплану) со встроенными помещениями и подземным гаражом-стоянкой в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 23 мая 2014 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 2-комнатных квартир №№ 201, 209 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий – 1300 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 100 долларам США и составит 1200 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

---

И З В Е Щ Е Н И Е

УНП 100071325

**Государственное производственное объединение**

## «Минскстрой»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12 по генплану в квартале жилой застройки пр. Дзержинского – ул. Алибегова – пр. Газеты «Правда». Жилой дом № 12 (по генплану) со встроенными помещениями и подземным гаражом-стоянкой в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 23 мая 2014 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 1-комнатных квартир:

№№ 275, 279, 283, 287, 291, 303, 307 – 1500 долларов США,

№№ 277, 281, 285, 289, 293, 297, 301, 309 – 1400 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 100 долларам США и составит:

№ 275, 279, 283, 287, 291, 303, 307 – 1400 долларов США,

№ 277, 281, 285, 289, 293, 297, 301, 309 – 1300 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

■ Ведай нашых!

# БЕЛАРУС ВЫЙГРАЎ ШОУ ПЕРАЎВАСАБЛЕННЯЎ У РАСІІ

**Удзел у трэцім сезоне тэлешоу «Адзін у адзін», якое выходзіць на канале «Расія 1», прымалі ажно тры артысты з беларускімі каранямі — Руслан Аляхно, шырока вядомы з часоў конкурсу «Народны артыст», Аляксандр Рыбак, пераможца «Еўрабачання-2009», і заслужаная артыстка Беларусі Анжаліка Агурбаш. Цягам сезона ўдалыя вобразы былі ў кожнага з іх, але па выніках тэлепраекта першае месца атрымаў толькі адзін — Руслан Аляхно. Менавіта яму аддалі свае сімпатыі і галасы 47% тэлегледачоў. Артыст дагэтуль працягвае прымаць віншаванні і дзякуе ўсім прыхільнікам за падтрымку і веру ў яго.**



Праўда, фармальна Руслан заняў другое месца: адзінагалосным рашэннем журы пераможцам праекта быў названы экс-саліст гурта «А-Студыё» Батырхан Шукенаў, які нядаўна заўчасна пайшоў з жыцця. На практыцы ж галоўная ўзнагарода — адмысловы кубак пераможцы шоу пераўвасабленняў «Адзін у адзін» — дасталася менавіта нашаму земляку. «Серабро» ўзяў таксама не чужы беларусам Аляксандр Рыбак, за якога прагаласавалі крыху больш як 32% гледачоў. У лік фіналістаў тэлешоу, што прыемна, таксама ўвайшла і Анжаліка Агурбаш.

...Ганна Нятрэбка і адначасова Філіп Кіркораў, Каця Лель, Адрыяна Чэлентана, Сасо Паўляшвілі, Яўген Мартынаў і Андрэй Міронаў — вось толькі нямногія вобразы з галерэі, у якія вельмі ўдала ўжыўся Руслан. З самага пачатку сезона артыст упэўнена выйшаў у лідары і ад эфіру да эфіру толькі ўдасканальваў акцёрскае майстэрства. Андрэй Міронаў у ролі Астапа Бендара ў яго выкананні наогул атрымаўся настолькі пераканаўчым, што прадзюсар вядомай расійскай кінакампаніі паабяцаў: калі будзе здымацца фільм пра Міронава, на галоўную ролю запросяць менавіта Руслана. Дарэчы, 31 мая выйдзе ў эфір спецвыпуск шоу «Адзін у адзін» з найлепшымі нумарамі і інтэрв'ю ўсіх удзельнікаў — але ў Беларусі паглядзець яго змогуць толькі ўладальнікі спадарожнікавага ТБ.

Адпачываць на лаўрах, прызнаецца спявак, яму няма калі: неўзабаве Руслан Аляхно возьме ўдзел у «Славянскім базары ў Віцебску», потым дасць серыю канцэртаў з аркестрам у Грэцыі, на ліпень ужо складзены графік гастроляў па Расіі і здымак у новых тэлепраектах. Але, калі выпадзе вольны час, артыст па-за ўсякімі планамі абавязкова зазірне ў родны Бабруйск.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**



# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.48 | 21.27 | 16.39 |
| Віцебск — | 4.30 | 21.24 | 16.54 |
| Магілёў — | 4.38 | 21.17 | 16.39 |
| Гомель — | 4.43 | 21.05 | 16.22 |
| Гродна — | 5.05 | 21.40 | 16.35 |
| Брэст — | 5.14 | 21.33 | 16.19 |

**Месяц**

*Поўня 2 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

**Пр.** *Аляксандра, Георгія, Фёдара, Яфрэма.*
**К.** *Марыі, Аляксандра, Максіма, Пятра.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**29 МАЯ**

**1453** год — сталіца Візантыйскай імперыі Канстанцінопаль пала пад ударамі туркаў і была перайменавана ў Стамбул. У 658 годзе да н.э. на востраве, які нагадвае галаву арла, паміж бухтай Залаты Рог і Мармуровым морам, грэчаскія каланісты з Мегары заснавалі горад. Яны назвалі яго Візантыяй па імені свайго правадыра Візанта. Спачатку горад засялілі рыбакі і гандляры, але выгаднае геаграфічнае становішча прывяло да хуткага росту Візантыі, і неўзабаве яна заняла пачэснае месца сярод грэчаскіх полісаў. У 330 годзе Канстанцін Вялікі перанёс сталіцу Рымскай імперыі ў Візантыю, якую назваў Новы Рым. Але назва гэтая не прыжылася, і горад стаў называцца Канстанцінопалем. Імператар імкнуўся, каб новая сталіца перасягнула прыгажосцю і пышнасцю Рым. Ён даў мноства льгот перасяленцам, выдаваў жыхарам за кошт казны хлеб, алей, віно і паліва. З Рыма, Афінаў, Карынфа, Эфеса і іншых гарадоў імперыі былі вывезены ў Канстанцінопаль найлепшыя скульптуры, каштоўныя рукапісы, царкоўныя рэчы, мошчы святых. Справу Канстанціна працягнулі і яго нашчадкі. Авалодаць Канстанцінопалем марылі многія кіраўнікі Усходу і каралі Захаду. Яго не раз асаджвалі гуны, авары, персы, арабы, славяне, печанегі, крыжакі. Пасля трохдзённага штурму 29 мая 1453 года турэцкае войска султана Мехмеда II па мянушцы Фаціх («Заваёўнік») захапіла сталіцу Візантыі Канстанцінопаль, паклаўшы канец 1100-гадовай гісторыі хрысціянскай Візантыйскай імперыі.



**1850** год — 165 гадоў таму нарадзіўся (вёска Чарнін, цяпер Светлагорскі раён) Аляксандр Нічыпаравіч Шыманоўскі, беларускі этнограф і фалькларыст. Аўтар рукапіснага зборніка «Мінская губерня і яе народная творчасць у сувязі з апісаннем святаў і абрадаў» (захаваўся ў архіве Рускага геаграфічнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу), у якім сабраны каштоўны матэрыял па беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі, выкладзены яго погляды на народную творчасць. У зборнік уключаны бытавыя, салдацкія, гістарычныя і іншыя песні, казкі, павер'і, загадкі, гаспадарча-этнаграфічныя назвы. Выдаў кнігу «А.С.Пушкін. Аб знаходжанні яго ў Кішынёве ў сувязі з папярэднім і апошнім жыццём». Памёр у 1918 годзе.

**1917** год — нарадзіўся (Бруклайн, штат Масачусетс) Джон Фіцджэральд Кенэдзі, 35-ы прэзідэнт ЗША. З адзнакай скончыў Гарвардскі ўніверсітэт. Удзельнічаў у баявых дзеяннях у гады Другой сусветнай вайны (служыў у ваенна-марскім флоце), быў паранены. Калі вайна скончылася, Кенэдзі заняўся журналістыкай і, выйграўшы выбары, у 1947 годзе стаў членам палаты прадстаўнікоў Кангрэса ад Дэмакратычнай партыі. У 1952 годзе ён быў абраны ў Сенат. Быўшы сенатарам, Кенэдзі падтрымліваў сацыяльныя праграмы і прафсаюзы. У 1960-м ён вылучыў сваю кандыдатуру на пасаду прэзідэнта ЗША ад Дэмакратычнай партыі, а яго апанентам стаў Рычард Ніксан. З нязначнай перавагай галасоў ён перамог на гэтых выбарах. На пасадзе прэзідэнта Кенэдзі распрацоўвае праграму «Новых рубяжоў». Была паднятая мінімальная заработная плата, удасканалена сацыяльнае страхаванне, рэарганізавана жыллёвае будаўніцтва. Кенэдзі быў вельмі папулярны ў краіне дзякуючы сваім асабістым якасцям. У галіне знешняй палітыкі ў яго былі як правалы (спроба ўварвання на тэрыторыю Кубы), так і буйныя дасягненні (вырашэнне Карыбскага крызісу). У 1963-м Кенэдзі разам з жонкай Жаклін здзяйсняў паездкі па краіне, рыхтуючыся да новых выбараў. 22 лістапада ў Даласе (штат Тэхас) прэзідэнт быў смяротна паранены; ён памёр, не даехаўшы да Парклендскага мемарыяльнага шпіталя.

## Было сказана

**Пятрусь МАКАЛЬ, паэт, драматург, перакладчык:**

*Дапамагайце,*
*як дождж палеткам,*
*Дапамагайце,*
*як пчолы кветкам.*

## УСМІХНЕМСЯ

**Дальнабойшчык, які рэгулярна перавозіць гарэлку, адрознівацца ад сваіх калег жалезнымі нервамі і вельмі сумнымі вачыма.**

— УРА! Канікулы! — крычалі настаўнікі і, збіваючы з ног вучняў, беглі дадому. Бацькі запускалі ў неба паветраныя шарыкі, пілі шампанскае, са слязамі абдымаючыся, не верачы свайму шчасцю!..

**Офісная праца не праходзіць дарма. Навучыўся цыраваць шкарпэткі стэплерам.**

— Я твая будучая жонка.
— Па каханні або па прымусе?
— Гэта як сам вырашыш. Захочаш — па каханні, не захочаш — па прымусе. Ты абсалютна свабодны ў сваім выбары.

**Думкі мужчыны, калі жонка ходзіць па доме ў ніжняй бялізне:**
**Першы год сумеснага жыцця: «Хачу яе!»**
**Праз 5 гадоў: «Намякае, што хоча мяне!»**
**Праз 10 гадоў: «Спякотна, напэўна».**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.117. Індэкс 63850. Зак. № 2040.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 мая 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12